КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 48 (1226) 28 лістапада 2015 г.

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

Факт пра план, які не догма

Так, сённяшні артыкул — толькі пра культуру Бешанковіччыны. Між іншым паспрабуем адказаць, ці можна па адной установе культуры меркаваць пра стан культурных спраў усяго раёна. Распавядзем пры гэтым не толькі пра сельскія клубы, але і пра тое, чым адметны ў згаданай сферы раённы цэнтр. Загадзя пракантатуем: нашы высновы тут — неадназначныя.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ,
Мінск —
Лепельскі —
Бешанковіцкі —
Лёзненскі раёны
Віцебшчыны —
Мінск

РДК не спіць

У **Бешанковічы** прыехалі вечарам. Заўважылі, што вокны РДК свецяцца, зайшлі — і не пашкадавалі. Апошні раз "К" наведвала гэты райцэнтр у 2009 годзе, Дом культуры тады толькі рамантаваўся. На сёння ён выглядае як тая лялечка: дыхтоўны, утульны, ды яшчэ і працуе, нягледзячы на позні час. Пасля зачыненых дзвярэй установы культуры ў аграгарадку "Свяча" "адчыненасць" РДК — як гаючы бальзам.

У глядзельнай зале вядзе рэпетыцыю Соф'я Панкевіч. Адзінаццацікласніцы Ксенія Малец і Дар'я Даўгяла старанна спяваюць штосьці эстраднае пад бадзёрую "мінусоўку". Усё разам гэта называецца вакальным гуртом "Хвалі". Соф'я Іванаўна — акампаніятар, усё жыццё — у культуры, як аказалася, вучылася на адным курсе з Мікалаем Пашынскім, колішнім начальнікам колішняга ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама і даўнім партнёрам нашай рэдакцыі… Пра тое, што Панкевіч ведаюць у Бешанковічах многія, мы пераканаліся ў гасцініцы, калі адміністратар запыталася: "З кім паспелі пазнаёміцца?" Распавялі пра Соф'ю Іванаўну. Адміністратар абрадавалася: "А мы з ёй разам у клубе спяваем. Чалавек вялікай душы!"

Што прымусіла Соф'ю Панкевіч затрымацца на працы ў РДК? Прафесійны абавязак. Заўтра мусілі адбыцца ўрачыстасці з нагоды восеньскага прызыву ў войска. Вось акампаніятар і нястомна адточвала майстэрства вакальнага гурта. А мы ў сваю чаргу парадаваліся: усё ж ёсць на бешанковіцкай зямлі моцныя прафесіяналы.

Заканчэнне чытайце **на старонках 10 — 11.**

Фота з павільёнаў "Гран Пале" Валянціны ШОБА

Карціна Валянціны Шоба.

Упершыню беларусам (мастачцы з Гродна Валянціне Шоба і гомельскаму скульптару Сяргею Парцянкову) прысудзілі прэмію Тэйлара ў час правядзення выстаўкі "Art Capital" на тэрыторыі комплексу "Гран Пале" ў Парыжы. Работы творцаў прадстаўлены ў экспазіцыі беларускага павільёна, які арганізавалі па ініцыятыве Пасольства Беларусі ў Францыі пры садзейнічанні, у прыватнасці, Нацыянальнага мастацкага музея нашай краіны і Культурнага цэнтра Беларусі ў Францыі.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫЗЫ НА "ГРАН-ПАЛЕ"

Скульптура Сяргея Парцянкова.

Мастыхін

Так, Рэспубліканская маладзёжная выстаўка пад назвай "Сэлфі" адпрацавала свой, незразумела чаму такі кароткі, тэрмін (усяго 10 дзён!), адведзены ёй. Сапраўды, чаму? Гэтае пытанне хачу задаць кіраўніцтву Беларускага саюза мастакоў. Канешне, у Палацы мастацтва праходзяць пэўныя выстаўкі, асабліва персанальныя, якія могуць экспанавацца і тыдзень — не больш, на іх усё роўна мала хто ходзіць. Але — рэспубліканская маладзёжная, тая, у якой у Год моладзі прынялі ўдзел амаль 150 маладых мастакоў, для якіх падобныя "агляды" маюць значэнне не толькі ў асабістай творчай біяграфіі, але і ў кантэксце ўсяго складанага мастацкага працэсу.

Барыс КРЭПАК

Сэлфі спазнання свайго "Я"

Думаю, што пры фарміраванні выставачных планаў усё ж трэба падыходзіць да кожнай выстаўкі дыферэнцыравана і ў сэнсе тэрмінаў яе працы, і, наогул, у плане падрыхтоўкі "сцэнарыя" вернісажу, магчымага (праўда, напаўзабытага вопыта) грамадскага абмеркавання экспазіцыі, яе папулярызыцыі ў СМІ і гэтак далей. Атрымліваецца ж так: выстаўка закрылася і… забудзьцеся! Ніякіх слядоў не застаецца, і што там было такога-гэткага — невядома…

Некаторыя гледачы, мабыць, далёкія ад сацыяльнага "павуціння", задавалі пытанне, чаму такая назва выстаўкі? Тры — чатыры гады таму наогул мало хто ведаў, што за такі дзіўны тэрмін — "сэлфі". Сёння гэты "куфэрачак" адкрываецца проста. "Сэлфі" — ад англійскага self — сам сябе: фатаграфаваць самога сябе, здымаць, напрыклад, на смартфон, фотаапарат з мэтай выкласці выяву ў Інтэрнэт. Такі "самастрэл", фотааўтапартрэт.

У дадзеным выпадку арганізатары скарысталі гэты сучасны замежны слэнг у адносінах да выяўленчага мастацтва. Уласна, жывапісных і графічных аўтапартрэтаў на выстаўцы было вельмі шмат, каля 25, што нейкім чынам апраўдала назву экспазіцыі. Урэшце, наша айчыннае "сэлфі" ў непасрэднай прасторы пластычных мастацтваў — сапраўднае ноу-хау, і за гэта — мой рэспект. Хаця наконт апошняга можна і дыскутаваць.

Так ці інакш, але выстаўка прымусіла мяне аднесціся да яе не з пункта гледжання крытыка "сястрыцам па завушніцах": маўляў, тая работа "добрая", гэтая — "сырая", а вунь тая — ну, зусім бездапаможная. Канешне, такія творы ёсць. Як і на любой "дарослай" выстаўцы. Гэта нармальная сітуацыя. Але, акрамя ўсяго іншага, выстаўка ставіць шмат такіх прынцыповых праблем маладзёжнага творчага жыцця, без рашэння якіх цяжка ўявіць заўтрашнюю панараму нашага мастацтва. Творчая моладзь Беларусі як прафесійны сегмент сацыяльна-ўзроставай групы валодае шэрагам спецыфічных характарыстык. Мастацтву гэтай катэгорыі (умоўна — ад 18 да 35 гадоў) уласцівая дынаміка хуткіх змяненняў у сацыялізацыі і прафесійным росце, фарміраванні і ўсведамленні грамадскіх якасцей. У гэты ж перыяд могуць назірацца хісткасць, няўстойлівасць псіхікі, пераацэнка сваіх дасягненняў ці наадварот — прыніжэнне сваіх здольнасцей з-за боязі творчай канкурэнцыі. Але ўсё гэта, так бы мовіць, "не для друку", гэта складаная ўнутраная псіхалогія творчасці, якая гледачу не цікавая: яму важныя вынікі.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 9.**

Prof-партфоліа

Штампы — не штампы, але…

Гэтымі днямі ў Беларусі адзначаецца 85-годдзе з Дня нараджэння знакамітага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Зайшла гаворка і пра ўсталяванне ў Мінску помніка Васілю Быкаву. З нагоды таго, што літаратурная тэма такім чынам актуалізавалася ў соцыуме, "К" вырашыла зірнуць на бягучую сітуацыю ў айчынным пісьменстве, а таксама акрэсліць ролю бібліятэк у літаратурным працэсе праз бачанне літаратурнага крытыка.

Балазе ёсць і яшчэ адна нагода: у нашага сталага аўтара — супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ганны КІСЛІЦЫНАЙ — выйшла манаграфія "Культурны градыент. Ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX — XXI стагоддзяў".

— Існуюць два штампы пра сучасную беларускую літаратуру. Першы: яна знаходзіцца ў жахлівым крызісе. Другі: яна не саступае сучаснай літаратуры іншых краін. Дзе ісціна, як лічыце?

— У прынцыпе, свае кнігі пішу якраз для таго, каб разбурыць штампы і стэрэатыпы адносна беларускай літаратуры… Аднак тыя сцвярджэнні, якія выказаны вышэй, — не штампы: яны — праўдзівыя. Іншая справа, што крызіс беларускай літаратуры — не ў адсутнасці цікавых аўтараў і не ў адсутнасці цікавых кніг! Крызіс — у прорве, якая ўтварылася паміж чытачом і беларускай кнігай! Зайдзіце ў любую кнігарню і самі пабачыце, што нашы выданні ў большасці выпадкаў заціснутыя ў асобныя, часам не самыя прыкметныя, аддзелы. Атрымліваецца — змешчаныя без кантэксту. Тое ж і з бібліятэкамі! Вельмі рэдка даводзіцца бачыць, каб у раённай бібліятэцы на бачным месцы стаяла айчынная кніга, модная, папулярная ў сталіцы. Але даводзіцца бачыць на прыкметных выставачных стэндах кнігі, якія трапілі па нейкай "разнарадцы". Тут табе і пра сям'ю літаратура, і пра шкоду алкаголю, і да любой юбілейнай даты падборка. Але дзе ж кнігі модныя, папулярныя, сучасныя? Я разумею, што ёсць попыт на рускамоўныя любоўныя раманы і дэтэктывы. Але ж трэба прывучаць чытача да рознай кнігі…

Ці саступае наша літаратура замежнай? Мне здаецца, адказ навідавоку. Паглядзіце, колькі міжнародных прэмій атрымліваюць нашы аўтары штогод, колькі іх кніг перакладаюць вядомыя ва ўсім свеце перакладчыкі, зірніце на спіс буйных выдавецтваў. Але атрымліваецца так, што аўтараў, якіх шануе еўрапейская крытыка, мала цэняць айчынныя крытыка і літаратуразнаўства. Для іх сучаснікі — недастаткова харошыя: ніяк не дарастуць…

Дарэчы, цікавы момант у сувязі з кнігай, пра якую мы гаворым. Я так стамілася адказваць на закіды пра тое, што "мае пісьменнікі" недастаткова сур'ёзныя, што змясціла ў тэксце пасля разбору творчасці таго ці іншага аўтара сціслыя біяграфічныя даведкі, з якіх становіцца ясна, што гэтыя творцы ўганараваныя вялікімі еўрапейскімі прэміямі, што іх творы ўваходзяць у сусветныя анталогіі… Праўда, пра Нобелеўскую прэмію Святланы Алексіевіч згадаць не паспела: кніга выйшла раней.

Заканчэнне — **на старонцы 12.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

З калегіі Міністэрства культуры

Каб запоўніць кадравыя прабелы...

Збіты выраз "Кадры вырашаюць усё" неаднаразова прыгадваўся на пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па тэме "Аб стане кадравага забеспячэння галіны культуры і падрыхтоўцы спецыялістаў для арганізацый сферы". Дый мала хто сумняецца, што дадзенае выслоўе тут як ніколі дарэчы.

Ілья СВІРЫН

Статыстычныя даныя адносна кадравага становішча ў галіне, якія прагучалі на пасяджэнні калегіі, наўрад ці маглі кагосьці здзівіць — хаця пэўныя прыемныя сюрпрызы яны, усё ж, утрымлівалі. Напрыклад, наступны. Абсалютная большасць (85 %) 62 з паловай тысяч работнікаў культуры маюць спецыяльную адукацыю. А калі ўлічыць, што ў тэатрах альбо музеях працуюць таксама дворнікі ды прыбіральшчыцы, якім для выканання сваіх абавязкаў дыпломы не патрэбны, можна смела сцвярджаць: доля "практыкаў" сярод работнікаў культуры зменшылася амаль да нуля.

Наўрад ці хто здзівіцца, пачуўшы, што прыблізна тры чвэрці работнікаў культуры — гэта жанчыны. А вось ва ўзроставым разрэзе статыстыка прыемна здзіўляе. Як выявілася, стэрэатып адносна таго, што ў гэтай сферы працуюць ледзь не адны пенсіянеры, зусім не адпавядае рэчаіснасці. Амаль сорак працэнтаў работнікаў галіны — гэта людзі сярэдняга веку (32 — 49 гадоў), які найбольш цэніцца на рынку працы. Моладзь складае таксама даволі шматлікую катэгорыю — 23 %. Больш за тое, як падкрэсліў у сваім дакладзе намеснік міністра культуры Васіль Чэрнік, працэнт маладых спецыялістаў за апошні год нават нязначна павялічыўся. І тым не менш, менавіта іх падрыхтоўцы была прысвечана значная частка пасяджэння.

Нядаўняя аптымізацыя скараціла колькасць работнікаў культуры краіны прыкладна на 10 %, але пры гэтым кадравая праблема па-ранейшаму застаецца нявырашанай. Чатыры з паловай тысячы вакансій чакаюць сваіх суіскальнікаў. Установам культуры больш за ўсё не стае харэографаў, гукарэжысёраў, спецыялістаў па менеджменце і маркетынгу…

Па словах Васіля Чэрніка, моцна адчуваецца таксама і брак кваліфікаваных рэстаўратараў. Нядаўні першы выпуск гэтых дэфіцытных спецыялістаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў быў нешматлікім — усяго сем чалавек. Але пры гэтым працэс іх падрыхтоўкі паступова адладжваецца і ўдасканальваецца. Як адзначыў гендырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, яго ўстанова адпрацоўвае з Акадэміяй алгарытм супрацоўніцтва, мэта якога — максімальна падрыхтаваць студэнтаў-рэстаўратараў да будучай практычнай дзейнасці. Без сумневу, такое ўзаемадзеянне паміж музеем і ўстановай адукацыі можа прынесці плён.

У той самы час, гэты падыход пакуль не ахоплівае некаторыя "штучныя" прафесіі — якіх у галіне культуры, вядома ж, не бракуе. Прыкладам, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына Дулава звярнула ўвагу на наступную праблему: дыпламаваных кампазітараў размяркоўваць папросту няма куды, бо штатныя расклады падобных вакансій не прадугледжваюць.

Як сведчыць статыстыка, праблем з адпрацоўкай размеркавання сёння практычна не ўзнікае: амаль усе выпускнікі прыязджаюць на сваё месца працы і сумленна адбываюць там вызначаныя законам два гады. А далей… кажуць "адзью". Як адзначыла ў сваім выступленні першы намеснік начальніка Галоўнага упраўлення Гомельскага аблвыканкама Вольга Антоненка, вельмі мала хто з маладых спецыялістаў замацоўваецца на вёсцы.

І наракаць на іх зазвычай не выпадае: упарта дасылаючы заяўкі, многія рэгіянальныя ўстановы зусім не рупяцца пра тое, каб забяспечыць моладзь хаця б больш-менш прыстойнымі ўмовамі побыту. Таму Вольга Антоненка параіла кіраўнічаму звяну раённага ўзроўню ставіцца да новапрыбылых выпускнікоў па-бацькоўску, уваходзячы ў іх становішча ды вырашаючы злабадзённыя праблемы. Можа, у такім выпадку доля маладых спецыялістаў, што асядаюць у сталіцы, хоць трохі зменшыцца? Бо сёння яна па-ранейшаму вельмі вялікая — больш за 60 %.

Хаця б частковая панацэя ад гэтай праблемы вынайдзена даўно: мэтавы набор і ўвогуле прыцягненне ў прафесію таленавітай моладзі з рэгіёнаў. Але як адзначыў у сваім выступленні дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа Аляксей Саладухін, прафарыентацыя дае збоі ўжо на пачатковай стадыі адукацыі: вучні дзіцячых школ мастацтваў не атрымліваюць належнай матывацыі і навыкаў, каб рухацца далей. Альбо… проста не маюць жадання звязваць сваё жыццё з культурай.

Як падаецца, многія вышэйзгаданыя праблемы тлумачацца адным фактам. Сярэдні заробак у галіне культуры — усяго крыху больш за чатыры мільёны рублёў "бруднымі", альбо толькі 61 % ад сярэдняга па краіне! У адукацыі і медыцыне, як і сярод бюджэтнікаў у цэлым, справы ідуць параўнальна лепей.

Як неаднаразова адзначалася падчас пасяджэння калегіі, Міністэрства культуры робіць несупынныя захады па выпраўленні гэтай сітуацыі. Аднак пакуль што пра нейкія кардынальныя зрухі казаць зарана. Старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры Наталля Аўдзеева прапанавала засяродзіць асаблівую ўвагу менавіта на дадзенай праблеме — і, падобна, яе ахвотна падтрымаюць многія работнікі культуры.

Як адзначыў у сваім заключным слове міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў, некаторыя назапашаныя ў галіне кадравыя праблемы можна смела назваць хранічнымі. Але мірыцца з гэтым станам рэчаў ні ў якім разе не выпадае. І таму ў найбліжэйшы час неабходна правесці дбайны аналіз сітуацыі і шляхоў яе выпраўлення ды распачаць канкрэтныя захады.

К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункта гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 558. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 27.11.2015 у 18.10. Замова 4618. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

34 стужкі — супраць 23-х мінулага года. Але не толькі ў колькасці справа. Яны ёсць — тыя маладыя кінематаграфісты, што здымаюць цікавае кіно. За ўласныя грошы. Проста таму, што гэта крута. Пра тое, што баліць. Нацыянальны конкурс сёлетняга "Лістапада" паказаў, што кіно можа быць справай не толькі "па заказе", а народжанай па волі мастака, рэжысёра. Бо менавіта незалежныя кінематаграфісты вялі рэй на конкурсе.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

У двух кроках

Дык схлыне яна або ўдарыць: досвед "Лістапада-2015"

Скажам, Дар'я Юркевіч, чый фільм "Баба, Ваня і каза" атрымаў дыплом на "Лістападзе-2014", гэтым разам прадставіла на конкурс дакументальную стужку "Пасха Хрыстова". Некалькі гадоў Дар'я са сваёй камандай здымала святкаванне Вялікадня на ўскрайку Мінску: невялічкі драўляны храм у атачэнні новабудаў, мясцовыя жыхары прыходзяць асвяціць ежу. Трынаццаціхвілінная карціна-эсэ, у якой усё дзеянне адыбваецца на пятачку ля храма, — але прыкметы трансфармацыі постсавецкага грамадства навідавоку. Неабавязковы шпацыр ператвараецца ў трапнае назіранне.

Сяргей Каласоўскі і яго дакументальная карціна "Шэпты і крыкі Тані Б.". У фокусе ўвагі — ваганні і каштоўнасці новага пакалення, іх памылкі (учынкі?) і памкненні. Іх рэаліі. На прыкладзе лёсу "адчайнай тусоўшчыцы" Таццяны, што спалучае ролю маці і танцоўшчыцы, вымушанай зарабляць на хлеб.

"Госці" Андрэя Куцілы — і моцная "праблемная карэспандэнцыя", якая ўрэшце адрасуе пытанні не толькі да дзяржаўных інстытуцый, а ўвогуле да сучаснага грамадства Беларусі, не чулага да спагады. Брат Луіджы па ўласнай ініцыятыве стварыў прытулак для бяздомных, але ў гаспадарцы, дзе жывуць хворыя і беспрытульныя, няма адпаведнага статусу — улады ніяк не здолеюць вызначыцца, як ставіцца да гэтай ініцыятывы. У выніку падобнага становішча падапечныя брата Луіджы — усяго толькі госці ў гаспадара.

"Але хто мы ўсе на гэтым свеце, як не госці?" — фільм Андрэя Куцілы задае пытанне нібыта ў абарону героя, які сам некалі, яшчэ ў "тым жыцці", з'яўляючыся медыкам, выкідваў з "хуткай" такіх небаракаў, але ў той жа час — звяртаючыся да кожнага з нас. Ці маем права мы асуджаць гэтых людзей? Дзе палягае мяжа міласэрнасці? Хто ў праве яе вызначаць? І ці ёсць у нас права замінаць тым, хто мае веру і сілы апекаваць бедных і хворых? Перад намі моцная праца кінематаграфіста з асабістым пасылам і аргументаванай крытыкай, да якой складана не прыслухацца.

Усё гэта развагі і пошукі тых кінематаграфістаў, якія вымушаны самі знаходзіць сродкі на свае карціны. І тэмы тут — зусім не лёгкія, як і пасланні, разлічаныя на самага рознага гледача.

Хто ж гэтыя людзі, што робяць сучаснае маладое кіно? Большасць з іх — выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, але ёсць і адмыслоўцы з іншай адука-

Кадры з фільмаў-пераможцаў (зверху ўніз): "Беларускі псіхапат" Мікіты Лаўрэцкага, "Пра вала" Яўгена Надточыя, "Госці" Андрэя Куцілы.

Увага! Аб'ява*

Отдел идеологической работы, культуры и по делам молодёжи Пружанского райисполкома

объявляет конкурс на замещение вакантной должности директора музея "Ружанский дворцовый комплекс Сапегов".

Срок проведения конкурса — с 01. 12. 2015 г. по 31. 12. 2015 г.

Требования к кандидату:
— высшее образование;
— опыт работы в музейных учреждениях.

Срок подачи заявлений — один месяц со дня опубликования объявления.

Заявления и документы (характеристика с последнего места работы, автобиография, копии документов об образовании) подавать на имя начальника отдела по адресу:

225133, Брестская область, г. Пружаны, ул. Советская, 10, каб. 3.
Тел. для справок: 8 (01632) 91545, 91619.

У "год Мулявіна"

12 студзеня 2016 года Уладзіміру Мулявіну споўнілася б 75 гадоў. Захады па ўшанаванні легендарнага музыканта былі праанансаваны на прэс-канферэнцыі ў Белдзяржфілармоніі.

Як адзначыла першы намеснік міністра культуры Ірына Дрыга, постаць Мулявіна мае значэнне не толькі для беларускай музыкі, але і для фарміравання нацыянальнага светапогляду ў цэлым. Менавіта таму святкаванне юбілею Маэстра ці не ўпершыню мае стаць падзеяй агульнадзяржаўнага маштабу.

Размаітая праграма мерапрыемстваў пачнецца непасрэдна 12 студзеня, калі на сцэне Белдзяржфілармоніі пройдзе ўжо традыцыйны "Канцэрт у дзень нараджэння", прысвечаны Мулявіну. Далей свае спецыяльныя праграмы ў гонар Песняра прэзентуюць найлепшыя творчыя калектывы краіны. Прыкладам, Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя Іосіфа Жыновіча зноў прадставіць уласнае прачытанне "Песні пра долю".

Святкаванне юбілея Мулявіна чырвонай ніткай праходзіць і скрозь творчыя планы Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга. Знакаміты дырыжор распавёў на прэс-канферэнцыі пра свае сяброўскія стасункі з Мулявіным, якія распачаліся на самым старце ягонай кар'еры і былі абарваныя толькі трагічнай смерцю.

ад “новай хвалі”?

цыяй: псіхолагі, эканамісты, менеджары, матыматыкі… Да прыкладу, Іван Маслюкоў, чыя іграваая стужка “Фартуна” была прадстаўлена на конкурсе, з’яўляецца стваральнікам культавай сталічнай квэст-гульні пачатку 2000-х — “Схватка”. Прычым, у Івана гэта далёка не першая карціна, а ўжо чацвёртая. Рэжысёр зусім не лічыць кіно нейкай забаўкай, а ставіцца да справы з поўнай аддачай. Бюджэт “Фартуны” — каля 2 тысяч долараў. “За час працы ў кіно давялося асвойваць усе спецыяльнасці адразу”, — прызнаецца ён. Акцёры здымаліся за ўмоўнае ўзнагароджанне, уся каманда працавала “без грошай і гарантый”. Падобны энтузіязм і схема — амаль у кожнага другога, хто ўдзельнічае ў конкурсе. І пляцоўка “Лістапада” становіцца ці не адзінай, дзе маладым кінематаграфістам можна паказаць плён сваіх высілкаў.

У Сяргея Каласоўскага ў конкурсе заяўлены дзве работы — вышэйзгаданы дакументальны фільм “Шэпты і крыкі Тані Б.” і кароткаметражная іграваая стужка “Пугач”. І — знаёмая гісторыя. Гэтаксама асабістыя ўкладанні ў памеры каля дзвюх тысяч “умоўных адзінак” у “кароткаметражку”, доўгі кастынг на ролі галоўных герояў — хлопчыкаў (чытай — значная праца з дзецьмі), і вынік — дванаццаціхвілінная карціна, якая ўжо мае ўдалы фестывальны лёс, пабываўшы ў ЗША, Паўднёвай Карэі і Расіі.

Выпускнік Акадэміі мастацтваў Мітрый Сямёнаў-Алейнікаў. Міця зарабіў на стужку, падпрацоўваючы падчас сваёй далейшай вучобы ва ВГИКе. У яго, бадай, самы вялікі бюджэт з незалежных кінематаграфістаў — набліжаецца да 7 тысяч “умоўных”. “Нават машыну набыў, каб спаліць у кадры, — прызнаецца рэжысёр. — Але гэтай “ахвяры” не спатрэбілася. Калі здымаеш — у працэсе і вучышся”. Малады кінематаграфіст рэзюмуе: “Ніхто не абяцаў, што будзе лёгка, таму падтрымліваеш сябе як можаш”.

Вось так — як можаш, з тымі, хто падзяляе твой энтузіязм, аб’ядноўваючы сумесныя рэсурсы ды высілкі, і выходзіць на сцэну новае пакаленне рэжысёраў. І пры гэтым фільмы, што патрапілі ў Нацыянальны конкурс “Лістапада”, язык ніяк не паварочваецца назваць дылетанцкімі. Імпэт, драйв, пасыл, свежае мысленне — усё гэта яны ўтрымліваюць. І натхняюць, нягледзячы, часам, на пэўныя недахопы, зацягнутасці і “шарахаватасці”.

■■■

І самае цікавае, што падобная расстаноўка сіл — адсутнасць бюджэтаў і рэсурсаў — можа ўспрымацца як дадзенасць, пачатак, поле для эксперыменту. Такі падыход, прынамсі, дэманструе Мікіта Лаўрэцкі — малады кінематаграфіст з матэматычнай адукацыяй, які робіць карціны зусім без бюджэтаў. Фотаапараты, мабільныя тэлефоны, web-камеры, дыктафоны ў якасці неабходнага абсталявання. Сябры — у якасці акцёраў. Усё амаль як у яго калег, але з мінімальнымі “прэтэнзіямі” ў тэхнічным плане. Але ў творчым…

У творчым — ёсць і стыль, і эстэтычны кодэкс. Мы, па сутнасці, дачакаліся беларускага “мамблкора” — паджанру незалежнага кінематографа, якому ўласцівы нізкі бюджэт і ўдзел акцёраў-аматараў. Але сэнс у тым, што свае “недахопы” “мамблкор” можа ператварыць у вартасці. І ў выпадку работ Мікіты Лаўрэцкага так акурат і адбываецца.

Можна, да прыкладу, адсякаючы працу аператара, зрабіць фільм у Інтэрнэце. Адна са стужак рэжысёра — карціна “Паэзія” (“Poetry”) — створана выключна з дапамогай і ў Сусветным павуцінне. Акцёраў Мікіта знайшоў таксама праз Сеціва; у фільме — дыялогі герояў адбываюцца праз відэасувязь, ёсць здымкі на тэлефон, усё цалкам даступна, але ў выніку — “дзіўная нарэзка” складваецца ў цалкам адчувальную гісторыю, якая ўзнікае з ніадкуль і сыходзіць у нікуды. Як нашы пачуцці. Як паэзія. Прычым рэжысёр не абапіраецца на падобны фармат прынцыпова — як на эксперымент дзеля эксперыменту: гэта форма нарадзілася з гісторыі, сцэнарыя — і атрымалася для яе ўвасаблення найарганічнай.

Што да галоўнага “хіта” Лаўрэцкага — стужкі “Беларускі псіхапат”, — гэта ўвогуле “мамблкор” з элементамі саспенсу, амаль што “мамблгор”, які абяцае далучанасць да “жахаў” і крывавай развязкі. Але тутэйшы “…Псіхапат” аказваецца камедыйнай гісторыяй пра гэткага разумніка, які ніяк не можа наладзіць стасункі з дзяўчатамі. Пры гэтым — саспенсу ў карціне хапае, таксама як і гумару. Дасціпныя дыялогі, свядомая гульня з чаканнямі гледача, смелая рэжысура — і ў выніку фільм за 400 тысяч беларускіх рублёў аказваецца цікавейшым за высокабюджэтныя эпасы. Гэта кіно, у якім заўважная “нагледжанасць” рэжысёра, яго свядомы выбар — калі адмаляўюцца ад чагосьці, каб набыць у іншым. Магчыма, для пэўнай часткі публікі вопыты Лаўрэцкага пададуцца занадта складанымі ці непрывабнымі — карцінка нізкай якасці, няясны гук, але гэта кіно, якое не аглядваецца на штампы і “патрабаванні”, нараджаючыся “тут і зараз”, з таго, што ёсць. Жывое, непрычасанае, дзіўнае, але таму і прыцягальнае.

■■■

Што ж маем у выніку? Вялікі запал энтузіязму пакалення, якому карціць здымаць кіно. Няхай вас не ўвядуць у зман бюджэты — гэта кіно, якое дыхае, расце і здольнае прывабіць гледача.

Нават беларускія “эмігранты”, чые работы таксама былі прадстаўлены ў конкурсе, дэманструюць тонус і той самы імпэт “новай хвалі”. Пра што здымаюць? Ды гэтаксама пра тое, што перажываецца, аб чым думаецца і куды вядзе фантазія, у тым ліку. Выпускніца БДАМ Тацяна Гаўрыльчык, да прыкладу, зрабіла дакументальную стужку пра жыццё сляпых дзетак, што вучацца ў спецыялізаванай школе ў Венгрыі. (Тацяна скончыла магістратуру міжнароднай праграмы DocNomands у Будапешце). Рэжысёр-аніматар Генадзь Буто, які працуе ў Санкт-Пецярбурзе, у сваёй рабоце “Яно”, спалучыўшы надзённасць і жанравасць, стварыў, па сутнасці, амаль хічкокаўскую саспенс-анімацыю пра залежнасць чалавека ад любых страсцей, у тым ліку, наркатычных. Нагадаўшы па рытме, атмасферы карціны творы Эдгара По і Говарада Лаўкрафта. А мінчанка Дар’я Жук, якая скончыла Калумбійскі ўніверсітэт у ЗША, выдала яскравую кароткаметражку пра адчуванне эмігранта ў іншым культурным асяроддзі — фільм "Сапраўдная амерыканка". Прычым не поўную тугі і адчаю, як часам прынята, а выкліку і здаровай іроніі, стварыўшы вобраз эмігранта, здольнага пастаяць за сябе.

Усе гэтыя прыклады пацвярджаюць галоўны кірунак — у бок вольнага самавыяўлення і шчырай творчасці, які ўжо дае свой плён. Не буду нагадваць пра тое, што работы многіх маладых кінематаграфістаў ужо заяўлены на міжнародных фестывалях. І гэты рух — удача і надзея для беларускага кінематографа. Шукаць таленты не трэба, яны ёсць, — гэта і паказаў “Лістапад”. Але ці скарыстаецца тым творчым патэнцыялам дзяржава? Ці будуць задзейнічаны гэтыя таленты? Ці створацца спрыяльныя ўмовы для іх творчасці, альбо праз пэўны час мы зноў будзем шукаць хаця б “рака на бязрыб’і”, каб назваць яго беларускім кіно? Усе гэтыя пытанні пакуль не маюць адказаў.

...Дарэчы, Музей гісторыі беларускага кіно з 1 снежня пачынае праграму "Лістапад. Беларуская калекцыя", у рамках якой пакажуць фільмы Нацыянальнага конкурсу.

К

Фотасюжэт нумара

Юбілей спецыяльнага фонду

23 лістапада на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета прайшоў справаздачны канцэрт, прысвечаны 20-годдзю спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У імпрэзе прымалі ўдзел як першыя лаўрэаты прэміі, так і зусім юныя таленты. Намеснік Прэм’ер-міністра краіны Наталля Качанава зачытала з гэтай нагоды ўрачыстыя словы з віншавальнага адрасу Кіраўніка дзяржавы: “Вашы дасягненні шырока вядомыя не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі, а ваш прыклад служыць добрым арыенцірам для аднагодак і яркім пацверджаннем таго, што для талентаў у нас адкрытыя любыя дарогі”. Прэзідэнт упэўнены, што лаўрэаты, стыпендыяты і дыпламанты фонда будуць і надалей раскрываць свой творчы патэнцыял, працаваць над рэалізацыяй адметных культурных праектаў, якія ўзбагацяць нацыянальную культуру і прынясуць ёй сусветнае прызнанне.

Фота Аліны САЎЧАНКА

Эскіз для помніка

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Слуцкі раённы выканаўчы камітэт абвясцілі конкурс эскізных праектаў помніка Анастасіі Слуцкай, які плануецца ўстанавіць у райцэнтры.

Мэтай творчага спаборніцтва з’яўляецца пошук найбольш выразнага вобраза легендарнай княгіні як жанчыны-воіна, жанчыны-абаронцы. Удзельнікамі конкурсу могуць быць скульптары і архітэктары, якія маюць адпаведную прафесійную адукацыю.

Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены на цвёрдым планшэце памерам 1,0х1,0 метр, мець сціслую тлумачальную запіску з абгрунтаваннем праекта, генеральны план у маштабе 1:500, праектнае горада-будаўнічае рашэнне алеі з помнікам, візуалізацыю архітэктурна-пластычнага рашэння помніка і мадэль апошняга ў маштабе не менш за 1:10.

Кампазіцыйнае і пластычнае выкананне помніка павінна быць вытрымана ў найлепшых традыцыях класічнага і нацыянальнага манументальнага мастацтва. Таксама варта ўлічыць, што помнік павінен быць усталяваны ў скверы па вуліцы Вялікая Горка ў горадзе Слуцку з улікам агульнай горада-будаўнічай сітуацыі і гістарычнага цэнтра горада, візуальнага ўспрыняцця помніка з розных участкаў сквера.

Каб прыняць удзел у конкурсе ў тэрмін па 14 снежня 2015 года ўключна ўсім ахвотным трэба падаць заяўку паводле адзінай формы па адрасе: г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, каб. 309.

Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ўдзельнікамі конкурсу 14 снежня 2015 года не пазней за 17.00 па адрасе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 81, галерэя ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”.

Больш падрабязную інфармацыю пра конкурс эскізных праектаў можна адшукаць на афіцыйных сайтах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Слуцкага райвыканкама і Мінскага абвыканкама.

К

Па словах Міхаіла Фінберга, постаць Песняра стане цэнтральнай падчас чарговага фестывалю ў Маладзечне. Ды і на “Славянскім базары ў Віцебску” яму будзе прысвечана адмысловая праграма.

Такама ў планах — фотавыстаўка Юрыя Іванова і Яўгена Коктыша, абнаўленне экспазіцыі музея Мулявіна ў сценах Белдзяржфілармоніі, перавыданне кнігі “Нота лёсу” ды мноства іншых разнастайных захадаў па ўшанаванні памяці.

Што прынцыпова важна, юбілейныя імпрэзы пройдуць не толькі ў Мінску: калектывы запланавалі гастрольныя туры па розных кутках Беларусі. Ды і спектакль Горкаўскага тэатра “Пясняр” таксама адправіцца ў турнэ па дзесяці гарадах...

Ці не ўпершыню ўгодкі з дня нараджэння творцы, які быў нашым сучаснікам, будуць адзначацца на такім узроўні. Без сумневу, гэта станоўчая тэндэнцыя: не трэба чакаць стагоддзі, каб аддаць належную пашану сваім героям ды сказаць ім заслужанае “дзякуй”.

К

Дзяжурны па нумары

Танцы пад "тру-ля-ля"

Пагаворым пра тое, чаго амаль няма. Маю на ўвазе высокую (падкрэсліваю — высокую) якасць клубных мерапрыемстваў. Не, належны ўзровень выступленняў нашых гуртоў, салістаў, вядучых, аніматараў, іншых самадзейных артыстаў пад увагу не бяру. Тут якраз — аніякіх прэтэнзій. Можна нават і больш сціпла, а то перад прафесіяналамі няёмка. Прэтэнзіі, і надзвычай сур'ёзныя, ёсць з прычыны адсутнасці прыстойных святла, узнаўлення і ўзмацнення гука, мультымедыйнага забеспячэння… А ўсё гэта і прынята называць матэрыяльна-тэхнічнай базай.

Яўген РАГІН

Як кажа знаёмы начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, танцы як ладзіліся сорак гадоў таму пад "тру-ля-ля", так ладзяцца і па сёння. А за акном — Год моладзі. 2015-ы, калі што. Неяк няёмка перад тымі самымі маладымі. Таму і не бачаць юнакі з дзяўчатамі сваёй сельскай перспектывы, усё робяць для таго, каб не застацца ў райцэнтры ці вёсцы. Не называю прозвішчы добра знаёмых работнікаў культуры з рэгіёнаў, але пад маімі словамі гатовы падпісацца многія.

І галоўная выснова гэтых многіх зводзіцца да аднаго: па тэхзабеспячэнні наша культура (за рэдкім выключэннем) засталася ў мінулым стагоддзі. Крыўдна і незразумела, чаму на яе пастаянна не стае грошай. Іх няма ніколі, а эканоміка культуры ў адпаведнасці з загадамі існуе і пастаянна патрабуе росту пазабюджэтных прыбыткаў. А пра якое паспяховае развіццё можна казаць без фінансавых укладанняў? З нічога атрымаць штосьці немагчыма.

Вось такая яна, эканоміка культуры: непрадказальная ды няўцямная. Але ўсё ж нашы работнікі культуры так-сяк пазабюджэтныя грошы зарабляюць. Прыносяць з дому камп'ютары, "наймаюць" з ліку сяброў непрафесійных дзі-джэяў з уласнай апаратурай і ладзяць тэматычныя дыскатэкі. Глядзіш, зароблена за год дазволіць набыць новы дынамік з мікрафонам. Назваць такую дзейнасць сістэмнай і планава звернутай у светлую будучыню вельмі цяжка.

Давайце згадаем любое мястэчка, дзе не ладзіліся рэспубліканскія, абласныя ці раённыя дажынкі. Добра, калі ў РДК праведзены рамонт. Калі ж ніколі не было рэканструкцыі, гарантую, што месца для гурткавой працы не стае хранічна і сітуацыю ратуе толькі зменная работа. Рэдка дзе ёсць кінатэатр. І калі ён не пераабсталяваны нядаўна ў Цэнтр вольнага часу з 3D, асобнай танцавальнай залай і з наборам іншых няпрофільных паслуг (кавярня, більярдная і гэтак далей), дык аб прыбытку і думаць не варта. Няма якасці культурнага абслугоўвання — адсутнічаюць і дывідэнды. З нагоды яшчэ адна цытата без пазнакі аўтарства. "Мінск так асветлены ўначы, што за кіламетры яго бачыш, калі па'язджаеш, — зайздросціць чарговы начальнік аддзела ІРКСМ, — А мы ў РДК лішнюю лямпачку запаліць баімся… Эканомія!". Вось і атрымліваецца, што бясконцымі зімовымі вечарамі ў пэўных РДК — цьмяна, халодна, няўтульна не толькі ў зале, але і на сцэне. Так што будучыня тут — не вельмі светлая. І моладзь пасля школы рвецца скараць абласныя гарады і сталіцу.

І гэта, заўважце, — гаворка пра клубныя ўстановы раённых цэнтраў. Што ж казаць пра сяло? А чым яно горшае? І тут у клубах, і не толькі аграгарадоцкіх, павінны быць феерыя гуку, святла і сінтэз самых розных жанраў мастацтва. Ды дзе там! Няма. Камп'ютар у СК — нязбыўная мара. Ды ці толькі клубы ад тэхнічнай нішчымніцы пакутуюць? Ведаю не адну буйную бібліятэку, дзе няма ліцэнзійнага праграмнага забеспячэння. Здавалася б, можна набыць яго за немалую і шчыра зароблену пазабюджэтку. Але амаль усё "з'ядае" "камуналка", астатняе "асядае" дзе заўгодна, толькі не з мэтай задавальнення злабадзённай патрэбы ўстановы. Вот і гучыць "тру-ля-ля".

Ці варта гнаць працэнт?

Гродзеншчына: вынікі Дзяржпраграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015-ы

Чарговыя высновы — сёння па раёнах Гродзеншчыны — наконт Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады дазволілі выявіць не толькі шэраг станоўчых прыкладаў, але і цэлы спектр праблем, якія паўсталі перад многімі раёнамі падчас рэалізацыі задуманага. Найперш гэта тычыцца шматлікіх паказчыкаў па напаўняльнасці кіна- і відэаўстаноў, пашырэнні чытацкага кола ў бібліятэках ды павелічэнні колькасці клубных фарміраванняў у раённых Дамах і Цэнтрах культуры.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

"Інструментаў — заваліся!"

Як і падчас мінулага тэлефанавання ў раёны Брэсцкай вобласці, начальнікі аддзелаў з Гродзеншчыны вельмі станоўча ацэньвалі цэнтралізаваныя закупкі музычных інструментаў для дзіцячых школ мастацтваў, а таксама поўную камп'ютарызацыю бібліятэчных устаноў свайго раёна. Напрыклад, у Слонімскім раёне, па словах начальніка аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама Наталлі Юнчыц, толькі за гэты год былі набыты 2 акардэоны, 3 баяны, домра, кларнет і нават саксафон — агулам на суму прыкладна ў 80 мільёнаў рублёў.

— Праўда, трэба адзначыць, што названыя інструменты — не новыя, — патлумачыла Наталля Юнчыц. — Мы набываем іх у камісійнай краме, таму значна эканомім на закупках. Напрыклад, той жа саксафон нам абышоўся ў 14 мільёнаў рублёў. Новы, натуральна, каштаваў бы даражэй.

Такая ж карціна — на Ашмяншчыне: паводле Дзяржпраграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады тут штогод выдаткоўвалася на набыццё музычных інструментаў прыкладна 80 мільёнаў рублёў, а ўсе бібліятэкі раёна за пяць гадоў былі камп'ютарызаваныя. Гэтыя звесткі я атрымаў ад Галіны Балінскай — да нядаўняга часу — начальніка аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама і даўняга сябра "К". Калі я патэлефанаваў у аддзел, Галіна Іванаўна якраз падпісвала апошнія дакументы перад выхадам на заслужаны адпачынак.

— Дзякуючы Дзяржпраграме, — зазначыла візаві, — цяпер у нашых школах інструментаў — хоць заваліся! Такога абнаўлення інструментарыя не памятаю за апошнія 10 — 15 гадоў.

Акрамя таго, як адзначыла Галіна Балінская, даволі шмат увагі за апошнія пяць гадоў было нададзена кансервацыі і добраўпарадкаванню рэшткаў былога замка Сапегаў у вёсцы Гальшаны — знакамітага "чорнага замка", як называў яго Уладзімір Караткевіч.

Плюс пяць, а мінус?

Але не ўсё выглядае настолькі добрым. Як адзначыла тая ж Галіна Балінская, супрацоўнікам сферы культуры Ашмянскага раёна было вельмі цяжка выканаць адзін з паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады, які прадугледжвае павелічэнне колькасці клубных фарміраванняў на 5 працэнтаў за пяць гадоў.

— З улікам аптымізацыі, якая вялася ў Беларусі, думаю, гэта выклікала цяжкасці не толькі ў Ашмянскага, а і ў многіх іншых раёнаў краіны, — адзначыла Галіна Балінская. — А калі яшчэ ўлічыць, што насельніцтва ў сельскай мясцовасці сёння скарачаецца даволі значнымі тэмпамі, дык выкананне гэтага паказчыка выглядае яшчэ больш праблематычным.

Дарэчы, з падобнай высновай згаджаюцца многія кіраўнікі раённай сферы культуры Гродзеншчыны. Напрыклад, намеснік начальніка аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі Дзятлаўскага райвыканкама Васіль Шыцько адзначыў, што калі за гэтыя гады паказчыкі Дзяржпраграмы па павелічэнні клубных фарміраванняў, наведвальнасці бібліятэк і кінатэатраў яшчэ можна было выканаць, дык у наступныя гады такое наўрад ці атрымаецца.

— Асноўныя прычыны тут дзве: змяншэнне колькасці сельскага насельніцтва і аптымізацыя сеткі ўстаноў культуры, — кажа Васіль Васільевіч. — Таму, як на маю думку, у наступнай Дзяржаўнай праграме "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады лепш ад падобных паказчыкаў пазбавіцца… Інакш атрымаецца, што культура будзе, так бы мовіць, гнаць працэнт, а вось якасць паслуг, узровень канцэртаў, абслугоўвання насельніцтва, асабліва ў сельскай мясцовасці, будуць непазбежна падаць.

Як перакананы Васіль Шыцько, адныя і тыя ж паказчыкі нельга рабіць агульнымі для буйных гарадоў і для райцэнтраў.

— Напрыклад, у Мінску, Гродне ці Лідзе забяспечыць паказчыкі наведвальнасці мерапрыемстваў, бібліятэк нашмат лягчэй, чым, скажам, у Шчучыне ці ў нашым Дзятлаве, — кажа Васіль Шыцько. — Да слова, колькасць насельніцтва ў Дзятлаўскім раёне скарачаецца на 200 — 300 чалавек штогод. Прычым людзі з'язджаюць не толькі з маленькіх вёсак, але нават і з аграгарадкоў, дзе матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў культуры на парадак вышэй… І гэта сапраўдная праблема. Таму ў наступнай Дзяржпраграме, на маю думку, варта прадугледзець дыферэнцыяцыю названых паказчыкаў для буйных гарадоў і раёнаў ды для малых паселішчаў. Або ўвогуле ад іх адмовіцца з улікам сённяшніх эканамічных ды дэмаграфічных рэалій...

Майстар-клас у Наваполацкай мастацкай школе.

Думку калегі падтрымлівае і Алена Ястрэмская, начальнік аддзела ІРКСМ Воранаўскага райвыканкама.

— Так, за гэтыя пяць гадоў мы змаглі выканаць паказчыкі па наведвальнасці бібліятэк ды павелічэнні клубных фарміраванняў, але зрабіць гэта было вельмі цяжка, — адзначыла Алена Мар'янаўна. — Напрыклад, нам даводзілася адкрываць адно ці два клубныя фарміраванні ў Дамах культуры аграгарадкоў ці буйных сельскіх паселішчаў адразу ж пасля аптымізацыі суседніх устаноў культуры. Таму, магчыма, варта падумаць пра тое, каб адмовіцца ад дадзеных лічбаў, бо аптымізацыя, хутчэй за ўсё, будзе працягвацца, як і скарачэнне колькасці сельскага насельніцтва нашага раёна.

Як і Васіль Шыцько, Алена Ястрэмская распавяла мне пра тое, што ўсе бібліятэкі раёна на сёння камп'ютарызаваны, для школ мастацтваў набыты інструменты (толькі летась на гэта было выдаткавана прыкладна 280 мільёнаў рублёў), а многія творчыя калектывы раёна прыдбалі сабе новыя касцюмы.

— Лічу, што новыя інструменты і новыя касцюмы сыгралі не апошнюю ролю ў тым, што летась наш ансамбль народных інструментаў "Гарэзлівыя струны" выкладчыкаў Воранаўскай ДШМ атрымаў званне "народны", а вакальны ансамбль "Юнацтва" Радунскай ДШМ заваяваў званне "ўзорны", — адзначыла кіраўнік аддзела.

■■■

Безумоўна, Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады паспрыяла ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры Гродзенскай вобласці. З гэтай думкай згодны і першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ІРКСМ Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі.

— Дзяржпраграма дала магчымасць запланаваць нашы дзеянні на пяць гадоў наперад, прымусіла нас працаваць, што называецца, закасаўшы рукавы, падштурхнула да больш актыўных дзеянняў і да больш актыўнай працы ў сферы культуры рэгіёна, — адзначыў Аляксандр Людвігавіч. — І сёння я магу сказаць, што ўсе 12 паказчыкаў праграмы нам удалося выканаць. Гэта датычыць і камп'ютарызацыі бібліятэк, і павелічэння колькасці наведванняў у тых жа бібліятэчных установах і кінатэатрах, і работ па рэстаўрацыі ды кансервацыі шэрагу аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, што знаходзяцца ў Гродзенскай вобласці. Так што выкананнем Дзяржпраграмы я вельмі задаволены. Балазе, гэта была першая падобная Рэспубліканская праграма, скіраваная менавіта на сферу культуры Беларусі. Будзем чакаць наступную.

Разам з тым, адзначыў Вярсоцкі і некалькі праблемных момантаў, пра якія згадвалася вышэй:

— Натуральна, распрацоўшчыкі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады не маглі прадугледзець, як будуць змяняцца ўмовы функцыянавання ўстаноў культуры краіны цягам усіх пяці гадоў. Між тым, як вы ведаеце, насельніцтва Беларусі старэе, зачыняюцца на рамонт ці згодна з аптымізацыяй многія ўстановы культуры, скарачаецца колькасць людзей, якія жывуць у вёсцы ці аграгарадках. Таму, хоць мы і выканалі паказчык па павелічэнні колькасці наведвання бібліятэк рэгіёна за пяць гадоў на пяць працэнтаў, а таксама павялічылі колькасць клубных фарміраванняў, хацелася б, каб у наступнай Дзяржпраграме падобных колькасных паказчыкаў ужо не даводзілася. Замест гэтага можна, напрыклад, усталяваць паказчык наведвальнасці на адну бібліятэку, кінатэатр ці на адзін Дом культуры. Мяркую, гэта было б значна лепш, чым прымяняць агульныя колькасныя паказчыкі для ўсіх устаноў культуры Беларусі.

фотафакт

Клас юных мастакоў у Жылічах.

5 мазкоў і 20 мальбертаў

25 лістапада ў Наваполацкай дзіцячай мастацкай школе імя Івана Хруцкага мінская мастачка Рыма Карачан правяла майстар-клас па кітайскім жывапісе, якім даўно захапляецца. Тэхніка ўсходніх жывапісцаў досыць незвычайная. У аснове яе — пяць рухаў пэндзля: кожны мазок мае сваю энергетыку і адпавядае сутнасці агню, зямлі, дрэва, металу, вады. Так што карціну намалаяваць — што верш скласці. Ахвотных наведаць майстар-клас было шмат. Кіраўніцтва школы вырашыла запрасіць мастачку яшчэ раз.

А ўчора, 27 лістапада, Жыліцкую дзіцячую школу мастацтваў, што ў Кіраўскім раёне, наведалі не толькі прадстаўнікі Міністэрства культуры нашай краіны, але і Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін. Кітайскі бок перадаў ўстанове дваццаць мальбертаў для навучэнцаў мастацкага аддзялення.

Што нельга выткаць?

меркаванне

Ніна ПІЛЮЗІНА,
мастак,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі

Творчы капітал мастака складаецца з многіх чыннікаў, але, на маю думку, галоўныя з іх — наяўнасць адметнага стылю і тэмы, у якой творца дасведчаны і ў межах якой ён можа найлепш рэалізаваць сваю самасць. Менавіта распрацоўка ўласнага стылю і пошук сваёй тэмы — тое, чым мастак займаецца ўсё жыццё. А гэты набытак стварае яму творчае імя і глядацкую аўдыторыю.

Але іншым разам хочацца выйсці з кола ўжо звыклых для цябе вобразаў і, рызыкуючы быць не зразуметым, зрабіць нешта нечаканае, нават для самога сябе. Такое памкненне было ў мяне, калі я рыхтавала сваю юбілейную выстаўку. Назвала яе "Прарыў", бо сапраўды мне хацелася б, каб яна стала свайго роду прарывам у іншую стылістыку і вобразнасць, прынцыпова адрозную ад той, якой я пераважна трымалася дагэтуль. Было жаданне пазбегнуць фігуратыўнасці і сюжэтнасці, выявіць сваё ўяўленне пра светабудову выключна праз абстрактныя формы. Не ведаю, наколькі ў мяне атрымалася здзейсніць задуманае. Але, мяркуючы па водгуках гледачоў у Магілёве, дзе гэтыя работы экспанаваліся спачатку, і ў Мінску, пэўную цікавасць яны выклікалі.

Да пошуку іншай выразнасці мяне прывяла не толькі сама логіка творчасці, але, у значнай ступені, і вонкавыя абставіны. Я, шчыра кажучы, у роспачы, бо габелен, якім я займаюся ўсё жыццё, сёння, здаецца, нікому не патрэбен. У свой час стабільнае развіццё гэтага віду мастацтва забяспечваў шырокі грамадскі попыт і дзяржаўны заказ. Сёння ж габеленшчык на пошук заказчыка часу затрачвае значна больш, чым на саму работу.

Да таго ж, у мастацтва габелену прыйшлі людзі з іншых творчых прафесій — жывапісцы, графікі, якія маюць вельмі цьмянае ўяўленне пра спецыфіку і традыцыі ткацтва. Яны мяркуюць, што калі перавесці графічны аркуш альбо жывапісны эцюд у памер тры на чатыры метры, дык атрымаецца габелен. Фармальна гэта так, але сутнасна — не. Бо не ўсё, што намалявана, можна выткаць. Не кожная выява будзе эфектна глядзецца ў тэхніцы ткацтва. Тут патрэбна, каб стылістыка зыходна была арыентаванай на тэхналогію.

> Я, шчыра кажучы, у роспачы, бо габелен, якім я займаюся ўсё жыццё, сёння, здаецца, нікому не патрэбен. У свой час стабільнае развіццё гэтага віду мастацтва забяспечваў шырокі грамадскі попыт і дзяржаўны заказ. Сёння ж габеленшчык на пошук заказчыка часу **затрачвае значна больш**, чым на саму работу.

Сёння ў габеленшчыка, на шчасце, іншыя тэхнічныя магчымасці і матэрыяльная база, чым тыя, што былі ў нас сорак гадоў таму, калі мая творчая кар'ера пачыналася. Свой першы заказ я атрымала ў 1972 годзе: габелен "Свіцязь" памерам тры метры на паўтара. Сама для яго ніткі рабіла, бо іх было не дастаць, сама іх фарбавала. Каб паспець у тэрмін, па чатырнаццаць гадзін за ткацкім станком сядзела. Сёння ўсё прасцей… Але, пагадзіцеся, адна справа, калі кожная нітка праз твае рукі прайшла, і зусім іншая — калі аддаў эскіз майстрыхам і забыўся. І потым толькі прыходзіш на скончаную работу паглядзець.

Я лічу вельмі ўдалымі габелены ў Палацы Рэспублікі. Яны сумаштабныя яго інтэр'еру. Рэальны і абстрактны чыннікі ўраўнаважаны, сгарманізаваныя вобразны лад і стылістыка. Так атрымалася таму, што галоўны мастак праекта, які каардынаваў работы па аздобе Палаца, парупіўся, каб кожны выканаўца рабіў справу сваю, а не чужую. Ён дамогся, каб габелены рабіць даручылі менавіта габеленшчыкам. У шэрагу іншых знакавых аб'ектаў гэтага прынцыпу жорстка не прытрымліваліся. Ну дык і маем тое, што маем…

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Няма музея без інтэрактыву

меркаванне

Людміла ШЫМБАЛЁВА,
дырэктар Карціннай галерэі Гаўрылы Вашчанкі

Музей, мастацкая галерэя — гэта, у нейкім сэнсе, тое ж прадпрыемства. Хіба, што робіць яно не матэрыяльныя рэчы, а пастаўляе грамадзе відовішчы, ад якіх людзі маюць станоўчыя эмоцыі. Відовішча ў дадзеным выпадку — тавар. Які сэнс выпускаць тавар, што не мае попыту? Можа, мне і хацелася б займацца тым, што звыкла і зручна прадпрыемству, але мушу рабіць тое, што людзям патрэбна.

Можна наладзіць выстаўку высокага мастацтва, а публіка на яе не пойдзе. Прынамсі, у той колькасці, каб кампенсаваць выдаткі на яе арганізацыю. А іншая экспазіцыя, можа, і не надта амбіцыйная, збярэ немалую грамаду. Таму сёння наша ўстанова імкнецца ладзіць выставачную дзейнасць такім чынам, каб былі максімальна ўлічаны інтарэсы жыхароў і гасцей горада. Каб да нас прыходзілі людзі ўсіх узростаў. Каб у Галерэі Вашчанкі ўтульна было гледачам з розным узроўнем культурных запытаў.

> Не варта наракаць на тое, што сёння тэлевізар і камп'ютар ствараюць канкурэнцыю тэатру і музею… З аўдыторыяй **трэба працаваць**, яе трэба выхоўваць. І хай сёння чалавек прыйдзе на выстаўку, каб паглядзець на птушак і матылькоў, а заўтра яму захочацца далучыцца да высокага мастацтва.

Для пашырэння сваёй аўдыторыі мы шукаем новыя формы работы з грамадой. Галерэя ладзіць музычныя пікнікі, салонныя сустрэчы, бярэ ўдзел у "Ночы музеяў". Сёння музейная, выставачная дзейнасць мусіць быць інтэрактыўнай. Прынамсі, калі мы жадаем далучыць да культуры моладзь. Я сачу за тым, як працуюць іншыя музеі краіны, асабліва ўважліва аналізую досвед сталічных калег. І з пабачанага раблю выснову, што мы на правільным шляху. Бо цяпер паспяховую музейную дзейнасць без інтэрактыву немагчыма ўявіць.

Дбаючы пра пашырэнне аўдыторыі, мы, аднак, не маем права забывацца на свой высокі статус, паколькі наша галерэя мемарыяльная. Залы, дзе экспануюцца творы народнага мастака Беларусі Гаўрылы Вашчанкі, знаходзяцца на другім паверсе будынка, зменныя ж выстаўкі ладзім на першым. Гэта дазваляе, так бы мовіць, тэрытарыяльна развесці тое, што з'яўляецца "залатым фондам" нашага мастацтва і сённяшнія культурныя рэфлексіі, з якіх можа ў перспектыве штосьці атрымаецца. А мо і не… У любым выпадку я лічу, што мастакі Гомельшчыны, і, найперш, творчая моладзь, мусяць мець выхад на гледачоў. Прастора нашай галерэі найлепшым чынам пасуе сумоўю мастакоў і аматараў мастацтва. Разам з тым, мы імкнёмся высока трымаць планку якасці, і не кожную выстаўку ў свае залы пускаем. Зрэшты, выстаўкі, дзе дамінуе забаўляльны чыннік, мы маем магчымасць ладзіць ў асобнай выставачнай зале на праспекце Леніна.

Не варта наракаць на тое, што сёння тэлевізар і камп'ютар ствараюць канкурэнцыю тэатру і музею, што на выстаўках публіка зусім не тая, чым калісьці. З аўдыторыяй трэба працаваць, яе трэба выхоўваць. І хай сёння чалавек прыйдзе на выстаўку, каб паглядзець на птушак і матылькоў, а заўтра яму захочацца далучыцца да высокага мастацтва. Ішла жанчына з рынку з клункамі каля галерэі, спынілася паглядзець на клумбы з кветкамі, што ў нас на двары… Я выходжу, пытаюся: "А чаму ў галерэю не зойдзеце?" Яна: "А можна?". "Канешне", — адказваю. Вось праз тыя кветкі яна для сябе адкрыла свет выяўленчага мастацтва.

Для дзяцей ладзім мультымедыйныя імпрэзы кшталту "Казачнае і фантастычнае ў мастацтве", "Музеі свету, якія я не бачыў", "Музей шакаладу", "Музей мышэй". Адносна творчасці Гаўрылы Вашчанкі гэта, нібыта, несур'ёзна, але — выхоўвае. І калі-небудзь той, хто прыходзіў у нашу галерэю з нагоды згаданых акцый, завітае і дзеля карцін Вашчанкі.

Дарэчы, экспазіцыя карцін Вашчанкі не можа гадамі заставацца нязменнай. Гараджане, хто хацеў, ужо яе пабачылі, і не маюць пільнай патрэбы рабіць тое зноў. Турыстаў у Гомелі не надта шмат. Значыць, каб у іншы раз нашага жыхара ў галерэю прывесці, трэба ці вар'іраваць нашу пастаянную экспазіцыю, паказваючы розныя іпастасі творчасці мастака, ці ладзіць цікавыя відовішчы і імпрэзы. Мы працуем у абодвух кірунках.

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Да гісторыі праз паланэз

меркаванне

Сяргей КУЛІКОЎСКІ,
галоўны рэжысёр Новага драматычнага тэатра

Сёлетняя восень аказалася як ніколі багатай на разнастайныя тэатральныя фестывалі і праекты. У Мінску завіравала сапраўднае тэатральнае жыццё. Усё гэта ў чарговы раз нагадала, што ў фестывальна-конкурсным працэсе, без якога цяпер немагчыма ўявіць развіццё мастацтва, павінен удзельнічаць і Новы драматычны, які ўжо самой сваёй назвай скіроўвае да пошукаў навізны, "разыначкі", разнастайнасці.

Калісьці тут так і было, але не абмінулі тэатр і складаныя часы. Сёння ў ім няма артыстаў, якія мелі б ганаровыя званні. Таму мая задача — вярнуць Новы драматычны ў культурную прастору Мінска і Беларусі.

4 снежня ў нас адбудзецца чарговая прэм'ера. Спектакль "… И слышатся лишь звуки полонеза" прысвечаны 250-годдзю з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага. Тут ёсць нейкая гульня лічбаў: Агінскаму сёлета — 250, а нашаму Новаму драматычнаму — зусім хутка 25. Як жа не адгукнуцца? Але дарма шукаць у спектаклі хаця б мінімальны намёк на біяграфію Агінскага. Наш славуты суайчыннік прадстаўлены праз свой знакаміты паланэз, які гучыць неаднойчы і ў кантэксце ўсёй дзеі ўспрымаецца як сімвал страты радзімы, эпохі, гістарычнай велічы мінуўшчыны, як напамін пра тыя арыстакратычныя часы, калі гонар цаніўся так высока, што за яго ішлі на смерць, выклікалі крыўдзіцеляў на дуэль, заканчвалі жыццё самагубствам.

Патрыятызм, па цяперашніх мерках, — нярэдка паняцце перакручанае, знявечанае. А дзея ў п'есе адбываецца ў 1835 годзе, калі яно было роўнае з паняццем самога жыцця. І тут узнікае вечная праблема, якая тычыцца спектакляў на гістарычную тэматыку. Як сумясціць сучасныя размоўныя традыцыі з тагачаснымі? Як з'яднаць цяперашняе светаўспрыманне з тым тэатрам, які быў паўстагоддзя, стагоддзе, паўтара стагоддзя таму? Прасцей, як ні дзіўна, бывае з больш аддаленымі ад нас з'явамі: даўніна з налётам пасівелай архаікі заўсёды ў модзе. А не такая далёкая гісторыя ўяўляецца чымсьці накшталт рэтра: камусьці — мілага, настальгічнага, а камусьці — папросту нафталінавага. Але выйсце, на маю думку, у тым, каб быць у тэатры шчырым. Калі меладраматычнасць, непазбежная ў мастацтве рамантызму, перажываецца як штосьці цяперашняе, нам блізкае, дык і агульны вынік будзе пераканаўчым.

> Як сумясціць сучасныя размоўныя традыцыі з тагачаснымі? Як з'яднаць цяперашняе светаўспрыманне з тым тэатрам, які быў паўстагоддзя, стагоддзе, паўтара стагоддзя таму? Але выйсце, на маю думку, у тым, каб **быць** у тэатры **шчырым.**

Сабраўшыся паставіць гістарычны касцюміраваны спектакль, мы адштурхоўваліся ад п'есы Анатоля Луначарскага "Мядзведжае вяселле", якая, у сваю чаргу, у якасці пункта апоры мела навэлу Праспера Мэрымэ "Локіс". Па матывах гэтых двух твораў Ігар Падлівальчаў, узяўшы псеўданім Ігар Сонін, напісаў арыгінальную п'есу. Яе прынцыповае адрозненне і ад згаданых "правобразаў", і ад нашумелай некалькі гадоў таму беларускай кінастужкі "Масакра" ў тым, што, нягледзячы на трагічны сыход, герой змагаецца. А ўся "містычнасць" аповеду, як высвятляецца, мае цалкам зямныя карані: шукайце, каму гэта можа быць выгадна, і знойдзеце злачынцаў.

А яшчэ новы спектакль — пра каханне, і ўжо адным гэтым ён павінен прыцягнуць увагу гледачоў.

Да канца сезона будуць і іншыя нечаканасці (спадзяюся, прыемныя). Збіраюся паставіць спектакль "Ад чаго людзі не лётаюць" па матывах п'ес Аляксандра Астроўскага, а таксама камедыйны дэтэктыў "Фуршэт пасля прэм'еры" Валянціна Краснагорава. А потым зноў вярнуся да свайго ўлюбёнага постмадэрну…

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Меркаванні калумністаў і экспертаў газеты не абавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Слова ўпраўленню

Дом Вішняка і "Прарыў"

Галоўны спецыяліст упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Дзяніс ЮРЧАК распавёў "К" пра галоўныя кірункі працы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў раёне.

— Сёлета на Віцебшчыне працягвалася праца па кансервацыі і рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Так, у Талачыне цалкам завяршыліся рэстаўрацыйныя работы на знакавым помніку архітэктуры — Свята-Пакроўскім саборы. Таксама варта адзначыць, што цягам бягучага года працягвалася рэстаўрацыя фрэсак Полацкай Свята-Прэабражэнскай царквы.

Яшчэ адзін аб'ект, пра які неабходна сказаць — так званы дом Вішняка ў Віцебску, у якім пасля рэвалюцыі размяшчалася створанае Маркам Шагалам Народнае мастацкае вучылішча. Сёлета на названым аб'екце спадчыны было асвоена прыкладна 12 мільярдаў рублёў. Намі зроблены значны крок да завяршэння рэканструкцыі будынка пад будучы мемарыяльны музей Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Як вядома, аднаўленнем гэтага дома ў Віцебску заняліся некалькі гадоў таму. Гістарычны будынак плануецца ўзнавіць па плане 1923 года — з майстэрнямі і ўсімі пакоямі, якія адлюстраваны ў гэтым архіўным дакуменце.

Трэба назваць і той знакавы аб'ект, на які сёлета было выдаткавана больш за паўтара мільярда рублёў. Гэта рэстаўрацыя мемарыяльнага комплексу "Прарыў" ва Ушацкім раёне. Грошы на правядзенне рэстаўрацыйных работ былі атрыманы, дарэчы, як з абласнога бюджэту, так і ад спонсараў. А яшчэ частка грошай на аднаўленне помніка была зароблена на Рэспубліканскім суботніку. Мы ўзяліся за рэстаўрацыю гэтага аб'екта невыпадкова. Бо "Прарыў" — гэта адзін з самых вядомых мемарыялаў нашай краіны. Разам з Хатынню, Брэсцкай крэпасцю і Курганам Славы ён уваходзіць у многія энцыклапедычныя даведнікі і наведваецца турыстамі.

■ Сёлета было асвоена прыкладна **12 мільярдаў рублёў на рэканструкцыі будынка** пад будучы мемарыяльны музей Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

На сёння праведзены першы этап работ па захаванні аблічча памятнага збудавання. Дарэчы, у працы нам дапамагае адзін з аўтараў мемарыяла архітэктар Юрый Градаў. Так, зроблена рэканструкцыя сцяны, расколатай на дзве часткі, якая сімвалізуе "вароты" легендарнага прарыву блакады партызанамі. На сёння браме больш не пагражае абвальванне: там умацаваны ўнутраныя жалезабетонныя канструкцыі, а некаторыя часткі помніка адноўлены ўжо з асабліва трывалага бетону.

На наступных этапах працы будзе зроблены рамонт фігуры партызана і праведзена добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі. Завяршыць усе работы на "Прарыве" плануецца ў 2016-м годзе.

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Прынцыпы паводле Караткевіча: вяртаць да гісторыі і да сябе

Калі тандэм складзецца?

Міхась Краснабаеў прыйшоў у Тэатр імя Якуба Коласа трыццаць гадоў таму пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. І на той час заявіў пра сябе як яркі самабытны акцёр шырокага творчага дыяпазону. Яму ўдаваліся ролі як лірыка-гераічнага, так і камедыйнага, вострахарактарнага плану. Пасля стажыроўкі па рэжысуры ў народнага артыста Расіі Пятра Фаменкі Михась Дзмітрыевіч працуе ў Коласаўскім на пасадзе рэжысёра-пастаноўшчыка. Сярод яго работ (тут Краснабаеў і аўтар інсцэніровак) — і квартэт спектакляў паводле твораў Уладзіміра Караткевіча: "Вераб'іная ноч", "Ладдзя Роспачы", "Леаніды не вернуцца на Зямлю" і "Хрыстос прызямліўся ў Гародні". А паколькі нумар выходзіць акурат у дні, калі мы адзначаем 85-годдзе слыннага беларуса, пачалі гутарку з гэтага этапу ў творчай біяграфіі віцебскага рэжысёра.

— Я прасякнуўся гэтай асобай. Я дыхаю, як ён, думаю, як ён, адчуваю край і людзей так, як і ён. З беларускіх пісьменнікаў ён для мяне самы блізкі і любімы. Бывае, чытаеш твор іншага аўтара, напісаны нібы па-беларуску, але не пакідае адчуванне штучнасці. А ў Караткевіча асаблівы стыль, напеўнасць гучання, інтэлігентнасць. Ён вяртаў нас да беларускай гісторыі, якую мы не ведалі, і, лічы, вяртаў нас да саміх сябе. Тым больш я працую ў тэатры са статусам "нацыянальны". Ну як да твораў Караткевіча не звяртацца? На жаль, сёння айчынныя драматургі пішуць, у асноўным, па-руску, бо думаюць на рускай мове. А ёсць жа нейкія істотныя, сакральныя для нас рэчы, тыя грунтоўныя пытанні, у якіх спрабаваў разабрацца пісьменнік.

— Але ў полі вашых інтарэсаў — не толькі Караткевіч. Наколькі я ведаю, у творчых планах — "Сымон-музыка". Ці не стане замінаць вам як рэжысёру ўплыў даўнейшай пастаноўкі на Коласаўскай сцэне? Якія пытанні, праблемы, сугучныя нашаму часу, вы знаходзіце ў тым творы?

— Цудоўны быў спектакль! Я яго нядаўна пераглядаў у відэазапісе. Там сабралася выдатная каманда: Таццяна Мархель, Яўген Шыпіла, Тадэвуш Кокштыс, Генадзь Шкуратаў, Таццяна Ліхачова... Гэта была з'ява: спектакль з поспехам мог бы ісці і зараз. Але многія сышлі з тэатра, а хто і пакінуў наш свет. Я не думаю, што матэрыял трэба істотна змяняць, але варта ісці ад аўтара: Колас усё сказаў. Можа, акцэнты па-іншаму расстаўлю. Напэўна, буду пісаць сваю інсцэніроўку, рызыка пайсці за ранейшай пастаноўкай сапраўды існуе. Пра сучаснасць няма чаго і казаць: гэта пра Беларусь. А яшчэ пра творцаў, якія не адзіным хлебам жывуць, развіваюць свядомасць народа, нас некуды рухаюць, прымушаюць нашы душы працаваць.

— Мабыць, па форме гэта — метафарычны тэатр?

— Абсалютна слушна. Адно з самых вызначальных пытанняў — музыка. Калі браць выдатную музыку Картэса, якой быў аздоблены мінулы спектакль паводле паэмы на коласаўскай сцэне, дык на выхадзе атрымаецца паўтор. Магчыма, у сённяшняй версіі пастаноўкі варта "сканструяваць" музычную аздобу на аснове аўтэнтычнага фальклору? Прынамсі, тое — адзін з варыянтаў.

— Колькі слоў пра новы праект. Да Новага года вы рыхтуеце "Снежную каралеву" Яўгена Шварца. Чым прывабіла п'еса?

— Дыхтоўнай драматургіяй. Мне давялося прачытаць варыянтаў шэсць інсцэніровак паводле андэрсэнаўскай казкі. Узнікала адчуванне, што аўтары пішуць антрэпрызы на выезд: мінімум герояў і дэкарацый. А дзецям жа найперш трэба паказаць прыгожую карцінку, яркі візуальны шэраг. У Шварца цудоўна выпісаныя вобразы герояў, а не проста сюжэт, прысутнічае інтрыга, таму артысты працуюць з задавальненнем.

— Ці будзеце ўжываць спецэфекты?

— Наколькі дазволяць фінансавыя магчымасці. На жаль, гэта адна з праблем беларускага тэатра. Як і моўная.

Міхась Краснабаеў.

— Так, на беларускае слова ў прыватнасці і на слова ўвогуле юны глядач рэагуе складана. Яно, можна сказаць, на яго не ўздзейнічае. Асабліва з цяперашнім веданнем беларускай мовы ў гарадскіх школах...

— А потым гэтыя ж дзеці прыходзяць да нас.

— Мабыць, пэўным чынам вырашаць гэтую задачу імкнецца тэатр "Лялька", які ў Віцебску працуе выключна па-беларуску. Ягоныя гледачы потым, у больш сталым узросце, прыходзяць у Коласаўскі...

— Але гэтага недастаткова. Школа павінна больш актыўна працаваць у такім кірунку. Магчыма, не зашкодзіла б павялічыць колькасць гадзін на вывучэнне роднай мовы.

— А якія вашы першыя тэатральныя ўражанні, што, магчыма, паўплывалі на выбар акцёрскай прафесіі?

— Яшчэ ў дзяцінстве мы ладзілі з сябрам у школе вечарыны. Я нават п'есу ў той час напісаў. І тады ж упершыню адчуў смак улады над залай, над гледачом. Потым я яшчэ два ці тры спектаклі рабіў па ўласных інсцэніроўках. Праз шмат гадоў мне давялося ўжо як коласаўцу выступіць на сцэне таго сельскага клуба, дзе некалі ў дзяцінстве іграў (памятаю, гэта быў спектакль "Кветкі-ягадкі" па п'есе Васіля Ткачова)…

— Вы ўдала пачыналі свой творчы шлях як акцёр. Нельга сказаць, што ваш сцэнічны лёс не склаўся. І раптам пайшлі ў рэжысуру…

— Займаўся на курсе выдатных педагогаў — народнай артысткі СССР Аляксандры Клімавай і Андрэя Карсакоўскага, сцэнічную мову выкладаў Ілья Курган, танец — Тамара Узунава, сцэнічны бой — Людміла Сямашка. Сапраўдныя легенды! На адным курсе са мной вучыліся будучыя коласаўцы Алесь Брысь (які, на жаль, рана пайшоў з жыцця) і Наталля Аладка, Ігар Дзянісаў з Купалаўскага, Аляксандр Ждановіч з Горкаўскага, Таццяна Папова (яна ў мінскім Новым драматычным)... Дыпломныя спектаклі ставілі Барыс Утораў, сама Клімава ў тандэме з Аўгустам Мілаванавым, той жа Карсакоўскі, Барыс Луцэнка.

А што да рэжысуры… На пачатку 1990-х не пакідала адчуванне творчай незадаволенасці, а мне было за трыццаць. І вось мы неяк сабраліся з акцёрамі і задумалі самастойную працу — "Вераб'іную ноч" паводле апавядання "Паром на бурнай рацэ" (пралог да рамана "Нельга забыць") Уладзіміра Караткевіча. Я сам напісаў інсцэніроўку, сыграў ролю рускага афіцэра Горава, Пора-Леановіч — Валянцін Салаўёў, жонка Грынкевіча — Алена Шарэпчанка... А потым пайшло-паехала. Акцёр стварае адзін вобраз, а рэжысёр — цэлы свет: тут іншыя аб'ём, адказнасць, высілкі.

— Якія ўрокі, прынцыпы работы з матэрыялам, з акцёрам вы засвоілі, трапіўшы на стажыроўку да Пятра Фаменкі?

— У мяне за плячыма на той час былі 15 гадоў акцёрскай працы, некалькі пастаўленых спектакляў. Так што пэўны творчы багаж меўся. Тое, што трапіў на стажыроўку да Пятра Навумавіча, — адна з найвялікшых удач у жыцці. Ён якраз у гэты час ставіў "Вайну і мір. Старонкі рамана" паводле Льва Талстога, спектакль потым атрымаў "Залатую маску". Мяне ўразіла, як Фаменка працаваў са словам. Мне здавалася, што майстар ухопліваў рытм спектакляў, яны гучалі ў яго своеасабліва, але ў тым выпадку, калі ён іх ставіў са сваімі выхаванцамі (не толькі студэнтамі, але і артыстамі, якіх таксама можна лічыць яго вучнямі). Гэта быў, канешне, геніяльны чалавек, але якой карпатлівай працай усё тое дасягалася!

Ведаеце, мы прызвычаіліся ўсё рабіць на хуткую руку, раптам натхніць кагосьці альбо чакаць, калі рэжысёрскае слова акрыліць, і тады ў акцёра ўсё атрымаецца. У Фаменкі дзённыя рэпетыцыі ішлі з 11-й да 16-й гадзіны, пасля гадзіна на абед, потым — зноў рэпетыцыя ўжо вячэрняга спектакля. Хто працуе ў тэатры, уяўляе, колькі такая праца каштуе сіл, разумее, што так працаваць немагчыма, калі гэта не твае акцёры, якіх ты вырасціў, якія табе вераць, ідуць за табой да канца. Таму і ствараліся ў "Майстэрні Пятра Фаменкі" такія цудоўныя спектаклі, што заўсёды прысутнічаў тандэм вялікага рэжысёра і выдатна падрыхтаваных артыстаў. Без гэтай умовы дасягнуць у тэатры нечага значнага, на маю думку, не атрымаецца.

Юрый ІВАНОЎСКІ, тэатразнаўца, літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа

ф о т а ф а к т

Пасля форуму...

У Мінску завяршыўся II Міжнародны маладзёжны тэатральны форум краін Садружнасці, Балтыі і Грузіі. Падрабязна пра яго вынікі і карысць для нашай тэатральнай прасторы — у наступных нумарах "К". А пакуль — некалькі кадраў з яркіх пастановак тыдня: на фота зверху — "Калігула" вільнюскага "No Theatre", злева — галоўны герой "Гамлета" Магілёўскага абласнога тэатра лялек (III месца форуму, у якім перамог эстонскі спектакль "Чысты розум/Укусі мяне") і "Любоў людзей" паводле п'есы нашага драматурга Дзмітрыя Багаслаўскага Кіеўскага акадэмічнага Маладога тэатра (II месца).

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Шчыраванне над "капейчынай"

Якія толькі платныя паслугі не прапаноўваюць сёння супрацоўнікі сферы культуры сваім наведвальнікам у Дамах культуры, бібліятэках, музеях і кінатэатрах… Напрыклад, бібліятэкары заахвочваюць да чытання дзяцей і падлеткаў з дапамогай прызоў, музейшчыкі апранаюць турыстаў у строі дам і кавалераў XVIII стагоддзя, а кіношнікі ладзяць дыскатэчныя мерапрыемствы ў фае кінатэатра! Усё гэта і многае іншае, натуральна, робіцца для таго, каб выканаць план ды папоўніць сваю пазабюджэтную "скарбонку". А гэта, што ні кажы, — рэальная "капейчына", якую можна выкарыстаць на набыццё таго ці іншага абсталявання, а, магчыма, і скарыстаць на выплату прэмій супрацоўнікам. Гэтым разам прадстаўляем цікавосткі пазабюджэтнай дзейнасці культработнікаў Чачэрскага раёна Гомельшчыны.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
Мінск — Чачэрск — Мінск

Кінатэатр у Чачэрску заняў вясельную і водную нішы на карысць пазабюджэту.

Сувенірная прадукцыя ў раённым музеі.

Вопыт пазабюджэту на Чачэршчыне

Крышку за кніжку

Бібліятэкры Чачэршчыны ў плане атрымання пазабюджэтных даходаў — наперадзе ўсіх культработнікаў раёна. Кажу гэта без перабольшання: столькі самых разнастайных платных паслуг (агулам каля 25) мне не даводзілася бачыць ні ў якой іншай бібліятэчнай сетцы Беларусі. Праўда, "шчыруюць" бібліятэкары Чачэрска на пазабюджэтнай ніве не з лёгкага жыцця: па словах дырэктара мясцовай ЦБС Людмілы Хрысцінай, сёлетні план платных паслуг павялічыўся на 25% ад мінулагодняга і складае прыкладна 50 мільёнаў рублёў. Сума, як бачыце, немалая, і менавіта яна вымушае супрацоўнікаў ладзіць "мазгавыя штурмы" і нарошчваць віды паслуг для наведвальнікаў.

Рэклама платныя паслуг у бібліятэцы.

Апроч традыцыйнага ксеракапіравання ды раздруковак, выдачы кніг з чытальнага зала ды сканавання тэксту, мясцовыя бібліятэкары сёння брашуруюць, ламініруюць дакументы, шукаюць патрэбную чытачам інфармацыю ў Інтэрнэце і нават наразаюць паперу. А яшчэ ствараюць электронныя прэзентацыі ды буклеты, афармляюць і друкуюць бланкі, візіткі, граматы, запрашэнні ды фотаздымкі, выдаюць на дом кампакт-дыскі, а таксама набіраюць па замове тэксты на беларускай мове (дадзеная паслуга, дарэчы, каштуе ў два разы больш, чым набор тэксту па-руску).

Пры ўстанове культуры сёння дзейнічае дзіцячы тэатр лялек "Флорык". Дык вось, касцюмы для прадстаўленняў калектыву шыюць самі бібліятэкары, якія да таго ж удзельнічаюць у яшчэ адным "дарослым" тэатральным гуртку, створаным пры ўстанове культуры. Іхні тэатр "Кнігаўка" паказвае спектаклі ў дзіцячых садках, працуючы такім чынам на выкананне плана платных паслуг. А яшчэ бібліятэкары з выгодай выкарыстоўваюць наяўныя ў іх сцэнічныя касцюмы: здаюць іх у арэнду для праведзення ранішнікаў і святочных імпрэз у тых жа садках Чачэрска...

Але ж, натуральна, не ўсё вымяраецца платай. Да прыкладу, у раёне вельмі добра сябе зарэкамендавала бясплатная акцыя "Вазьмі кніжку — атрымаеш крышку". Сэнс акцыі ў тым, што падчас працы аўтабібліятэкі кожны чытач у прыдачу да кніжкі атрымліваў і закатачную крышку — што ні кажы, а патрэбную ў гаспадарцы рэч, асабліва падчас летніх і асенніх закатак варэнняў ды салення.

Таксама варта згадаць і тое, што ў навагоднія і калядныя святы бібліятэкары, перапранутыя ў Дзеда Мароза і Снягурку, наведваюць кватэры сваіх актыўных чытачоў, вітаюць іх цёплым словам і дораць сімвалічныя падарункі — святочныя паштоўкі ды календары… А яшчэ супрацоўнікі райбібліятэкі некалькі разоў ладзілі ў сваёй установе акцыю "Ноч у бібліятэцы", на якую збіраўся амаль увесь горад… І хоць названыя праекты не прынеслі фінансавых дывідэндаў, хто ведае, колькі ўдзячных чытачоў атрымалася прыдбаць такім чынам?

■ У іншым вялікім памяшканні кінатэатра абсталявана більярдная з двума сталамі і тэлевізарам. Яшчэ адзін від платных паслуг — арганізацыя і правядзенне вяселляў і юбілейных вечароў. На сёння "Чачэрсккінавідэасетка" з'яўляецца… **афіцыйным прадстаўніком кампаніі — вытворцы пітной вады**…

У кінатэатры: вяселлі, танцы і вада

Не адстаюць ад бібліятэкараў і кіношнікі. Дырэктар "Чачэрсккінавідэасеткі" Сяргей Мельнікаў з парога паведаміў: за студзень-верасень бягучага года ягоная ўстанова зарабіла каля 200 мільёнаў рублёў на платных паслугах. І гаворка тут — не толькі пра традыцыйныя білеты.

— Справа ў тым, што аднымі білетамі сёння многа не заробіш, — кажа Сяргей Леанідавіч. — Балазе, у кінатэатры не ўсталявана 3D-сістэма, "карцінка" не надта якасная, крэслы таксама не зусім камфортныя і патрабуюць замены. Таму людзей на кінасеансах у "Кастрычніку" не надта багата. Спадзяемся на рамонт сваёй установы культуры, але робім усё, каб выканаць план платных паслуг.

Якім жа чынам ідзе названая праца? Напрыклад, у сувязі з тым, што кінатэатр мае багата вольных плошчаў, сёння ягонае фае выкарыстоўваецца ў якасці дыскатэчнай залы. На танцы, па словах кіраўніка ўстановы, прыходзіць вельмі багата чачэрскай моладзі, бо дыскатэкамі кіруюць дзі-джэі не толькі з Чачэрска і наваколляў, але і з Гомеля. А з 1-га студзеня, калі пры дыскатэцы будзе абсталяваны міні-бар, колькасць удзельнікаў танцавальных вечароў у кінатэатры, безумоўна, павялічыцца. Прынамсі, Сяргей Мельнікаў не губляе на гэта надзеі.

Дарэчы, да позняга вечара названае кафэ будзе працаваць як дзіцячае і сямейнае: з салодкімі напоямі, пірожнымі і марожаным. Магчыма, гэтыя пачастункі не толькі паспрыяюць выкананню платных паслуг, але і павялічаць колькасць наведвальнікаў дзіцячых сеансаў, якія ў раскладзе кінатэатра прысутнічаюць штодня.

У іншым вялікім памяшканні ўстановы культуры абсталявана більярдная з двума сталамі і тэлевізарам. Таксама тут за грошы можна замовіць фота на пашпарт, зрабіць постар на майку ці кружку, раздрукаваць ці ксеракапіраваць тэкст, а таксама паглядзець у відэакабіне фільмы ў 3D-фармаце.

Яшчэ адзін від платных паслуг — арганізацыя і правядзенне вяселляў і юбілейных вечароў. Паслуга, па словах Сяргея Мельнікава, карыстаецца попытам, хоць і каштуе нямала: ад паўтара мільёна рублёў. Сюды ўваходзіць дэкор памяшкання, дзе плануецца зладзіць вяселле, замова тамады, арганізацыя фотаздымкі…

— Некалькі гадоў таму, калі я ладзіў сваё вясёлле, у Чачэрску дадзенай паслугі не было, — кажа Сяргей Мельнікаў. — Тады я і падумаў: чаму б кінатэатру не заняць гэтую "нішу"? І цяпер мы маем сталыя кантакты з рознымі вясельнымі агенцтвамі, існуе магчымасць прадаставіць паслугі тамады як з Чачэрска, Буда-Кашалёва, так і з Мінска ды Гомеля. Хочаш жыць — умей круціцца…

Круціцца Сяргей Мельнікаў сапраўды напоўніцу… Дадам, што, акрамя вясельнай "нішы", кінатэатр "Кастрычнік" заняў у раёне таксама і "водную". Таму на сёння "Чачэрсккінавідэасетка" з'яўляецца… афіцыйным прадстаўніком прыватнай кампаніі — вытворцы і пастаўшчыка на рынак Беларусі пітной вады…

Сказаць з гэтай нагоды можна толькі адно: крэатыўным людзям усё па сілах. Бо, як зноўтакі слушна кажа Сяргей Мельнікаў, сядзець на адным месцы ў час рынкавай эканомікі і чакаць бюджэтнага фінансавання — недаравальна.

У якасці заключэння

На астачу зазначу, што паслугі па дэкоры памяшканняў да вяселляў, іншых святаў прапаноўвае і мясцовы раённы Цэнтр рамёстваў, зарабляючы такім чынам на план платных паслуг… Праўда, салона-крамы ва ўстанове культуры пакуль што няма, таму чачэрскія майстры-рамеснікі вымушаны здаваць сваю прадукцыю на рэалізацыю ў Гісторыка-этнаграфічны музей.

Дарэчы, і самі музейшчыкі няблага "шчыруюць" на пазабюджэтнай "дзялянцы": апроч уваходных білетаў і экскурсій прапануюць наведвальнікам набыць шматлікую сувенірную прадукцыю. Па словах дырэктара ўстановы культуры Алены Новікавай, яны замаўляюць кружкі, налепкі, самую разнастайную кераміку і многія іншыя сувеніры не толькі ў мясцовых майстроў, а і ў гомельскіх ды мінскіх фірм і прыватнікаў, маючы з гэтага неблагі працэнтны даход…

Што ж, як на мой погляд, вопыт пазабюджэтнай дзейнасці супрацоўнікаў сферы культуры Чачэршчыны можна ўзяць "на ўзбраенне" кожнаму раёну Беларусі. І не толькі ўзяць, а і прымяніць на прыктыцы. Было б толькі жаданне…

К

Тактыка культурнага развіцця

"Тыдзень…" для ўсіх узростаў

Тыдні культуры ладзяцца ва ўсіх раёнах Гродзеншчыны па ініцыятыве галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. Гэты праект — доўгатэрміновы і носіць не камерцыйны, а асветніцкі характар. Мы ў рамках Тыдня імкнуліся паказаць самае лепшае і падкрэсліць, што работнікі культуры заўсёды гатовы да канструктыўнага дыялогу, праводзяць мерапрыемствы для самых розных катэгорый насельніцтва, папулярызуюць нашы творчыя дасягненні.

Урачыстае адкрыццё Тыдня праходзіла ў літаратурна-музычнай гасцёўні раённай бібліятэкі. Сярод запрошаных гасцей на адкрыцці прысутнічалі паэты, перакладчыкі, публіцысты. Іх прыезд заўсёды выклікае вялікую цікавасць у раёне. Калі ты можаш пачуць вершы з вуснаў таго, хто ў іх укладвае сваю душу, то і ўспрымаюцца яны па-іншаму.

У выставачнай зале Раённага цэнтра рамёстваў ладзілася адкрыццё выстаўкі "Мелодыя душы" мясцовых майстроў па вышыўцы Марыі Саўко і Галіны Пракопчык. Былі праведзены мерапрыемствы і для маленькіх чытачоў: свята "Захавальнікі мудрасці" (у раённай дзіцячай бібліятэцы) і віктарынны карагод "Паравозік з Мульцяшкава" (у гарадской дзіцячай бібліятэцы).

У Мастоўскім музеі "Лес і чалавек" адкрылася выстаўка гродзенскага мастака Дзмітрыя Іваноўскага. А ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым распачалася дэманстрацыя выстаўкі "Аз Букі Ведзі", якая прысвечана развіццю адукацыі як у Мастоўскім раёне, так і на Беларусі. Тут можна было ўбачыць і параўнаць, за якімі партамі вучыліся вучні раней, чым пісалі і ў якой вопратцы хадзілі…

Багатымі на падзеі былі і іншыя дні Тыдня культуры. Для сельскіх жыхароў філіяламі, сельскімі клубамі арганізоўваліся канцэрты. У бібліятэках праводзіліся віктарыны, літаратурныя і гістарычныя гадзіны, віртуальныя падарожжы. У Мастоўскім раённым цэнтры рамёстваў народныя майстры прапаноўвалі ахвотным майстар-класы па разьбе па дрэве, па вырабе васкавых свечак і славянскіх лялек-абярэгаў. Вучні Дзіцячай школы мастацтваў далі канцэрт, а вучні мастацкага аддзялення дэманстравалі выставу "Вясёлая палітра". У фае Цэнтра культуры дэманстравалася фотавыстаўка "Масты паміж мінулым і будучым".

Урачыстае закрыццё Тыдня адбылося ў аграгарадку Гудзевічы, дзе выступалі калектывы з Мастоўскага і Слонімскага раёнаў.

Сяргей ДЗЕЙКАЛА, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мастоўскага райвыканкама

На здымках: госці Тыдня, кніжная выстаўка з нагоды імпрэзы.

У самім словазлучэнні “мастацкая суполка” ёсць нешта нелагічнае. Творчасць — справа глыбока асабістая. І калі мастакі збіраюцца ў калектыў, дык звычайна дзеля таго, каб зрабіць нешта такое, што аднаму не па сілах. Атрымліваецца аналаг вытворчай брыгады. Па завяршэнні праекта суполка мусіць распадацца, бо яе далейшае існаванне пазбаўлена сэнсу. Нешта такое мы назіралі ў 1990-я гады, калі ў Саюзе мастакоў і за яго межамі творчыя суполкі, нефармальныя аб’яднанні мастакоў з’яўляліся, як грыбы пасля дажджу.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Віктар Мікіта. "Кніга жыцця".

Наталля Белаокая. "Пакінуты сад".

Даўно ўжо не праект


Алена Юр'ева. "Вандроўкі Драздовіча".

За гучнымі адозвамі і мудрагелістымі дэкларацыямі, якімі суправаджалася з’яўленне на свет чарговай тусоўкі рэвалюцыянераў ад эстэтыкі, калі пільна ўглядзецца, стаяла звычайнае жаданне застаўбіць за сабой “хлебнае месца” — частку мастацкага рынку, які ўжо пачаў вымалёўвацца ў варунках першапачатковага накаплення капіталу. Я не іранізую і, барані Божа, нікога не асуджаю. Мастак таксама чалавек, а чалавек, калі ён толькі не вычварэнец-мазахіст, прагне камфорту — побытавага і псіхалагічнага. А той, у сваю чаргу, грошай каштуе… Значная колькасць новаўтвораных суполак згаданай пары знікала пасля таго, як зладзілі адну-дзве выстаўкі. Некаторыя пратрымаліся некалькі гадоў. А вось суполка “Пагоня”, утвораная дваццаць пяць гадоў таму, існуе дагэтуль. Фенаменальны для айчыннай рэчаіснасці факт. Патлумачыць яго ў нейкай ступені можа юбілейная выстаўка суполкі, якая зараз праходзіць у сталічным Палацы мастацтва.

Адразу скажу, што нейкіх адкрыццяў на выстаўцы я не заўважыў. Не было і эпатажных твораў, якіх пэўная катэгорыя гледачоў звыкла чакае ад “пагонічаў”. Экспазіцыя складаецца з новых работ найбольш актыўных у творчым сэнсе мастакоў суполкі і рэтраспектывы, дзе прадстаўлены такія знакавыя для свайго часу постаці, як Яўген Кулік і Сяржук Цімохаў. Асобны раздзел экспазіцыі адведзены творам Алеся Марачкіна, аднаго з творчых лідараў суполкі. Як звычайна, ёсць на выстаўцы гістарычныя краявіды, этнаграфічныя матывы і партрэты гістарычных постацяў. Усё, так бы мовіць, як заўжды…

І праз гэта “як заўджы” выстаўка не ўражвае. Гэта кепска? Для “Пагоні”, так. Для грамадства — не. У кантэкце нашай рэчаіснасці адсутнасць пільнай патрэбы ў нацыянальна-культурным асветніцве, прынамсі, у той форме, якую звыкла спавядае “Пагоня”, — факт станоўчы. Для мастакоў “Пагоні” тое асветніцтва заўжды было надзвычай важным чыннікам творчасці, а для каго з іх — нават справай жыцця. Сёння ж у выніку развіцця сувярэннай дзяржавы многае з таго, пра што “Пагоня” рупілася, рэалізавана альбо рэалізуецца на дзяржаўным узроўні. У такім выпадку ўзнікае падстава для радасці: твая справа робіцца, і адначасова для суму, таму што ўжо без цябе. Бо час змяніўся, а ты застаўся ранейшым. Як той партызан з анекдота, якому не паведамілі, што вайна скончылася, і ён па звычцы цягнікі пад адхон пускае…

Я не іранізую і, тым больш, не здзекуюся. Я канстатую. Я прыйшоў на выстаўку “Пагоні” не па новыя ідэі, а каб азірнуцца назад і асэнсаваць чвэрць стагоддзя. Мастакі суполкі калісьці абвясцілі сваёй мэтай мацаванне сродкамі маствацтва дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі. Мо і трымаюцца яны дагэтуль разам таму, што праект “Беларусь” — гэта не на год і не на чвэрць стагоддзя. Гэта і не праект, уласна, а тое, што можна назваць словам “назаўсёды”. А мастак мусіць адпавядаць тым зменам ў грамадстве, да якіх сам жа спрычыніўся сваёй творчасцю. К

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Але я хачу ў не вельмі ўдзячнай іпастасі ментара, які на сваім доўгім шляху жыцця, пачынаючы з Першай Рэспубліканскай 1966 года, прагледзеў дзясяткі, калі не сотні, маладзёжных выставак, сказаць вось што. Шлях маладых, калі яшчэ ў далёкім міражы і кар’ера, і матэрыяльны росквіт, — вельмі цярністая дарога да самога сябе. І калі ёсць імкненне выказаць у творчасці ўласныя пачуцці, свой боль, трывогі і надзеі, сваю нязгоду з тым, што цябе атачае ў грамадстве, ці сваю “салодкую” адзіноту, — будзе ўсё ОК, нягледзячы на натуральныя мастакоўскія і жыццёвыя памылкі, нечаканыя дэпрэсіі, расчараванні, слёзы. Але трэба быць падрыхтаваным да ўсяго. І да таго, што тваё мастацтва не прынясе табе вялікіх прыбыткаў і дывідэндаў, не далучыць да свету “сучаснай моды” і свецкіх “тусовак”, бо для новаяўленых нуварышаў незалежны свабодны мастак — незразумелы, чужы, нават небяспечны. А можа стацца так, што ідэолагі “суперактуальнага мастацтва” абвесцяць цябе нікому не патрэбнай “старызной” (рынкавая канкурэнцыя бязлітасная, а самы страшэнны канкурэнт для “суперактуальнага мастацтва” — сапраўднае высокае мастацтва). Быць гатовым і да таго, што “шырокая публіка” можа цябе не зразумець, як не разумела пры жыцці практычна ўсіх тых, хто рызыкаваў плыць супраць плыні — пачынаючы з Рэмбранта і да імпрэсіяністаў, кубістаў, фавістаў, да Ван Гога і мастакоў Віцебскай школы, напрыклад. Але толькі на гэтым шляху — самаадданай бескарыслівай творчасці — можна стварыць, як стварылі вялікія мастакі, новую школу ў мастацтве, беларускую школу, здабыць, знайсці свой непаўторны твар, сваю славу…

Да чаго я ўсё гэта? А таму, што выстаўка “Сэлфі” прымусіла мяне спыніцца, агледзецца, падумаць і сказаць сабе і людзям: будучая наша выяўленчая культура ў надзейных, трывалых руках. Пра гэта я думаў, калі глядзеў творы такіх розных, але аднолькава ўлюбёных у сваю справу жывапісцаў Дар’і Бунеевай, Руслана Сяргеева, Настассі Благавай, Івана Семілетава, Настассі Балыш, Кірыла Бандзерса, Ганны Сілівончык, Паўла Ксяндзова, Ганны Кананавай, графікаў Глеба Сідарэнкі, Аксаны Ондра-Арцімовіч, Наталлі Клімовіч, Дзмітрыя Шапавалава, Сафіі Піскун, Ганны Мельнікавай, скульптараў Вячаслава Руткоўскага, Станіслава Шашкова, Яўгена Дабравольскага, Юрыя Бірын-Паўлава, Вольгі Орсік, Крысціны Кулагінай, незвычайных фантазёраў у галіне інсталяцыі Аляксандра Балдакова, Валерыя Бірылы, Ганны Бундзелевай, Кацярыны Шымановіч, Кацярыны Шалкоўскай, Васілісы Палянінай-Календа… Не буду далей пералічваць імёны — іх, дастойных, шмат…

Вось Ганна Зарубіна назвала сваю кампазіцыю са шкла “Хто я?” Сапраўды, хто яна ў першую чаргу як мастак і асоба? Хто ўсе тыя маладыя людзі, якія паказалі ці імкнуліся паказаць на гэтай выстаўцы сваё ўласнае “я”, не падобнае на “суседскае”? Людзі-адзіночкі ці людзі, раствораныя ў натоўпе, хай сабе з пэндзлямі, алоўкамі ды разцамі? Хто адважыўся наросхрыст адкрыць сваё сэрца свету і свае адносіны да яго, напоўненага да краёў дзікімі кантрастамі быцця, бязлітаснымі войнамі, прыроднымі катаклізмамі? Аднак у гэтым свеце ёсць і любоў, і дабрыня, і мары. І галоўнае — вера. Вера ў мір на планеце, у шчасце Радзімы, у сям’ю, сяброў, настаўнікаў. І вера — у сябе, у сваё прызначэнне на Зямлі як творцы-дэміурга. Вось тэмы, якія сёння павінны ў поўны рост паўставаць перад маладымі беларускімі творцамі, нашай апорай і надзеяй.

Што б там ні казалі, а “ўсярэдненасць”, нейкі “мёртвы зыб” нашага сённяшняга “дарослага” мастацтва, на якім толькі калі-нікалі ўспыхваюць іскаркі шчырага адкрыцця, можна канстатаваць як вызначаны аптымальна-выратавальны варыянт своеасаблівай уяўнай добраўпарадкаванасці і камфорту ў творчай суполцы. Гэта такая быццам бы гарантыя бязбеднасці “жыцця ў мастацтве”. Але тое, што “вокруг да около” пануе непрафесіяналізм, даўно нікога не бянтэжыць. Кожны лічыць сябе геніем, бо межы паміж “добрым” і “дрэнным” у мастацтве даўно сцёрліся.

Аднак маладым, тым жа ўдзельнікам выстаўкі “Сэлфі”, якія ўступаюць на самастойны творчы шлях, на мой погляд, такая “ўсярэдненасць” пакуль не пагражае. І ў гэтым сэнсе своечасовая максімальная падтрымка іх дзяржавай — матэрыяльная і маральная — дарагога каштавала б. Вось не так даўно з’явілася інфармацыя, што ў 2017 годзе ў нас у сістэме нацыянальных прэмій будзе прысуджацца і прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва — у тым ліку і найлепшаму маладому мастаку. І гэта вельмі радуе.

А ў прынцыпе прыспеў час міністэрствам культуры і адукацыі, Саюзу мастакоў і іншым зацікаўленым дзяржорганам і ўстановам падрыхтаваць і арганізаваць сапраўдную (не для птушачкі! не для справаздачнасці!) Рэспубліканскую канферэнцыю па праблемах маладых мастакоў. Бо сёння мала хто ведае, што ж насамрэч робіцца ў душах і сэрцах гэтага ў вышэйшай ступені крэатыўнага пакалення, якое ідзе нам на змену. К

Дар’я Шышкова. Аўтапартрэт.


Тацяна Савік. Аўтапартрэт.

Сэлфі спазнання свайго “Я”

Валерыя Бірала. "Супрацьстаянне".

Раман Коршунаў. Аўтапартрэт.

Ірына Ясюкайць-Дударава. "Падвойны партрэт".

Максім Чэркашын. Аўтапартрэт.

Павел Ксяндзоў. "Zoom".

Святлана Петушкова. "Сэлфі".

Твор мастацтва — гэта, так бы мовіць, візуалізаваная душа аўтара. Гэта таямніца, якую гледачам трэба нават не ўбачыць, а адчуць. Створаны візуальны вобраз — не проста штосьці адасобленае ад творцы, ён непадзельны з ім, бо паказвае ягонае “я”, ягоны ўнутраны стан.

На Рэспубліканскай маладзёжнай выстаўцы “Сэлфі” ў Палацы мастацтва прадстаўлены жывапіс, скульптура, ДПМ, графіка, інсталяцыі. Дар’я Бунеева — старшыня адпаведнай секцыі Беларускага саюза мастакоў, а таксама куратар “Сэлфі” з’яднала ў адной прасторы тры светы — віртуальнасць (на шчасце, гаворка толькі пра тэму), рэальнасць і мастацтва. Апошняе таксама можна лічыць светам вобразаў, колераў, формаў. Як мне падаецца, творы настолькі выразныя, што атрымалася шматгалоссе аўтарскіх “я”. Арганізатары выстаўкі задаліся пытаннем, які візуальны матэрыял адлюстроўвае наш час?

Але ж спачатку варта вызначыцца з сэлфі віртуальным і вобразным.

Што такое сэлфі ў мастацтве? Гэта не проста фіксацыя сябе ў самым непасрэдным сэнсе, як зараз гэта робіцца для Сеціва, каб паказаць знешні ідэальны вобраз альбо нейкае месца адпачынку. Рэальныя мы толькі ў той час, калі раскрываемся альбо хаваемся за пэўнымі вобразамі. Рэальны свет — гэта наш унутраны свет. Таму кожны твор ужо сам па сабе з’яўляецца сэлфі — асэнсаваным, зафіксаваным, створаным. Сэлфі ў мастацтве — вобразы, асацыяцыі, энергетыка аўтара. І кожны з прадстаўленых аўтараў паказаў сябе, і не вобраз-маску, а ўнутраны стан. Не дзіва, што нават гераіня твора “Голая праўда” Надзеі Букі зняла ўсе маскі.

Па вобразнай сістэме, колерах, выгінах, матэрыялах можна вызначыць тэмперамент, характар аўтара. І, зразумела, не кожны твор з ахвотай уступае ў дыялог. Да некаторых патрэбны асабісты падыход. Гэтая выстава нагадвае псіхалагічны тэст на асацыяцыі. Таму “Сэлфі” і ўдалася, бо асацыяцыі, вобразы ва ўсіх розныя: дрэвы, твары, жывёлы… Цікава тое, што многія закранаюць і агульначалавечыя праблемы, і філасофскія. Добра, калі арганізатары робяць зрэз, каб разумець, чым “дыхаюць” сучасныя мастакі, што адчуваюць, што іх хвалюе.

Жывапіс, як заўсёды, са сваімі непаўторнымі прысмакамі. Можна ўбачыць і аўтапартрэты, і людзей “механічных”, і сюжэты з тэатральнымі матывамі. Сярод аўтапартрэтаў варта адзначыць работу Рамана Коршунава, твор якога — энергія, рух колераў і мазкоў. Рэзкія плямы, схопленае святло — адбітак на акулярах, — усё зафіксавана імгненна.

На выстаўцы прадстаўлены чатыры работы Івана Семілетава — “У пошуках святла”, “Позірк”, “Асоба-4”, “Асоба-2”. Свет яго нагадвае акіян. Чаму? Калі не паглыбішся ў творы мастака, то ніколі не зможаш адкрыць самога Івана, ягоную творчасць, якая, на мой погляд, спецыфічная і пазнавальная. Ад некаторых карцін Семілетава вее адзінотай, меланхоліяй, неспакем, але гэта не адмоўная характарыстыка, а адлюстраванне светапогляду, тэмпераменту, індывідуальнасці мастака.

Пра сваё месца ў свеце задумваецца і Алена Вярстак. Твор называецца “5.45”. Але што гэта? Час нараджэння? На гэтую думку наводзіць і яйка на талерцы. Твор можна інтэрпрэтаваць як нараджэнне смелага творцы або ідэі. На сваёй карціне, якая падзяляецца на дзве часткі, а паміж імі — пустэча, аўтар пакінула месца, мабыць, для сваёй ідэі. Гэтая пустэча, як і мінімалізм твора ўвогуле сведчаць пра тое, што мастачка знаходзіцца ў пошуках.

Пазнавальныя, выразныя работы Ганны Сілівончык, у якіх не жыццё, а тэатр. І людзі, асабліва ў творы “Доўгія праводзіны”, нагадваюць дэкарацыі, бо галоўныя персанажы — мужчынскі грубаваты чобат і маленькі жаночы пантофлік застылі ў форме літары “Я”. Здаецца, твор Ганны Сілівончык — адлюстраванне адносін паміж мужчынам і жанчынай.

Тэму тэатральнасці працягвае карціна “Глядач” Вольгі Бычко. Перад намі — творца, які назірае за людзьмі. Мы не ўбачым ягонага твару, толькі блакітнае вока ды рукі. Мы прызвычаіліся, што гледачы не ствараюць, а паглядаюць ды ацэньваюць. Вольга Бычко парушае гэты стэрэатып: мастак таксама глядач.

Тэму пошуку сябе, свайго месца ў свеце, у прафесіі працягваюць скульптары. Крысціна Кулагіна ў творы “Пяты вугал” паказала чалавека, які не знайшоў прытулку ў пакоі, выйшаў з яго (не паслухаў Іосіфа Бродскага). Быццам бы вызваліўся ад рамак, і яму стала лягчэй. Вольга Сямашка паказала творчы працэс у майстэрні скульптара, а калі больш дакладна, то — адчай, сум, бо нічога ў героя не атрымліваецца. А Ганна Зарубіна задаецца пытаннем “Хто я?”. Тры твары, якія знаходзяцца нібыта ў розных часавых вымярэннях, таксама шукаюць адказ на пытанне.

Самародкі (“Самародак. Мужчынскі род”, “Самародак. Жаночы род”) Антона Нічыпарука зрабілі сябе. Мабыць, дэвіз ягоных скульптур з пластыку — “Зрабі сябе сам!” Спляценні частак цел кожнага паасобку — мужчыны і жанчыны — не толькі пачатак роду, а рэалізацыя ў прамым сэнсе.

Сюррэалістычныя матывы прасочваюцца ў скульптурах Юрыя Бірын-Паўлава “Сюррэаліст Рэнэ Магрыт” і Яўгена Дабравольскага “Чорны чалавек”, які, мабыць, увасобіў героя аднайменнай паэмы Сяргея Ясеніна, прычым персанаж Дабравольскага не мае галавы.

Ганна Зарубіна. "Хто я?".

“Голас лесу” матэрыялізавалі Васіль Цімашоў, Аляксандр Сакалоў, Паліна Пірагова і Іван Арцімовіч (іх “Павук”, якога яшчэ можна ўбачыць каля Ратушы, стаў пазнавальным для мінчан). Гэтую тэму працягнула Святлана Амельчанка, прадставіўшы твор “Дрэва”, зроблены з баваўны і лямца. Яе дрэва мае вялікую крону ў форме спіралі і нагадвае галаву, рух думак.

Якую выснову можна зрабіць? Выстаўка атрымалася разнастайнай і насычанай. Моладзь шукае сябе і сваё месца ў гэтым жыцці. Можна абазначыць яшчэ адно сэнсавае кола — зварот да прыроды. І галоўнае, што можна ўсё рэалізаваць: і голас лесу, і мару.

Вольга РОПАТ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

A&B: Аўдыя & Відэа

Кастрычніцкія аўдыя-/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля “Песняры” Вячаслаў ШАРАПАЎ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты “Культура”, музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

ТЭКСТ

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт “К”

Вячаслаў ШАРАПАЎ, мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля “Песняры”

АЎДЫЯ

Гурт “Zolki Band”, сінгл “Chalodna z Vami”

А.: Не з’яўляючыся аматарам падобнага стылю, як і прыхільнікам “камланняў” пад грукатлівыя рыфы, не падзяляючы падобных жыццёвых тэзісаў, усё ж рызыкну агучыць адчуванні ад пачутага. Для мяне гэта проста гарманальнае “вопиение” заблукалага светапогляду. Неяк так...

Абсалютна недарослае выкарыстанне музычных навыкаў, а таксама прыкметы ірацыяналізацыі духу. Падобная рэч, па-мойму, — чысты прадукт шматгадовай дзейнасці арганізацый, закліканых у свой час выгадаваць на нашых тэрыторыях апатыю ў дзейных пластах насельніцтва, а таксама актываваць супрацьстаянне паміж бацькамі і дзецьмі, скажам, з мэтай кантраляваць погляды, звычкі і навыкі чалавека. Наступствы гэтай дзейнасці мы адчуваем да гэтага часу, хаця цвярозасць непазбежна наступіць. А пакуль будзем канстатаваць галоўную адметную рысу такіх рэлізаў: я ахарактарызаваў бы яе як “агрэсіўная бездапаможнасць”.

В.: Нагналі змроку, брэстчане, нагналі. Што ў музыцы, што ў тэкстах. Смог, гар, чад. Дайце мыла з вяроўкай, дайце парабэлум і адзін патрон. Але ўсеабдымнага апакаліпсісу не здарылася: местачковая драма на звыклым месцы. Суперажываць не цягне. Можа, зайграць музыкантам беспрасветны грандж або эма? А то даюць не надта смачную альтэрнатыву — інструментальна то “жывую” (першы трэк), то “мёртвую” (другі). Не ведаю... Калі ўвесь будучы поўнафарматнік будзе ўяўляць з сябе вось такі канцэпт — адчайна-панурны, калі ў ім будзе песня-хук адпаведнага настрою, тады — так. А пакуль — не.

Гурт “Крамбамбуля”, альбом “Чырвоны штраль”

А.: Аркестр партызанскага джазу “Крамбамбуля” ў сваіх лепшых традыцыях “рэвалюцыянераў” позняга савецкага перыяду, апалагетаў палітычных ілюзій, у чарговы раз, па-добраму, павесяліў. Сёння падобная тэматыка слухаецца вельмі наіўна, і гэты сцёб, акрамя паблажлівай усмешкі, здольны хіба што спарадзіць жаданне падзяліцца меркаваннямі на злобу дня. Ну няма ў нашым народзе масавага імкнення занурыцца ў беспадстаўную самасць! Захоўваем пэўныя яе элементы — і дзякуй богу.

Ужо нават дзецям зразумела, што “абсалютнай свабоды” не бывае. Ёсць геапалітычнае месца кожнай нацыі ў адпаведнасці з узроўнем яе развіцця. Свабода народа не залежыць ад улады. Адзінае, што робіць чалавека па-сапраўднаму свабодным, — гэта яго незалежнасць ад уласных грахоўных страсцей (чытайце Евангелле!). Можна бясконца доўга тыражаваць свае палітычныя погляды, такім чынам самавыяўляючыся, але па дасягненні пэўнага ўзросту ўсё ж трэба ўсведамляць і адказнасць за тое, што агучваеш. І наогул, можа, прыспеў час перастаць ідэалізаваць адно і ганіць іншае? Ва ўсім, ва ўсіх ёсць свае плюсы і мінусы, а рэальнасць павінна рухаць толькі да аднаго: атрымання практычнай карысці з наяўнай сітуацыі, пры гэтым духоўна ўзрастаючы (па магчымасці). А “Крамбамбулі” можна было б лязо пяра скіраваць на гаспадароў сусветных грошай або на алігархічны соцыум: тэма, калі паглыбіцца, практычна невычэрпная...

В.: Нешта мне падказвае, што гэта не апошні рэліз гурта, як тое анансавалася яго лідарам. “Развітанне са славянамі” і іншымі народнасцямі можа стаць яшчэ адным перформансам ад Лявона Вольскага, на якія ён здатны. Стартаваў гэты прадукт як лабух-ансамбль, закліканы весяліць публіку ў залах і на карпаратывах песнямі прамога ўздзеяння на мазжачок і асабліва — ногі. Занадта глыбокага сэнсу ў тэкстах “Крамбамбулі” тады не было, аднак, у сілу варункаў каманда з часам дакацілася да сацыяльшчыны з хэві-металам. І гэта была ўжо дакладная прыкмета таго, што ў гісторыі калектыву здарыцца які-небудзь кульбіт. Кропку бэнд вырашыў паставіць, злучыўшы ў альбоме-эпітафіі дэбют з перадфіналам. Гэта значыць, у астатку маецца непатрабавальны музон з нейкім непустым вербальным пасылам. Ператасаваўшы вялікую колькасць музыкантаў у дадзеным дзецішчы, Вольскі ў апошнія гады жыцця гурта дамогся ад яго разумнай прафесійнай ігры, ну а з вершаскладаннем у Лявона заўсёды ўсё было ў парадку (нават калі некаторыя опусы “легенды беларускага року”, мякка кажучы, здзіўлялі). Увогуле, не сорамна з такім матэрыялам сыходзіць.

Гурт “The Silicon”, альбом “Tiki Tohua”

А.: Атмасферны, кіношна-асацыятыўны альбом адразу ж аднёс маё стомленае ўяўленне ў далёкае, шчаслівае, пляжнае дзяцінства, у летнюю спёку 1960-х, калі нашымі спадарожнікамі былі радыёпрыёмнік “Спідола”, смак белага наліву, пах ледзянцоў на кінасеансах і першыя ўважлівыя погляды на амаль сфарміраваных дзяўчынак. Нешта зачаравальнае было ў той атмасферы адкрыццяў, п’янлівым пачуцці свабоды, у прадчуванні велізарнага жыцця на гарызонце. Незвычайная вастрыня ўспрымання адцянялася пурытанскімі норавамі афіцыйнага мастацтва, як аказалася, далёка не самага дрэннага, і немудрагелістым “дысідэнцтвам” хлопцаў больш сталых. Іх вабіла замежжа і казкі “дзікага Захаду”.

Я да таго, што для мяне такі альбом прыемны, нягледзячы на яго нейкую аднастайную “апорную”. Ён відавочна навеяны духам Таранціна, і дзе-небудзь у клубе з адпаведнай тэматычнай “напаўнізмай” будзе вельмі актуальны і, безумоўна, прыдатны. Сёння найбольш прывабны менавіта “духаносны” матэрыял і суправаджальныя для яго з’явы, бо любая спроба адвязацца ад музычна-глабалістычных тэндэнцый выглядае свежай, нават нягледзячы на паўтор нейкіх, ужо ўжытых кімсьці, традыцый. Хочацца пажадаць “сіліконаўцам” далейшых поспехаў і паспадзявацца на здабыццё дадатковай вытанчанасці і шарму ў наступных опусах. Мабыць, варта выпіць чарачку тэкілы за іх.

В.: Найбольш вядомы ў краіне сёрф-гурт (можа, наогул адзіны). Стыль гэтых звязаны з паняццем “рэтра”: ён і ўзнік у канцы 1950 — пачатку 1960-х, неміласэрна эксплуатаваўся разам з кантры ў галівудскіх фільмах пра добрых, дрэнных і злых, ды і проста ніколі не граўся ў сучаснасці (хоць бы на ўзроўні выкарыстання гітарнымі складамі актуальных інструментаў і прымочак). Курылка жывы і дагэтуль, усё гэтак жа саўндтрэкамі трапляе ў кіно пра дзікі-дзікі Захад і па-ранейшаму не прызнае камп’ютараў. Асабліва да месца альбом акажацца напярэдадні зімы і месяцаў, спадзяюся, снежных, калі вы не збіраецеся прабавіць гэты час года, дапусцім, у Бахрэйне: сонечная, пляжная атмасфера з пырскамі салёных хваль у аўдыявыглядзе гарантаваная. І, што немалаважна, кірунак такі, пераважна, не прадугледжвае ў кампазіцыях тэкстаў. Іх у рэлізе і няма.

ВІДЭА

Улада, кліп на песню “Маміна дачка”

А.: Вельмі хатняя песня пра мам і дочак, ім жа і прызначаная. Слёзы замілавання, абдымкі, пацалункі. Мы такое любім, і правільна робім. Калі пераманціраваць, выключыўшы “пацалунак у старонку” (як на свецкіх раўтах), поўны памперс дзіцяці і яшчэ сёе-тое, то вельмі ўдалася работа, якая сапраўды выконвае сваю задачу: стаць (на некаторы час) “цвіком” на кожны дзень народзінаў, на кожнай сямейнай урачыстасці, ажно да вяселля.

В.: Ролік — падобны на сямейны відэаальбом і складаецца ён з кадраў, на якіх адлюстраваны шчаслівыя моманты зносін на прыродзе мам і іх дачок — зусім яшчэ маленькіх і ўжо падрослых. Яркая, насычаная, цёплая карцінка, з блакітным небам, лёгкім ветрыкам і сонцам. І песня такая ж — павольная, для рэлаксу. Шчыра казаць аб высокім кліпавым мастацтве ў гэтым выпадку складана, як і пра кампазіцыю-шэдэўр. Гэта проста кінапамяць пра лета, пра бясхмарнае дзяцінства. Гэта вялікія любоў ды пяшчота ў руху і мелодыі з тэкстам. Пачуцці, якія будуць вечнымі. Тым відэа і каштоўнае...

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Зноў пра “Свячу”…

Зранку сустрэліся з намеснікам начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага райвыканкама Марынай Пясецкай. Запыталіся пра “Свячу”. Марына Анатольеўна вельмі здзівілася: маўляў, у гэтым аграгарадку працуе неблагі спецыяліст. Пачала кудысьці тэлефанаваць, высветліла, што работнік культуры адсутнічала ў рабочы час па ўважлівай прычыне. Па якой менавіта і чаму не пакінула адпаведнай абвесткі, нам не паведамілі.

Дык ці можна па адной установе, дзе атрымалі адмоўныя ўражанні, меркаваць пра культуру ўсяго раёна? Не. Як, зрэшты, і па тым, што ў горадзе ёсць цудоўны РДК, нельга сцвярджаць, што гэткая ж “цудоўнасць” уласцівая сельскім клубам ды бібліятэкам раёна.

А яшчэ даведаліся мы ад Марыны Пясецкай, што існуе праблема з кадрамі на сяле. Да слова, у сферы культуры Бешанковіцкага раёна сёння працуе 189 чалавек, з іх спецыялістаў з профільнай адукацыяй 109, а з вышэйшай — 60. Натуральна, многім работнікам важна было б павялічыць багаж ведаў, павысіць кваліфікацыю. Але тут паўстае новая праблема: не стае метадычнай дапамогі (пра гэта “К” пісала яшчэ ў 2009 годзе), іншым разам не хапае грошай, каб лішні раз адправіць супрацоўнікаў адпаведных устаноў на вучобу ў Віцебск… Пытанні, характэрныя ці не для кожнага раёна краіны. Адно не выклікае сумненняў: пры ўсяго толькі трох метадыстах дапамога сельскім клубнікам павінна быць больш дзейснай і частай. Не толькі дапамога, але і кантроль.

Чаму толькі “клубнікам”? Ды проста пра дзейнасць бібліятэкараў мы ведаем значна больш па той прычыне, што мясцовыя “кніжнікі” апошнім часам вельмі актыўна супрацоўнічаюць з “К”: пішуць (бывае, вельмі цікава!) пра плён сваёй дзейнасці. І ўвогуле, першае, што нас уразіла той раніцай, — вялізны стэнд ля ўваходу ў дзіцячую бібліятэку, дзе былі змешчаны вялікія каляровыя партрэты лепшых чытачоў. Мы такога, шчыра кажучы, нідзе пакуль не бачылі!

Чаму здзіўляліся, чаму — не вельмі

РДК у Бешанковічах.

Факт пра план, які не догма

Ад Марыны Пясецкай даведаліся яшчэ пра некалькі клопатаў аддзела. Першае, за што баліць сэрца ў намесніка кіраўніка сферы: патрабуе рамонту дзіцячая школа мастацтваў. Падрыхтавана дакументацыя, але на тое, каб зрушыць справу, банальна не хапае сродкаў. Апроч таго, істотнага абнаўлення патрабуюць у ДШМ музычныя інструменты, гукавое абсталяванне. І аднаго пазабюджэту на гэтыя мэты, відавочна, недастаткова.

Чарговая (і агульная для ўсёй краіны) праблема — наведвальнасць дыскатэк. І нібыта знайшлі ў раёне, як яе вырашыць, аднак сутыкнуліся з новымі акалічнасцямі. Так, у Міністэрстве культуры падказалі, што можна праводзіць разавыя вечаровыя мерапрыемствы з удзелам непаўнагадовых, што аддзел актыўна і практыкуе. І тым не менш захоўваюцца напружаныя адносіны з праваахоўнымі органамі: з аднаго боку, падлеткі цяпер могуць знаходзіцца да гадзіны ночы ў клубе, з іншага, выйсці на вуліцу і дайсці да дому пасля мерапрыемства яны мусяць у суправаджэнні бацькоў, якія на той час ужо бачаць салодкія сны. Як быць з новай юрыдычнай калізіяй?

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Бібліятэкары, сапраўды, малайчыны. І не толькі на Бешанковіччыне. Вось ім чамусьці не надта патрэбна метадычная дапамога. Тая сітуацыя, калі на практыцы не без поспеху рэалізуецца старадаўняя выснова: “Той, хто інфармацыяй валодае, той і светам кіруе”. Якую б выснову для “клубнікаў” прыдумаць? Мо чытачы падкажуць?

Знаёмцеся: Станіслаў Леваненка!

Уразіў не столькі Бешанковіцкі краязнаўчы музей, колькі галоўны захавальнік ягоных фондаў Станіслаў Леваненка. Ён сам па сабе — музей. Павадзіў нас па горадзе, панарасказваў такога, што ў нас, без перабольшання, раты ад здзіўлення не закрываліся. З гэтай нагоды музейшчык — вельмі папулярны чалавек. Час ад часу тыя жыхары райцэнтра, да якіх прыязджаюць госці, бяруць Станіслава “ў арэнду”, каб павазіў па горадзе і раёне ды парасказваў пра слаўную гісторыю Бешанковіччыны. І Леваненка паспявае паўсюль: на раскопках, на музейных занятках са школьнікамі, на непасрэднай працы па папаўненні і захаванні фондаў. Такіх бы самаадданых музейшчыкаў — ды паболей!

Вось і нас спадар Леваненка павёў адразу не ў музей, а паказаў вулічныя цікавосткі Бешанковічаў, ці не галоўная з якіх — помнік у сэрцы райцэнтра. Як аказалася, колішні ўладальнік Бешанковічаў Іеранім Храптовіч узвёў гэты помнік у гонар прыезду расійскага імператара Аляксандра І у 1821 годзе. Некалькі разоў манумент перарабляўся, а ў сярэдзіне мінулага стагоддзя набыў сваё сучаснае аблічча: сведчыць пра подзвіг камсамольцаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Цікава, што з XIX стагоддзя захаваліся побач з помнікам сем аўтэнтычных слупоў.

Але вернемся да музейнай справы. Што нам спадабалася? Ды хаця б тое, што ў мясцовых музейшчыкаў шмат перспектыўных задумак. Адна з іх — проста супер! Гаворка пра аднаўленне знакамітых бешанковіцкіх кірмашоў. А знакамітыя яны былі тым, што цягнуліся аж чатыры тыдні запар. За гэты час купцы афармлялі кантракты на пастаўку тавараў, каб не прагадаць, спрачаліся і таргаваліся да апошняга. Цяпер бы адпаведны кірмаш назвалі аптовым. Натуральна, сучасная рэканструкцыя такіх кірмашоў не прадугледжвае захаванне ягоных тэрмінаў. Галоўнае — гістарычную атмасферу перадаць ды вярнуць колішні гандлёвы прэстыж райцэнтру. Праўда, для нас незразумелым засталося вось што. Кірмашы раней праводзіліся на месцы сённяшняга гарадскога сквера. Калі іх узнаўляць, дык менавіта тут. Але ж у скверыку цяпер устанаўліваецца мемарыяльная вайсковая тэхніка. Справа — цудоўная, але як яна будзе сумяшчацца з кірмашовымі рэканструкцыямі, якія ў рэспубліцы набываюць брэндавае значэнне (згадайма “Ганненскі кірмаш” на Зэльвеншчыне)?

Што не спадабалася? Тое, што музей патрабуе рамонту будынка і абнаўлення экспазіцыі. На першае і другое элементарна, няма грошай. Застаецца толькі спадзявацца, каб іх хапіла на адмостку музейнага перыметра, якую распачалі і на невядомы час спынілі. А пра тое, што музей патрабуе да сябе пільнай увагі і ўкладанняў, сведчыць хаця б наступная акалічнасць: асноўная экспазіцыя

Ганцавіччына /

Праграма на пяць гадоў

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу стварыў праграму “Моладзь і час”. Яна разлічана на пяць гадоў. Мерапрыемствы, якія адбыліся сёлета, скіраваны на духоўнае адраджэнне, на далучэнне моладзі да вырашення экалагічных праблем, фарміраванне патрыятызму і грамадзянскай пазіцыі…

На мінулым тыдні сярод бібліятэчных работнікаў прайшоў семінар “Эфектыўныя формы і метады работы з маладзёжнай аўдыторыяй”. На ім вялася гаворка пра канкрэтныя мерапрыемствы доўгатэрміновай праграмы.

Спачатку на базе Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Васіля Праскурава ўдзельнікі пазнаёміліся з вынікамі анкетавання “Што чытае моладзь?” Па адказах можна меркаваць, што моладзь адчувае сябе ў бібліятэцы камфортна, з ахвотай наведвае яе, задаволена наяўнай інфармацыяй. Прыярытэтным у чытанні з’яўляецца, у асноўным, вучэбная літаратура і праграмная мастацкая. Выснова такая: неабходна пашыраць межы пазнання “кніжнага” кругагляду маладых, папулярызаваць сучасных аўтараў.

Вопытам работы з калегамі падзялілася бібліятэкар гарадской гімназіі Святлана Чыкун. Яна пазнаёміла прысутных з работай свайго прэс-цэнтра. Юныя журналісты ствараюць школьную газету, удзельнічаюць у конкурсах школьных СМІ. Сустрэча з паэткай Аксанай Карповіч сведчыла аб тым, што моладзь наша — цікавая і таленавітая. Аксана — малады спецыяліст, загадчык Агарэвіцкай сельскай бібліятэкі, дыпламант абласнога конкурсу прафесійнага майстэрства “Умельцы Брэстчыны”.

Потым мы працавалі ў сельскай бібліятэцы аграгарадка “Раздзялавічы”. Гаворка ішла пра сямейнае чытанне, замежны вопыт работы, маладзёжныя акцыі як маркетынгавы ход бібліятэкі.

Была наладжана сустрэча з моладдзю, якая звязала свой лёс з вёскай. Раздзялавічы — адна з перспектыўных кропак на карце Ганцавіччыны. Знаходзяцца яны ўдалечыні ад райцэнтра, але тут ахвотна застаецца моладзь. Мерапрыемства называлася “Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся”. Маладыя настаўнікі, работнікі сельскай гаспадаркі расказвалі пра свае адносіны да працы, роднай зямлі.

Таццяна МАЛЯЎКА,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай РЦБС

Падчас свята ў Адэльску.

Гродзеншчына /

Край ветракоў і млыноў

У аграгарадку “Адэльск” Гродзенскага раёна трэці год запар адзначаецца Свята млынароў.

Сёлетняя ўрачыстасць, прысвечаная заступніку млынароў і гэтага паселішча святому Марціну, адкрылася тэатралізаваным шэсцем. Ад касцёла да месца святкавання ехалі вазы, упрыгожаныя стужкамі. За імі ўдзельнікі свята з песнямі неслі караваі.

Усе ахвотныя маглі ўбачыць і прадэгуставаць традыцыйныя стравы Адэльскай кулінарыі: сала, пончыкі, бульбяную кішку… А ў Адэльскім цэнтры культуры і народнай творчасці была прадстаўлена традыцыйная выпечка.

Сельская бібліятэка-цэнтр краязнаўства і турызму аформіла выстаўку “Адэльск — край ветракоў”. Прайшлі конкурсы караваяў, падворкаў устаноў культуры Гродзенскага раёна.

Конкурс побытавых танцаў “Восень у стылі Этна” прайшоў другі раз для падтрымкі, захавання і развіцця мясцовай танцавальнай культуры. Удзельнікі конкурсу прадставілі самабытныя танцы: “Ойра”, “Кацярынка”, “Полька”, “Ліцвін”, “Кракавяк”, “Падэспань”, “Нарэчанька”.

На свяце выступіў са сваёй музычна-танцавальнай праграмай фольк-шоу гурт “Забабоны” з Мінска.

Ганна СІМАНЕНКА,
намеснік дырэктара Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра

Семінар на Ганцавічыне.

Смаргоншчына /

Кінуць паліць

Супрацоўнікі Смаргонскай раённай бібліятэкі на базе Гарадской бібліятэкі № 3 правялі раённы семінар “Маральна-духоўнае выхаванне як прыярытэтны накі-

Ксенія Малец і Дар'я Даўгяла.

Адна з музейных залаў.

Акампаніятар РДК Соф'я Панкевіч.

А наведалі мы яшчэ і Дом рамёстваў...

Галоўны захавальнік музейных фондаў Станіслаў Леваненка.

была створана яшчэ ў 1987 годзе...

Тым не менш, Станіслаў Леваненка не сядзіць, склаўшы рукі. Дзякуючы яго пошукавай працы сабрана багата архіўных матэрыялаў, зроблены фотакопіі. Вось толькі прадставіць іх належным чынам няма як: у музеі адсутнічае нават праектар, не кажучы пра інфакіёскі з запампаванай туды цікавай гістарычнай інфармацыяй.

Сваімі сіламі музейшчыкі падрыхтавалі некалькі выставачных праектаў, пад якія аддадзена пару мініяцюрных залаў. У адной з іх прадстаўлены карціны мясцовага мастака, у другой адноўлены аўтэнтычныя інтэр'еры пакоя сярэдзіны мінулага стагоддзя. Канешне, можна сказаць, што мода на выстаўкі, якія адлюстроўваюць савецкі побыт, сёння паўсюдная, з-за чаго арыгінальнасць, вядома ж, губляецца. З іншага боку, калі мясцовай грамадзе (і найперш моладзі) цікава паглядзець, як жылі людзі некалькі дзесяцігоддзяў таму, то чаму б і не? Прынамсі, выстаўка ў Бешанковічах зроблена з густам і насычана цікавымі артэфактамі.

Вузка! Цесна! Мала!

Чарговае станоўчае ўражанне, якое суседнічае з уражаннем адмоўным, звязана з раённым Домам рамёстваў. Як і шмат гадоў таму месціцца ён у мала прыстасаваным для такіх патрэб будынку, дзе дастаткова цёпла толькі ў адным пакоі… Забягаючы наперад, зазначым: чарговая наша публікацыя будзе прысвечана культуры Лёзненшчыны. Дык вось, у гэтым раёне, які ў фінансавым плане, падаецца, нічым не адрозніваецца ад Бешанковіччыны, неяк здолелі і з рамонтам музея разабрацца, і падшукалі новае памяшканне для РДР. Відаць, справа не толькі ў фінансаванні. Нагадаем, што ў Лепелі Дом рамёстваў знаходзіцца на галоўным райцэнтраўскім пляцы. І займае не толькі другі паверх крамы, але і прэтэндуе на першы.

І ўсё ж пра станоўчае. Кіраўнік мясцовага РДР Марыя Калкова ад мар пра новы будынак для сваёй установы пераходзіць да будзённых спраў. У прыватнасці, пры РДР дзейнічае народны клуб майстроў, які складаецца з 17 чалавек. Гэтымі днямі ён мусіў пацвердзіць свой статус у Віцебску. Самі ж супрацоўнікі ўстановы ствараюць проста цуды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, працуючы ў вышыўцы, распісваючы маляваныя дываны, ствараючы чароўныя роспісы па шкле. Для дзяцей працуюць некалькі гурткоў, самымі папулярнымі з якіх з'яўляюцца "Гліняная цацка" і "Гліняныя цуды" — падлеткі на занятках асвойваюць азы не толькі ганчарнага майстэрства, але і стварэння з гліны разнастайнай сувенірнай прадукцыі.

Марыя Калкова марыць, каб працы мясцовых майстроў выстаўляліся ў розных галерэях. Мы, у сваю чаргу, прапануем ідэю ладзіць абменныя выстаўкі, да прыкладу, з тым жа Лепельскім РДР. Марыя Ісакаўна была б і рада такія праекты ажыццяўляць, ды, па яе словах, адзіная на сферу культуры раёна "Газель" пастаянна загружана. І не дзіўна, калі на ўвесь раён няма нават аўтаклуба. Ну а для таго, каб выканаць гадавы план па аказанні платных паслуг, які сёлета складае 15 мільёнаў, у РДР знайшлі арыгінальнае выйсце: была створана новая батлейка, і супрацоўнікі ўстановы паказваюць тэатралізаваныя прадстаўленні.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Размаўляючы з кіраўніцтвам, работнікамі сферы культуры, ніводнага разу не пачуў пра спонсарскую дапамогу, прыклады дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва. Але за перспектыўнымі варыянтамі далёка хадзіць не трэба. Завіталі ў прыватную фірму, якая займаецца ў вёсцы Астроўна селекцыяй садовых і дэкаратыўных раслін. Пераканаліся, што патэнцыял супрацоўніцтва паміж фірмай і мясцовым Домам культуры велізарны. Хаця б у правядзенні арыгінальных садовых святаў. Вось толькі хто зробіць першы крок насустрач?

Дык які ў нас план?

Гаспадарчая група аддзела, як кажа Марына Пясецкая, працуе на разрыў. Тымі днямі, напрыклад, яна займалася рамонтам ацяпляльнай сістэмы ў аграгарадку "**Астроўна**". Калі мы прыехалі туды, работы былі ўжо завершаны.

Марына Анатольеўна, накіроўваючы нас у Астроўна, зазначыла, што тут няблага наладжана супрацоўніцтва клубнікаў з царквой. Пра гэта і пачалі гаворку з дырэктарам мясцовага СДК Валянцінай Ціханавай і мастацкім кіраўніком установы Наталляй Крыловай. Так, сувязі з царквой трывалыя. Ці не кожнае царкоўнае свята мае падтрымку работнікаў культуры. СДК рыхтуе сцэнарыі, тэатральныя сцэнкі, музычныя нумары. Тым больш, маецца ў СДК аж дзевяць клубных фарміраванняў. Словам, выбіраць ёсць і з каго, і з чаго.

Адно з нашых традыцыйных пытанняў звязана з ходам выканання плана па аказанні культурных паслуг насельніцтву. Не абышлося без яго і гэтым разам. Нашы суразмоўцы лічбаў плана не ведалі. Спачатку Валянціна Ціханава сказала, што план яе ўстанова не выканае, бо існуе праблема з напаўняльнасцю глядзельнай залы. Потым падгледзела ў нейкім сшытку, што план на год складае 15 мільёнаў рублёў, а факт на сёння — ці не 11 мільёнаў. Пачалі лічыць разам. Раз у месяц калектывы СДК выступаюць у санаторыі "Бароўка", што на Лепельшчыне. Такія канцэрты прыносяць у клубную скарбонку па паўтара мільёна ў сярэднім. Ды плюс навагоднія мерапрыемствы, якія заўжды і нязменна запатрабаваныя. Атрымліваецца, што план пазабюджэткі будзе нават і перавыкананы.

Тут узнікае вось якое пытанне. Ці павінны работнікі культуры на месцах кантраляваць ход выканання названага плана? Калі рэй у клубе вядзе прафесіянал, для яго ў паўсядзённай працы няма дробязей. Дый ці можна назваць дробяззю "пазабюджэтку", ад велічыні якой залежаць і перспектывы ўстановы, і ўзровень матэрыяльнага стымулявання? Згадайце, як у першым нашым артыкуле гэтага аўтатура лёгка і вольна аперавала фактамі ды лічбамі пазабюджэтнай дзейнасці кіраўнік Лепельскага РДР Алена Барадзейка. А яе ніхто не прымушаў! Проста яна зацікаўлена ў канчатковым выніку. Каб бачыць перспектыву, каб удасканаліць працу, каб захоўваць "падведамасную" галіну цікавай ды карыснай для наведвальнікаў. Вельмі простыя рэчы. І калі імі не жыць, можа лёгка пераблытаць прыдуманае з рэальным.

Агульнае (не)лірычнае заключэнне

Тут, пагадзіцеся, не да лірыкі — пытанняў з'явілася багата. Але, найперш, уразіла нас стракатасць — у адных установах ідэй і прапаноў незлічонае мноства, у іншых нібыта і зусім няма. Адны ў неверагодна складаных, з тэхнічнага боку, умовах распрацоўваюць новыя праекты і выстаўкі, другія кіруюцца прынцыпам "абы ціха". Відавочна тут адно: без дапамогі зверху першыя не змогуць рэалізаваць задуманае, другія не здолеюць прадставіць прывабны і канкурэнтаздольны прадукт.

Фота аўтараў

К

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Фрагмент экспазіцыі ў галерэі "З'ява".

"Круглы стол" у Смаргоні.

рунак бібліятэчнай работы". Сустрэча з настаяцелем Спаса-Праабражэнскага храма, пратаірэем айцом Анатолем набыла фармат "круглага стала".

Сумесная работа нашых бібліятэк у рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве з Беларускай Праваслаўнай Царквой вядзецца планамерна і прыносіць свае вынікі. Так, Гарадская дзіцячая бібліятэка прыняла ўдзел у рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка — цэнтр духоўнага выхавання і асветы" і атрымала падзячнае пісьмо ад Сінадальнага аддзела па рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі.

У рамках рэспубліканскай антытытунёвай інфармацыйна-адукацыйнай акцыі ў чытальнай зале Смаргонскай раённай бібліятэкі адбыўся "круглы стол" "Шкодным звычкам — не!" з дзевяцікласнікамі сярэдняй школы № 1. Была арганізавана прэзентацыя "Выбіраем жыццё без палення", дзе былі наглядна прадстаўлены вынікі бяздумных адносін да свайго жыцця і бясспрэчныя факты, якія сведчаць аб шкодным уздзеянні палення на арганізм. Асобны блок інфармацыі быў прысвечаны дзяўчатам — будучым матулям.

У філіяле гарадской бібліятэкі прайшла гадзіна здароўя, у Сольскай сельскай бібліятэцы — гадзіна-заклік "А можа, проста кінуць паліць?". Адбыліся таксама гутаркі: "Супраць нікацінавага дурману" (Міцкавіцкая СБ), "Дым, што губіць нас" (Жодзішкаўская СБ). Прайшлі інфармацыйныя гадзіны ў Ракавецкай, Сінькоўскай СБ.

Святлана АФАНАСЬЕВА

Барысаўшчына / "З'ява" і яе "...Каларыт"

"З'ява" — галерэя, што месціцца ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Івана Каладзеева, — запрашае на традыцыйную выстаўку, якая ладзіцца ўжо трэці раз.

Да ўвагі гледачоў прапануецца больш за 80 твораў трыццаці пяці аўтараў, якіх аб'ядноўвае "прывязка" да Барысава. Сярод выстаўленых работ — жывапіс, графіка, скульптура, кераміка, габелен.

Праект "Барысаўскі каларыт" аб'ядноўвае намаганні мастакоў, якія працуюць у розных стылістычных і жанравых кірунках. Многія з іх знаходзяць натхненне ў родных краявідах і ствараюць лірычныя, атмасферныя пейзажы (Станіслаў Баяранка, Валеры Гінц, Мікола Цудзік, Барыс Цатураў, Вольга Палякова). Іншыя мастакі імкнуцца да пошукаў уласнага стылю ў пластычных рашэннях: складаныя фактуры на жывапісных палотнах Віктара Бялова і Сяргея Лагачова, вобразы ў творах Ірыны Гінц і Ігара Ясяніцкага, пабудаваныя на рытмічна-каларыстычных увасабленнях. На выстаўцы можна пазнаёміцца і з асаблівасцямі "мовы" матэрыялу ў драўлянай скульптуры Аляксандра Лазеркі, празрыстай акварэлі Ірыны Пестрык і Аксаны Кульваноўскай, габелене Анжэлы Кудаковай.

Цікавай асаблівасцю праекта з'яўляецца тое, што да ўдзелу ў ім падключаныя і маладыя мастакі. Гэта дае ім магчымасць адчуць большую ўпэўненасць у сваіх першых кроках, убачыць той вектар, які стане асноўным у іх творчай дзейнасці. Адначасова з гэтым горад знаёміцца з новымі імёнамі. Сёлета такім адкрыццём сталі імёны Вікторыі Круглік і Вячаслава Наваслаўскага.

На працягу шматгадовай дзейнасці галерэя "З'ява" здолела заявіць пра сябе як пра вельмі прывабную, гасцінную выставачную пляцоўку, што стварае неабходныя ўмовы для экспазіцыі твораў кожнага мастака. Яна ладзіла выстаўкі такіх майстроў, як Валерый Шкаруба, Павел Татарнікаў, Леанід Шчамялёў, Валерый Славук ды іншыя. Колькасць удзельнікаў выстаўкі "Барысаўскі каларыт" расце з кожным годам, і гэта яскрава дэманструе жаданне ўсіх творцаў Барысаўшчыны далучыцца да гэтага праекта. Супрацоўнікі галерэі змаглі скампанаваць складаную, стракатую "тканіну" з твораў мастакоў у цэльную экспазіцыю, знайшоўшы своеасаблівы барысаўскі каларыт.

Наталля ЦАРЫК, кандыдат мастацтвазнаўства

Государственное учреждение культуры "Централизованная клубная система Белыничского района" и творческие коллективы г.п. Белыничи выражают скорбь по поводу смерти нашего знаменитого земляка СЛИЗКОГО Михаила Ивановича, белорусского самодеятельного музыканта и композитора, создателя музея гармоней. Искренне соболезнуем родным и близким.

Асяродак мастака: як не прамінуць пасланне

Кніжніца пашырылася галерэяй барысаўскага міфатворцы

На мінулым тыдні ў Барысаве з'явіўся яшчэ адзін культурны асяродак — Карцінная галерэя Валерыя Шкарубы ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Івана Каладзеева. Збор імянной галерэі слыннага майстра краявіду складаюць некалькі дзясяткаў карцін, якія мастак, ураджэнец Барысаўшчыны, падарыў сваёй малой радзіме. Як і абяцаў, дарэчы, у рамках "Экспрэс-тура з V.I.P.-земляком" на старонках "К" сёлета.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ,
Мінск — Барысаў — Мінск

Па словах дырэктара бібліятэкі Галіны Слесарэнка, да гэтай падзеі і сам мастак, і горад прайшлі шлях, пачаткам якога трэба лічыць 1992 год, калі ў бібліятэцы, дзе зараз прапісалася новая галерэя, была створана Зала мастацтваў. Гэта не адзіны ў нашай краіне прыклад сімбіёзу бібліятэчнай справы і выставачнай дзейнасці, не адзіны выпадак, калі менавіта бібліятэкары рупяцца пра выяўленчае ды іншае мастацтва. Прынамсі, у Мінску цікавыя, вартыя гледацкай увагі выстаўкі ладзяцца ў галерыі "Vilnius" пры бібліятэцы № 18 і ў экспазіцыйных залах Мінскай абласной бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна. Але тое ў сталіцы, дзе імпрэзы такога кшталту — даважак да буйных відовішчаў, што адбываюцца ў Палацы мастацтва і ў музеях. І зусім іншая справа раённы цэнтр, дзе Зала мастацтваў пры ЦРБ ад самага пачатку фактычна выконвала функцыі гарадской карціннай галерэі. Бо хоць Барысаў — дзявяты па колькасці насельніцтва горад краіны, а па тэрыторыі дзеліць аддзінаццае месца са Слонімам, экспанаваць арт-праявы тут не было дзе. А вось у Зале мастацтваў выстаўляліся мясцовыя і сталічныя творцы, ладзіліся экспазіцыі творчага даробку з гарадоў, з якімі Барысаў падтрымлівае пабрацімскія сувязі. Прычым, зала сталася не толькі экспазіцыйнай прасторай: тут адбываліся імпрэзы рознай тэматыкі, творчыя сустрэчы, тут фарміравалася мастацкая калекцыя, у якой, дарэчы, прадстаўлены і творы Шкарубы. Не дзіва, што ў 2002 годзе зала атрымала статус галерэі. А назвалі яе "З'ява". (*Пра апошнюю па часе выстаўку ў ёй чытайце на старонках 10 — 11.* — **Рэд.**) Цяпер жа ў будынку ЦРБ утворана і персанальная галерэя слыннага мастака, чые дасягненні выклікаюць у барысаўчан законную гордасць. Ну а сам факт заснавання падобнай надае бібліятэцы прывабнасці ў вачах мясцовых жыхароў і гасцей горада, павялічвае яе патэнцыял як культурнага асяродка і асветніцкага цэнтру.

У Карцінай галерэі Валерыя Шкарубы ў дзень адкрыцця. / Фота аўтара

Тое, што адкрыццё ў раённым цэнтры галерэі мастака, уганараванага званнем заслужанага дзеяча мастацтваў і Дзяржаўнай прэміяй, — падзея маштабная, засведчыў удзел ва ўрачыстай імпрэзе міністра культуры Барыса Святлова, міністра інфармацыі Ліліі Ананіч, прадстаўнікоў абласной выканаўчай улады, творчых саюзаў, буйных устаноў культуры, вядомых мастакоў. Не кожная выстаўка ў прэстыжных залах сталіцы збірае такую грамаду. Усе, хто браў на імпрэзе слова, адзначалі высакароднасць мастака, які зрабіў гораду такі цудоўны падарунак, і выказвалі спадзяванні, што ў Валерыя Шкарубы будуць паслядоўнікі, што прасякнуцца ідэяй культурнага аздаблення родных мясцін.

Спонсарам культурнага праекта стала РУП "Беларусьнафта-Мінскаблнафтапрадукт". На грошы гэтай установы была прыведзена ў належны выгляд зала, дзе размясцілася галерэя, набыта адпаведнае абсталяванне. А вось функцыянаванне галерэі будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. У дадзеным выпадку мы маем прыклад паразумення дзеля вартай справы, падтрымкі ўладнымі структурамі, установай культуры і мецэнатамі ініцыятывы творцы.

Утварэнне персанальнай галерэі Валерыя Шкарубы дазволіць глыбей асэнсаваць феномен творчасці мастака. Пейзажны жанр глыбока ўкаранёны ў гісторыю культуры, мае не адно стагоддзе развіцця. Сказаць у ім новае слова даволі цяжка і, мяркую, амаль немагчыма. Ад самога спадара Валерыя я чуў меркаванне, што ўвесь сучасны расійскі пейзажны жывапіс нагадвае Левітана, а амерыканскі — Эндру Уаета. Да гэтага можна дадаць, што армянскія мастакі-пейзажысты знаходзяцца пад уплывам Сар'яна, а для беларусаў у гэтым сэнсе кана-

Штампы — не штампы, але…

Ці можа бібліятэка "раскруціць" кнігу і ліквідаваць прорву ад яе да чытача?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Вы сцвярджаеце, што беларускія даследчыкі не спяшаюцца тлумачыць працэсы, якія адбываліся з айчыннай літаратурай апошняга дзесяцігоддзя XX стагоддзя. А як выправіць сітуацыю?

— У мяне ёсць любімы анекдот на гэтую тэму… Пустыня. Два грыфы дзяўбуць старую высахлую костку. Побач маладое ягня. Грыфы на яго нуль увагі. Ягня не вытрымлівае, падыходзіць да птушак і пытае: "Паслухайце, грыфы! Навошта вы дзяўбяце гэтую старую высахлую костку, калі побач гуляю я — малады, упітаны, мясісты?" Грыфы адказваюць: "Малады чалавек, хіба вы не разумееце? Гэта ж класіка!!!"

З аднаго боку, усе разумеюць, што прасцей і больш карысна для кар'еры пісаць пра спачылых аўтараў: ніхто не адправіць скаргу табе на працу, не аспрэчыць думку ў сацыяльных сетках, не зазначыць у адказ на тваю крытычную заўвагу, што ты яму зайздросціш… Класік — надзейны як фунт сцерлінгаў, а з сучаснікам — адны праблемы! З іншага боку, я разумею і тых, хто не піша пра сучаснасць, матывуючы гэта тым, што літаратура "павінна адляжацца". Маўляў, няхай рассудзіць вечнасць, хто ў ёй застанецца. Аднак колькі ўжо пісьменнікаў сышлі, так і не дачакаўшыся ацэнкі літаратуразнаўцаў! А колькі выкладчыкаў, студэнтаў сядзяць без матэрыялаў па праблемах сучаснай літаратуры! Я часта бываю ў мінскіх і абласных універсітэтах. І ведаю ад выкладчыкаў, якія чытаюць лекцыі па сучаснай беларускай літаратуры, што такое сядзець без матэрыялаў у спадзяванні на ўяўную вечнасць!

Кожны раз, калі мы сустракаемся з калегамі, гаворым пра тое, як цяжка, некамфортна займацца сённяшнім часам. Што трымае ў прафесіі? Па-першае, разуменне таго, што ўсё добра рабіць у час, пакуль можна ўзнавіць атмасферу, падзеі, дакументы, лёсы. Бо чым далей ад падзей, тым больш гісторыя ператвараецца ў міфы, якія ніякія архівы не аспрэчаць. Па-другое, трымае ўсведамленне: у будучым нам не будзе сорамна за сёння. Няхай будзе сорамна тым, хто выбраў для сябе зону камфорту замест перадавой... Я ганарыся тым, што паспела напісаць пра ролю Анатоля Сыса да яго смерці. І што ён паспеў гэта прачытаць. Такія рэчы важныя.

— А сучасныя пісьменнікі чытаюць вас ці вашых калег?

— "Культурны градыент" некаторыя пісьменнікі не толькі чыталі, але і дапамагалі пісаць — давалі матэрыялы. Бо ўся кніга пабудаваная на матэрыялах, якія не знаходзяцца ў шырокім доступе. Нешта ёсць у архіве, як, напрыклад, дакументы Саюза пісьменнікаў. Але шмат якія рэчы ніколі не публікаваліся, шмат якія тэксты друкаваліся ў выданнях, што не ў кожнай бібліятэцы ёсць. Канешне, можна згадаць і іншае. Напрыклад, калі пісьменнікі, асабліва старэйшага веку, крыўдзіліся за тое, што іх імёнаў няма ў маіх працах. Ім здавалася, што гэта несправядліва. Ці нехта лічыў, што я няправільна разумею яго ролю ў стварэнні і дзейнасці той ці іншай літаратурнай суполкі… Разумееце, мінае час, нехта сыходзіць з літаратуры, нехта памірае, і людзі пачынаюць цягнуць коўдру на сябе, расказваючы пра сваю гістарычную ролю ў беларускай літаратуры... Таму я ўдзячная архівам і архівістам, бо іншым разам толькі наяўнасць дакумента можа пацвердзіць мае высновы. Дарэчы, праца з архівамі, якія датычаць параўнальна недалёкага часу, — цікавы занятак. Яна ператварае літаратуразнаўцу ў філосафа, але гэта асобная тэма для гутаркі.

— Упэўнены, частка чытачоў спытае: а што такое градыент? Чаму назва "закавырыстая" ?

Ганна Кісліцына.

— Напэўна, цяжка ў тое паверыць, але пятнаццаць гадоў таму, калі я пісала сваю кнігу "Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы", мала хто з навукоўцаў уяўляў, а што ж такое "культурная парадыгма". Не было абсалютна ніякіх тлумачэнняў, акрамя невялікага артыкула Юрыя Лотмана… Тады мне было вельмі цікава: "А ці працуе яго схема ў адносінах да нашай нацыянальнай літаратуры?" Калі стала займацца гэтай праблемай, высветліла: гіпотэза пра характар парадыгмальных змен у культуры не проста актуальная для апісання беларускай гісторыі, але і тлумачыць тое, што адбываецца з намі і нашай культурай на цяперашні момант. З той пары здарылася неверагоднае: словазлучэнне "культурная парадыгма" ў навуковым свеце стала агульнаўжывальным! Думаю, нешта такое чакае і культурны градыент — словазлучэнне, якім абазначаюць напрамак развіцця тых ці іншых з'яў культуры. Але слова "градыент" мае яшчэ большыя шанцы прывіцца, бо яно добра знаёмае і матэматыкам, і дызайнерам, і манікюршам — усім, хто мае справу са з'явамі пераходнасці ад адной якасці да другой.

Наогул, работа пісалася доўга і ахоплівае амаль трыццаць гадоў гісторыі беларускай літаратуры. Яна складаецца з іншых маіх кніг. Жыццё рухалася, у гісторыі пісьменства з'яўляліся новыя старонкі, змяняліся мае погляды і ўяўленні, адкрываліся архіўныя дакументы. Усе гэтыя змены трэба было адлюстраваць, каб з'явілася цэласная канцэптуальная праца пра тое, якімі былі апошнія тры дзясяткі гадоў не толькі для беларускай літаратуры, але і для нашай культуры, гісторыі. Само жаданне распавесці пра змены ў айчынным пісьменстве ўзнікла таму, што я часта сутыкаюся з тым, што наш чытач у сваёй большасці не разумее, што адбылося з літаратурай. Ён параўноўвае яе з літаратурай мінулага і паціскае плячыма: дзе сюжэт, дзе станоўчы герой, дзе звязаны тэкст? Для таго, каб нешта любіць, важна разумець сутнасць з'явы. Некалі нам добра распавялі, за што мы павінны любіць класіку… А вось за што нам любіць наш беларускі авангард, як яго разумець, што нам жадаюць данесці сучасныя аўтары? Гэтаму ніхто не вучыць! Калі казаць наогул, мая кніга пра тое, чаму беларусы не любяць і не разумеюць пісьменнікаў, з якімі жывуць у адным часе, чаму губляецца цікавасць да сучаснай кнігі, што "не так" з сучаснасцю.

— Ці можна будзе знайсці вашу кнігу ў айчынных бібліятэках? Як мяркуеце, ці дапамагаюць яны ў прасоўванні навуковай літаратуры?

— Натуральна, як і ўсе кнігі, выдадзеныя на тэрыторыі Беларусі, "Культурны градыент…" трапіў у найбуйнейшыя бібліятэкі краіны па рассылцы. Аднак бібліятэкі рэдка прасоўваюць навуковыя кнігі, бо чытач у іх спецыфічны. Таму ў гэтым пытанні я больш давяраю кнігарням і інтэрнэт-крамам, што задавальняюць патрэбу ў беларускай кнізе ў рэспубліцы і па-за яе межамі. З іншага боку, я часта кажу пра тое, што ў сённяшнім свеце роля бібліятэк змянілася, і гэта трэба ўлічваць. Сёння бібліятэкар — не ахоўнік на кнігасховішчы. Гэта, у першую чаргу, культурны, адукаваны чалавек, які павінен бачыць сваю місію ў папулярызацыі слова. І таму пераканана: пры ацэнцы працы бібліятэк важна ўлічваць не колькасць выдадзеных на рукі кніг, а высілкі па правядзенні цікавых мерапрыемстваў. Патрэбную кнігу можна спампаваць і ў Інтэрнэце, а вось цікавую сустрэчу, добрую гутарку, гасціннасць мала што заменіць. Бібліятэка павінна быць не столькі сховішчам кніг, колькі захавальніцай культуры.

Пытанні задаваў Дзяніс МАРЦІНОВІЧ

нічная постаць — Бялыніцкі-Біруля. Наяўнасць трывалай эстэтычнай базы, дасканала распрацаванага канону ў мастацтве рэч неабходная. Без гэтага няма традыцыі, а без традыцыі — развіцця. Зрэшты, можна зрабіць творчую кар'еру, не выходзячы за межы гэтага канону. І ўсё ж больш шануюць тых, хто, не адвяргаючы папярэднікаў, здольны сказаць новае. Да апошніх належыць і Валерый Шкаруба. Не памылюся, калі скажу, што, дзякуючы яму, шмат хто ўбачыў беларускую прыроду ў нязвыклым святле, знайшоў прыгажосць там, дзе раней не заўважаў. Я асабіста не належу да фанатаў гэтага мастака: ягоная стылістыка не надта пасуе майму густу (прытым, што пра густы не спрачаюцца). Гэта калі казаць пра адно палатно. Але дзіўная рэч: калі карцін Валерыя Шкарубы шмат, я не магу адарваць ад іх вачэй. Калі яны запаўняюць выставачную прастору, я не мінаю ўвагаю ніводную, нібыта баюся прамінуць нейкае важнае пасланне. Больш за тое, магу глядзець ужо пабачанае па другім і трэцім крузе. Не надакучвае. Гэта патыхае містыкай, але абразкі някідкай беларускай прыроды у версіі Валерыя Шкарубы, калі яны ствараюць крытычную масу, я ўспрымаю як іншапланетныя краявіды. І чамусьці згадваю ці братоў Стругацкіх, ці Рэя Брэдберы. У маім разуменні мастак знайшоў Космас на Зямлі. І адчуў я гэта ў барысаўскай галерэі мастака.

Гэтыя развагі суб'ектыўнага зместу патрэбны для таго, каб звярнуць увагу на відавочнае: горад Барысаў зараз мае мастацкую калекцыю, якая мусіць стаць мясцовым брэндам. А чаму б і не з містычным ухілам? Віцебск мае шагалаўскі міф, чаму Барысаву не мець міфа Шкарубавага? Праўда, каб тое здарылася, трэба добра папрацавць…

К

! Чакаем вашых тэлефанаванняў з цікавымі навінамі па нумары **+375 17 334-57-23**

Сымон з музея: інтэрактыў у Інстаграме

Цягам 90 гадоў паэма "Сымон-музыка" натхняе маладыя таленты на творчыя пачынанні. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ў дзень народзінаў сваёй установы — 4 снежня — завершыць шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных слыннай даце, правядзеннем Міжнароднага дня чытання твора-юбіляра.

Настасся ПАНКРАТАВА

Ілюстрацыі Міколы Селешчука і Барыса Заборава.

Людзі сталі відавочна менш чытаць — такі сумны вынік тэхналагічнага прагрэсу. Асабліва моцна тая тэндэнцыя назіраецца сярод моладзі. Сталічныя музейшчыкі спадзяюцца, што з дапамогай сацыякультурнай акцыі змогуць паўплываць на сітуацыю і прыцягнуць увагу да паэзіі нацыянальнага класіка.

— Балазе сваю паэму Якуб Колас пачынаў прысвячэннем беларускай моладзі. Вельмі сімвалічна, што яе юбілей супаў з Годам моладзі, што сёлета ладзіцца ў рэспубліцы, — зазначыла дырэктар музея Зінаіда Камароўская. — Менавіта для новага пакалення мы шукаем арыгінальныя формы правядзення мерапрыемстваў. У межах азначанай акцыі прапануем усім ахвотным спампаваць на сайце музея паштоўкі з урыўкамі з паэмы (на беларускай мове альбо ў перакладах) з ілюстрацыямі Барыса Заборава і Мікалая Селешчука. На жаль, у нашых фондах няма арыгінальных палотнаў і аркушаў гэтых знакамітых мастакоў, але нам хацелася б, каб людзі пазнаёміліся з іх шыкоўнымі работамі. А можа, для каго з настаўнікаў ці выкладчыкаў падрыхтаваныя намі паштоўкі стануць падставай для правядзення адмысловай экспазіцыі ў навучальных мэтах?.. 4 снежня абраныя ўрыўкі неабходна прачытаць, а пасля даслаць сэлфі на нашу старонку ў Instagram ці відэасправаздачу на электронную скрыню.

Свой удзел у акцыі ўжо падцвердзілі Таварыства беларускай культуры "Спадчына" і Літаратурны музей Аляксандра Пушкіна з Друскінінкая, беларускамоўная гімназія Вільнюса, літаратурна-мемарыяльны музей-кватэра Аляксандра Блока з Санкт-Пецярбургу, цэнтральная бібліятэка Валгаграда. (Дарэчы, аб'яднанне беларусаў на Валгаградчыне складае каля 8 тысяч чалавек!) І па словах Зінаіды Мікалаеўны, яны вельмі актыўна прыхвоціліся да творчасці Якуба Коласа. Адасланы запрашэнні і ў пасольствы нашай рэспублікі ў тых краінах, на мовы якіх перакладзены "Сымон-музыка". Будзем спадзявацца, і самі беларусы возьмуць удзел у акцыі па сваім жаданні. Для пачатку, каб паўдзельнічаць у форме музейнага інтэрактыва, а там жа і Коласавым словам сапраўды захопяцца.

— Увесь час, і на штогадовых "Каласавінах" у прыватнасці, мы ўзнімаем пытанне аб перакладзе спадчыны песняра на замежныя мовы, — дадала дырэктар установы. — За апошнія гады іншамоўныя варыянты узнікалі не так часта. Асабліва шкада, што "Сымон-музыка" перакладзены толькі на шэсць моў ды і тое — урыўкамі (у адрозненне ад "Новай зямлі", якую ў цэласным выглядзе могуць прачытаць у многіх краінах свету). Таму мэта нашай акцыі яшчэ і ў тым, каб зацікавіць іншаземцаў творам з залатога фонду беларускай літаратуры і, магчыма, заахвоціць іх стварыць паўнавартасныя пераствараннi.

Акрамя таго, што знакамітыя радкі будуць чытаць у нас і ў замежжы, у сцянах дома пісьменніка таксама збяруцца прыхільнікі слова Коласа, прадстаўнікі пасольстваў тых краін, на мовы якіх перакладзена паэма. Зінаіда Мікалаеўна спадзяецца, што госці змогуць пабачыць фрагменты са спектакляў айчынных тэатраў паводле паэмы. На святкаванні прагучаць і песні, створаныя на аснове ўрыўкаў з твора. Напрыклад, ансамбль "Святлана" са Стаўбцоўшчыны прэзентуе нумары на музыку Тамары Барыхавай, "Менскі гармонік" выканае мелодыі Івана Раманчука, з Рэчыцы павінны прыехаць рок-гурт "Дыялектыка душы" са сваім варыянтам інтэрпрэтацыі паэмы.

Паралельна з гэтымі ўгодкамі літаратурна-мемарыяльны музей пачаў рыхтавацца да 110-годдзя з пачатку творчай дзейнасці Якуба Коласа. Сёння амаль распрацавана чытанка для дзяцей па творах класіка. Аднак у працэсе стварэння ўзнікла нечаканая праблема: калі супрацоўнікі паспрабавалі прачытаць пілотны варыянт сваім дзецям, высветлілася, што малечы не зусім разумеюць беларускую мову. Магчыма, праблема яшчэ ў тым, што для новага пакалення незнаёмыя некаторыя рэчы з ужытку мінулага стагоддзя, прадметы і з'явы таго часу. Таму ўзнікла патрэба дадаць да асноўнага тэксту невялічкі слоўнічак. Мяркуецца, што да наступнага верасня выданне пабачыць свет.

К

Раманс для дзяцей з зоркамі

Калі ўнёсак — не толькі ў мастацтва: "рэабілітацыйны цэнтр" у Горкаўскім тэатры

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага стаў чацвёртай вяршыняй, якую зараз паспяхова адольваюць дзеці. Незвычайныя: з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і тыя, якія мелі канфлікты з законам, але не дасягнулі на той час узросту крымінальнай адказнасці. 21 снежня на вялікай сцэне тэатра адбудзецца не проста прэм'ера пад назвай "Раманс для Мухі з зоркамі".

Аліна САЎЧАНКА / Фота аўтара

Артысты Павел Еўтушэнкаў, Аляксандр Ждановіч і Аляксандр Вергуноў разам з дзецьмі.

Чатыры гады таму дабрачыннае аб'яднанне "Свет без межаў" у рамках праекта "Нармалізацыя, інтэграцыя, раўнапраўе" распачало акцыю "Вялікае мастацтва рукамі маленькіх людзей". Сутнасць яе ў тым, каб даць магчымасць выхаванцам як з дамоў-інтэрнатаў для інвалідаў, так і са спецыяльных закрытых вучэбна-лячэбных устаноў паспрабаваць сябе ў тым, што іх паўсядзённасць не прадугледжвае, — у творчасці. Галоўнай задачай праекта з'яўляецца зварот да магчымасцей такіх людзей, раскрыццё іх здольнасцей. Бо, як паказала практыка, яны маюць не меншы патэнцыял, чым усе астатнія, а пра-

■ Арт-тэрапія адбіваецца на фізічным і маральным стане людзей (хтосьці сацыялізуецца, іншы — знаходзіць хобі), на якіх яшчэ з дзясятак гадоў таму **ставілі крыж** як на невылечных або безнадзейных.

сторы для яго раскрыцця ў іх часцей за ўсё няма. Важным момантам з'яўляецца тое, што арт-тэрапія станоўча адбіваецца на фізічным і маральным стане гэтых людзей (хтосьці пачынае размаўляць, іншы сацыялізуецца або знаходзіць хобі), на якіх яшчэ з дзясятак гадоў таму без разбору ставілі крыж як на невылечных або безнадзейных.

Для атрымання максімальнага выніку ад майстар-класаў супрацоўніцтва вядзецца толькі з прафесіяналамі, забаронены паслабленні з боку кіраўнікоў у адносінах да вучняў (мастацтва патрабуе адданасці і сур'ёзнага стаўлення), а кожны этап павінен завяршацца ўрачыстай справаздачай з дэманстрацыяй даробку (выстаўка, канцэрт або спектакль), на якой прысутнічаюць гледачы. Менеджары праекту прапанавалі дзецям пачаць з жывапісу. Цягам года запрошаны куратар першага этапу мастак Леанід Гоманаў ладзіў серыю майстар-класаў для схільных да малявання хлопчыкаў і дзяўчынак з усёй краіны. У выніку атрымалася цудоўная выстаўка, якую прынялі сцены Мірскага замка. Наступным годам пад крылом Настассі Ціхановіч і яе памочнікаў — Івана Буслая, Мікіты Фаміных, Аляксандра Патліса, Жанэт, Вольгі Плотнікавай — быў праведзены песенны этап, які стаў ужо больш складанай задачай для маладых артыстаў. У трэці раз было вырашана пазнаёміць дзяцей з фотасправай, чым і заняўся куратар праекта Аляксандр Канатоп.

Сёлета задача перад "маленькімі людзьмі" стаяла ўдвая цяжэйшая, бо тэатр — адзін з самых спецыфічных відаў мастацтва. Прымае ён працаздольных і сапраўды таленавітых. І менавіта Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага стаў адзінай пляцоўкай у краіне, што не пабаялася і, больш за тое, з вялікім энтузіязмам узялася за справу, якую палічыла абавязковай для сябе. Узначалілі працэс артысты Аляксандр Вергуноў, Аляксандр Ждановіч, Сяргей Юрэвіч, Павел Еўтушэнка, Настасся Шпакоўская. Яны мадыфікавалі гісторыю пра Муху-Цакатуху, дапоўнілі яе іншымі сюжэтамі і спасылкамі, насыцілі музычную частку пастаноўкі так, каб дзеці мелі магчымасць пазнаёміцца з джазам, рэгі, рокам. Рэпетыцыі пачаліся яшчэ ўвесну, апошні ж майстар-клас, які доўжыўся тры дні, быў праведзены ў лістападзе. Дарэчы, менавіта на тэатральным этапе менеджары праекта вырашылі аб'яднаць дзве групы дзяцей: з абмежаванымі магчымасцямі і з праблемамі з законам, бо раней яны працавалі аўтаномна. Эксперымент рызыкоўны. Вялікая адказнасць клалася ў тым ліку і на горкаўцаў, але склаўся гарманічны калектыў, тэатральная трупа, дзе кожны знайшоў сваё месца і ролю. Ну і афішы да спектакля ўжо гатовыя: іх таксама рабілі дзеці пад прыглядам дызайнерскай каманды тэатра.

К

Будзем на сувязі!

Нам цікавае Ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

Як з Гётэ сустрэліся (б) Караткевіч з Кашкурэвічам

У 1970-я на адной з прыступак Парнаса сустрэліся беларусы — мастак Арлен Кашкурэвіч і пісьменнік Уладзімір Караткевіч. А натхняльнікам гэтай сустрэчы стаў… нямецкі паэт Ёган Вольфганг Гётэ, трагедыю якога "Фаўст" пераклаў на беларускую мову Васіль Сёмуха. Для першага выдання перакладу мастак рабіў ілюстрацыі, а пісьменнік каментаваў іх, завітаўшы да сябра на Парнас. Такім Парнасам стала майстэрня Кашкурэвіча, дзе і адбылася (а чаму б, у рэшце рэшт, і не?) сустрэча беларусаў з вялікім алімпійцам. Прынамсі, так пра тое спатканне мне распавёў Арлен Міхайлавіч, а сёе-тое для стварэння палілогу дадала аўтар гэтых радкоў.

(Адразу зраблю адступленне. Памятаеце, "сам Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі і Гогаль шпарка каля нас прайшлі, як павы, на Парнас". Здаўна добра вядомы пералік алімпійцаў рускай класічнай літаратуры. Так, яны ўзышлі не толькі на сусветны Алімп, але і на беларускі Парнас: і Пушкін, і Лермантаў, і Жукоўскі, і Гогаль прысутнічаюць у прасторы беларускай культуры, а значыць, маюць сваё месца на нашай вяршыні. Але з тых часоў народу на Парнасе значна пабольшала. Таму што з тых самых часоў Парнас стаў і вяршыняй нацыянальнай культуры. Колькі ж цудоўных сустрэч адбываецца на ім, якія нячутныя нам размовы вядуцца на яго прыступках…)

Дык вось, дзесьці ў 1970-х мастак прачыніў дзверы, і Уладзімір Караткевіч увайшоў у майстэрню. Спінай да вялікага — на ўсю сцяну — акна сядзеў той, каго не пазнаць было немагчыма. Той, дзякуючы каму адбудзецца і сённяшняя сустрэча. Высокі, хударлявы, і гэта не хавалася за ганарлівай паставай таго, хто сядзеў у крэсле. Выразна бачыліся агульныя абрысы твару, пранізлівыя вочы, арліны нос, высока ўскінутая галава…

"Гётэ", — выдыхнуў напаўшэптам **пісьменнік**.

Гётэ: — "*Пара! Гатова сцэна, дзякуй богу, — збіраюцца на свята гледачы…*"

Арлен Кашкурэвіч: — Разам з жонкай мы чыталі Вашага "Фаўста" ў арыгінале. Параўноўвалі пераклады асобных урыўкаў трагедыі… І гэта мэтазгодна, бо пераклад — творчая праца…

Гётэ: — Шаноўныя спадары, і да вас звернутыя словы, адрасаваныя маім сябрам. Бо хто можа быць лепшым сябрам, чым удзячныя нашчадкі… "*Сустрэча з вамі абуджае штосьці з былых надзей, з парываў маладосці… І зноў душа мая нястрымна рвецца, у край маўклівых вобразаў імкне…*"

На гэтыя словы паэта адказаў **Арлен Кашкурэвіч**:

— Так, я мастак. Я ілюструю творы, што сугучныя маім уласным памкненням. Ідэі, закладзеныя ў літаратурным творы, атрымліваюць у маіх працах развіццё, прычым могуць развівацца так далёка, што становяцца зусім самастойнымі. Але заўсёды літаратурны твор з'яўляецца крыніцаю натхнення. Найчасцей цікавасць да ілюстравання вызначаецца маштабнасцю твора, значнасцю пастаўленых праблем. "Фаўст" Гётэ — актуальны для ўсіх часоў. Сучаснаму мастаку варта адчуць у ім тое, што асабліва сугучна нашым дням.

Уладзімір Караткевіч, пачуўшы кароткую размову, адчуў сябе больш вольна і далучыўся да суразмоўцаў:

— І таму да веку настойліва будуць звяртацца да Вашага твора мастакі. Бо гэта адна з самых лепшых магчымасцей выказаць сябе, сваю думку, светапогляд, свой шлях да выйсця… Мастакі сапраўдныя становяцца на адзіна верны шлях: пошукі "Фаўста" сваёй эпохі, "Фаўста", які адказвае на трывожныя пытанні, што стаяць перад сучаснікам, чалавекам сваёй грамады. Такі шлях абраў і ты, мой сябар…

Пра што творцы розных часоў маглі пагутарыць на Парнасе

Кашкурэвіч: — У сваіх старых нататках, якія рабіў падчас работы над "Фаўстам", запісаў: "Больш важна увасобіць дух твора, чым эфектныя сюжэтныя сітуацыі".

Гётэ відавочна ўсё больш цікавіла гутарка людзей, для якіх ён не здань, не класік, што адышоў у тое мінулае. Зноў яму прыгадаліся першыя радкі "Фаўста": "*Вы зноў са мною, дарагія здані, зноў вабіце ў мінулае мой зрок…*" Толькі ў гэтым дзіўным пакоі з рэчамі, якіх ён ніколі пры сваім жыцці не бачыў, Гётэ адчуў, што не, не ў мінулае цяпер скіраваны яго погляд… Гэта ён вачыма свайго стогадовага Фаўста бачыць будучыню. І не тую, якую ўбачыў яго герой, але нейкую іншую, там, дзе не толькі Фаўст, але найперш ён сам, вялікі алімпіец, запатрабаваны і пакліканы на размову… І ён звярнуўся да прысутных:

— Мой герой прагне спасцігнуць крыніцы жыцця і найвышэйшыя парыванні духа, "*ён патрабуе з неба лепшых зорак і асалод найлепшых на Зямлі*". Дух Зямлі адмаўляе яму ў адказе на гэтыя пытанні: усё трэба спасцігаць самому. Але ж калі жыццё, так актыўна-напружана і ў такіх захапляльных думках-разважаннях пражытае, у выніку так і не дало адказу, магчыма, гэта зробіць смерць. "*Для мяне ўпэўненасць у вечным жыцці выцякае з паняцця дзейнасці. Паколькі я дзейнічаю няспынна да самага свайго канца, прырода абавязана прадставіць мне іншую форму існавання, калі цяпершней больш не ўтрымаць майго духу*", — так, здаецца, я сказаў у прысутнасці свайго сакратара Экермана, і, калі не памылюся, ён пазней выдаў кнігу пра размовы са мной…

Мастак узяў у рукі першую ілюстрацыю да твора:

— У першай сцэне Фаўст замкнуўся, зачыніўся ў сваім кабінеце сярод кніг, чэрвельмі слабыя. "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" можа і заняў бы нейкую нішу, але быў пакрэмзаны перастраховачнай цэнзурай і пакладзены на доўгі час на паліцу. Караткевіч скардзіўся, што яго нават на здымачную пляцоўку не дапускалі, ігнаравалі ўсе заўвагі. Маўляў, не катурхайся асабліва. Не падабаецца такі варыянт, дык увогуле ўсё перапынім, адхілім далейшыя прапановы, створым невыносныя ўмовы — такія, што і сам усё кінеш.

Адносна асобы самога Караткевіча, ягонай творчасці, творчых асаблівасцей, творчай манеры і характару, дык, здаецца, дастойных дакументальных фільмаў таксама амаль няма. А тое, што ёсць… Па-першае, дзякаваць богу, што хоць такое захавалася, а, па-другое, сцэнарыі пісаліся надта ж ужо нейкія спрошчаныя. Ці ўстаноўка была такая, ці своеасаблівая традыцыя панавала. Яна і не давала магчымасці думаць па-іншаму.

— Распавядзіце, калі ласка, пра вашы сустрэчы з пісьменнікам.

— Першы раз сустрэча адбылася адразу пасля выхаду сувенірнага выдання "Чорнага замка Альшанскага". Мы з таварышам як актыўныя прыхільнікі творчасці пісьменніка вельмі ўзрушана ўспрынялі падзею. Кампа-

"А-а-а, гэта ты, паляшук!"

20 лістапада Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры зладзіў прэзентацыю кнігі доктара філалагічных навук Аляксея НЕНАДАЎЦА "Уладзімір Караткевіч: прырода, фальклор і творца". У манаграфіі, выдадзенай у кастрычніку «Беларускай навукай», даследуецца ўплыў прыроды, міфалогіі, фальклору на станаўленне творчай асобы пісьменніка. Менавіта ён рамантызаваў нацыянальную гісторыю, яе герояў і зрабіў іх шырока вядомымі. Аляксей Ненадавец, вядомы як даследчык магіі і язычніцкай рэлігіі беларусаў, распавёў "К", якім яму бачыцца свет, прыдуманы Караткевічам.

Яўген РАГІН

Аляксей Ненадавец.

— З чаго пачалося знаёмства з творчасцю пісьменніка?

— Мо спачатку была даніна модзе? Памятаеце той час, калі ўсе чыталі Караткевіча нагбом? Але, хутчэй за ўсё, тлумачыцца захапленне цікаўнасцю да нашай далёкай мінуўшчыны. У ранейшых літаратурных творах усё былое паказвалася неяк непраўдападобна, таму ў напісанае проста не верылася. А тут — свежыя погляды, трактоўка, сама падача матэрыялу. Вельмі падкупляла і веданне Караткевічам літаратуры, мовы, мастацтва, культуры, вуснай паэтычнай творчасці.

— Іншамоўныя чытачы з саюзных рэспублік на пачатку 1980-х ганяліся за часопісам "Нёман" з перакладамі Караткевіча. З чым гэта было звязана?

— Я тады ў войску служыў, і мы таксама імкнуліся набыць праўдамі і няпраўдамі "Чорны замак Альшанскі". Напрыклад, мне яго дасылала ў далёкі Самарканд з Мінска мая будучая жонка. Дзякуй ёй вялікі за гэта. Стараўся і там быць у курсе літаратурных падзей, бо забралі мяне ў Савецкую Армію з аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук. Усё тут проста, як падаецца. Ніякіх міфаў! Беларусы нарэшце атрымалі магчымасць і ў літаратуры адчуць сябе беларусамі. Убачылі ўрэшце сваю гісторыю, культуру, фальклор. І аказалася, што ўсё гэта — неймавернае багацце. Яго можна было смела несці да любых чытачоў, прапаноўваць шырокай аўдыторыі. І аўтарскі погляд быў надзвычай нетрадыцыйным, адметным, спакойным, а ў нечым — вельмі рашучым, нават бескампрамісным. Беларус у Караткевіча ў любой сітуацыі не губляў гонару. Купала пра гэта калісьці на ўвесь голас крычаў: "Я мужык, а гонар маю!". Сам жа не быў селянінам (мужыком), а паходзіў са шляхты, няхай сабе і збяднелай (паводле Караткевіча — "солі зямлі беларускай"), але выдатна разумеў, на чыіх плячах трымаецца "ўвесь свет белы" і ад імя каго трэба выступаць, "несці крыўду". Праўда, нашы тагачасныя песняры (Купала, Колас, Багдановіч) мала пісалі пра айчынную гісторыю, згадвалі, у асноўным, міфы, (міфічныя архетыпы: сон, долю, зло, музыку, дабро, шчасце, барацьбу дабра і зла і іншыя). Не дзіўна, што Уладзімір Караткевіч працягнуў і значна пашырыў іх традыцыі.

— Каля няма міфу, варта яго прыдумаць?

— Не! Ён не быў міфатворцам. Прынамсі, вельмі не любіў такога азначэння. Хацеў, каб называлі рэалістам. Нават крыўдзіўся, калі чуў ад некага з літаратуразнаўцаў такое слова. Але, на вялікі жаль, рэальны свет беларуса далёка не заўсёды з'яўляўся такім светлым і лёгкім, якім яго часта маляваў Уладзімір Сямёнавіч. Ды ён стварыў адметны нацыянальны каларыт, які натхняў чытача самому корпацца ў радаводзе, запісваць ад бабуль нашы легенды ды паданні, песні, замовы, частушкі, прыказкі, прымаўкі, проста цікавыя аповеды. Відаць, адчуваў, што нядоўгі век яму наканаваны і стараўся напісаць як мага больш і ў драматургіі, і ў краязнаўстве, і ў паэзіі з прозай. Усюды імкнуўся паспець. Недзе спяшаўся, таму не дзіўна, што ў нечым і распыляўся.

Міфы, ява і сустрэчы з Уладзімірам Караткевічам

— Але выхаваў пакаленні беларусаў. І потым паступова сам пераўтварыўся ў міф?

— Як ні шкада, але ў сённяшніх маладых на пярэднім плане не гераізаваны Караткевічам Алесь Загорскі, а камп'ютар. Чытанне цяпер — не актуальнае, яно не ў актыўным ужытку. А няведанне беларускай гісторыі не замінае з'язджаць у Еўропу і жыць, нават не згадваючы пра Радзіму. А калісьці Караткевіча ад рукі перапісвалі, а потым яшчэ перапісанае перапісвалі і перадавалі з рук у рукі. Што зробіш, як кажуць у папулярным літаратурным творы: "Быў час, быў век, была эпоха…"

— Ці не да месца тут прэтэнзія і да тэлебачання, і да "Беларусьфільма"? Калі і ствараць нацыянальныя серыялы, дык у першую чаргу — паводле твораў Караткевіча. А мы ўсё скардзімся, што сцэнарыя цікавага няма…

— У свой час фільмы па Караткевічу былі створаны

Арлен Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да паэмы "Фаўст" Ёгана Вольфганга Гётэ.

Працяг гаворкі пра тое, як з Гётэ сустрэліся (б) Караткевіч з Кашкурэвічам, **чытайце ў наступных нумарах "К".**

паў. Прэпараваны труп — гэта яшчэ адна магчымасць спасцігнуць сутнасць жыцця, матэрыі. Але што можна зразумець у мёртвым целе?! Намаганні Фаўста мёртвыя, як і ўсё, што яго акаляе. Яго пакуты і бяссілле ў пазнанні Ісціны падобныя да гэтага ўздыбленага трупа…

— Але ўгледзьцеся, — звярнуўся **Уладзімір Караткевіч** да прысутных. — Перад вамі НАШ "Фаўст", НАШ час, расторганы і неспакойны. З лабараторнымі пошукамі ісціны (і зла), калі не ведаеш — анатамічны перад табой прэпарат або чалавек на прэнгу…

Гётэ, нібыта зазірнуўшы ў самога сябе, углыб сваіх думак, наноў прыгадаў гэтую сцэну — "Ноч. Пакой Фаўста":

— У жыцці Фаўст не знайшоў адказы на свае пытанні. Тады, магчыма, Смерць дасць адказы на іх? І Фаўст бярэ ў рукі "*флакон, фіял, крыніцу творчага, смяротнага імпэту*" — і вітае Смерць. Так, "*вітаю я цябе, адзіны мой фіял… Цябе, увасабленне міру і спакою… На моры, што ў душы, мне ўжо адліў відзён. Прасторы чыстых сініх вод мяне завуць, імкнуць і вабяць у паход да новых берагоў, да новых дзён…*" Так, я веру ў працяг жыцця пасля смерці, хоць, здаецца, адзін з будучых вашых класікаў, адчуваючы блізка каля сябе подых Непахіснай, адкажа: "І разрытаю магілай цягне сумна на мяне"… Але ж мой герой адчувае іншае на парозе небыцця: новыя берагі, новыя далі…

Словы Гётэ гучалі як новае абуджэнне Фаўста, і сябры не маглі не вярнуцца да знаёмых вобразаў наноў.

Арлен Кашкурэвіч:

— А пакуты Фаўста — гэта пакуты ад незадаволенасці яго душы, ад яго спробы зразумець, спасцігнуць Ісціну. Вось чаму ён і вырашыў гэтую атруту выпіць…

"Паслухай, Арлен, гэта ж чалавечы мозг!..", — раптоўна перапыніў мастака **Караткевіч**.

Нібыта разгублена звяртаючыся да прысутных, **Арлен Кашкурэвіч** сказаў:

— Не, я дакладна не ведаў, што малюю, проста праводзіў крывыя лініі. Інтуіцыя ж дазволіла быццам зазірнуць у будучыню, — цяпер мастак глядзеў проста ў вочы Гётэ: — Мастацтва — гэта неспазнавальная да канца з'ява нават для самога мастака, таму што ён творыць, а глыбіні сэнсаў і вобразаў з цягам часу прачытваюць іншыя пакаленні, даследчыкі…

Галіна АДАМОВІЧ,
доктар філалогіі,
прафесар кафедры
беларускай літаратуры
і культуры БДПУ
імя Максіма Танка

Смак кароткіх сустрэч з У.К.

З Уладзімірам Караткевічам я сустракаўся некалькі разоў. Неяк у маі 1983 года пабачыліся на вернісажы юбілейнай выстаўкі Аляксандра Кішчанкі ў Палацы мастацтва. Потым зайшлі ў кішчанкаўскую майстэрню. Было тады чалавек сем-восем: Гаўрыла Вашчанка, Ангеліна Бельцюкова, здаецца, Валодзя Басалыга, яшчэ хтосьці… Уздымалі кілішкі, гаворачы традыцыйныя тосты "за здароўе юбіляра Сашы", "за мастацтва і паэзію", за прэм'ерны выхад на экраны фільма "Чорны замак Альшанскі"… Кішчанка алоўкам накідваў партрэт Уладзіміра, а Караткевіч, які добра развесяліўся, прачытаў усім чатырохрадкоўе "Склероз".

Барыс КРЭПАК



Аляксандр Кішчанка. Партрэт Уладзіміра Караткевіча. 1985 г.

ньён сказаў, што ведае дом і пад'езд, у якім жыве творца, і мы ўвечары рушылі да яго. Калі пазванілі ў дзверы, то таварыш, ці то ад нечага страхуючыся, ці то з пераляку раптоўна знік. Тым часам дзверы шырока адчыніліся, і я застаўся сам-насам з Уладзімірам Сямёнавічам, які рашуча махнуў рукою і прагуў: "Заходзь!". З кватэры я выйшаў толькі ранкам. Усю ноч, вядома ж, гучалі імправізаваныя тосты за цудоўных беларускіх жанчын. Праўда, апошняя фраза Караткевіча, ужо на досвітку прамоўленая, была такая: "Ды дзе ж ты бачыў разумную бабу!"…

Другая сустрэча атрымалася развітальнай. Тым страшным сакавіцкім днём я заўважыў Караткевіча на лаўцы ў скверыку ля Купалаўскага тэатра. Быў ён счарнелым, з патухлымі вачыма, невідушчым нейкім позіркам, але ўсё ж мяне пазнаў і стомлена працягнуў: "А-а-а, гэта ты, паляшук!". Усяго толькі дзве сустрэчы. Таму ніколі і нікому не кажу, што быў блізка знаёмы з пісьменнікам, што расказваў ён мне нешта са сваіх творчых планаў, што дзяліўся нейкімі задумамі. Такога не было. Але я шчаслівы тым, што бачыў гэтага чалавека, сядзеў з ім за адным сталом, гаманіў (найбольш слухаў). З гэтых выпадковых сустрэч, а дакладней, з адной, зрабіў для сябе цвёрдую выснову: што быў ён працаголікам і, да таго ж, надзвычай ранімым.

— Як вам кніжка давалася?

— Не цяжка. Не спяшаўся, пісаў доўга, часткамі. Раздзел "Майстра ў белай кашулі…" зрабіў самым апошнім. Караткевіч прымае ванну, апранае белую сарочку, садзіцца за чысты стол і працуе — гэта як своеасаблівы абрад. Паляванне, лес, гульні, варажба, танцы… Пісьменнік тонка разумеў іх ролю ў жыцці нашых продкаў. Але часта рамантызм яго захлёстваў…

— І напэўна, каб захавалася раўнавага, паралельна са светам Уладзіміра Караткевіча існаваў і свет Васіля Быкава.

— Так. Быкаў — бытаапісальнік, суровы, брутальны, прыхільнік акопнай праўды. Караткевіч — узнёслы летуценнік.

— Мне даспадобы — свет Караткевіча. Як цудоўна "Кніганошы" пачынаюцца: "У бярозавым лесе — любіцца, у сасновым — маліцца, у дубовым — волю каваць, у яловым — душу д'яблу прадаваць...". У кожнага леса — свой брэнд. А мы гэтыя брэнды-міфы пагублялі…

— Раней кожная вёска імі славілася. Тыя — дравасекі, а тыя — з балота не вылазяць. Якуб Колас калісьці смяяўся са сваіх ранніх герояў-палешукоў, а потым сам патрапіў у Люсіна і захапляўся сілай і талентам насельнікаў Палесся… У нас і па сёння вёсачка на дзясятак двароў мае пяцьшэсць легенд пра сваё паходжанне, а вось у буйнога Віцебска няма аніводнай.

— І так бывае, што мы сваіх паданняў саромеемся і атаясамліваем назву паселішча з асобай нейкай напаўміфічнай расійскай імператрыцы. Маўляў, выпэцкала Кацярына чаравічкі, пашаркала нагамі — там праз час і з'явілася Шаркаўшчына.

— Адметнасць беларускага свету — гэта не адна гадзіна гаворкі. У кожнай вёсцы яшчэ нядаўна можна было сустрэць чалавека, які распавёў бы пра сваё паселішча процьму гісторый.

— Ведаю, вы ў асобных раёнах Беларусі і па пятнаццаць разоў пабывалі ў пошуках фальклору, а носьбітаў яго называеце "інфарматарамі".

— Бываў, магчыма што, і больш. Сапраўдных інфарматараў, носьбітаў духоўнай спадчыны, ужо практычна не засталося. А сабраны матэрыял я амаль ужо апрацаваў і выкарыстаў. Нешта, бясспрэчна, чакае сваёй кнігі і свайго часу.

К

На вернісажы (злева направа): Аляксандр Кішчанка, Уладзімір Караткевіч, Ангеліна Бельцюкова, Гаўрыла Вашчанка, Барыс Крэпак. 1983 г.

Там жа, у майстэрні, пад ягоную дыктоўку я занатаваў сабе ў блакнот:

У яго быў склероз —
ну чыстае гора!
Але ён быў мужны
і не паддаваўся:
Кожны дзень забываў
ён, ці піў учора,
І, на ўсякі выпадак,
апахмяляўся.

(Пасля трэці радок загучыць так: "Кожны дзень не помніў, ці піў учора").

Праз два гады Кішчанка напісаў партрэт пісьменніка. На дзіва ясным і ўзнятым над мітуснёй шэрай рэчаіснасці, акрыленым марай, велічным і строгім атрымаўся вобраз Караткевіча. І раскрытая кніга на стале як сам Лёс — на фоне агромністага беларускага неспакойнага неба… Але гэтае палатно Уладзімір Сямёнавіч ужо не ўбачыў…

Яшчэ адна сустрэча з класікам адбылася на выстаўцы, прысвечанай юбілею Максіма Багдановіча. Было гэта ў снежні 1981 года — таксама ў Палацы мастацтва. Я тады працаваў у Саюзе мастакоў і прымаў непасрэдны ўдзел у яе падрыхтоўцы і арганізацыі. Урэшце, Уладзімір Сямёнавіч у наш Саюз, які быў яму не чужы, часам заходзіў, бо сябраваў з Уладзімірам Басалыгам, Яўгенам Куліком і Леанідам Шчамялёвым, а таксама іншымі мастакамі, у тым ліку ілюстратарамі ягоных кніг. Наколькі памятаю, менавіта на той выстаўцы студэнт БДТМІ Рыгор Сітніца пазнаёміўся з пісьменнікам. З кімсьці з кіраўніцтва Саюза я спачатку суправаджаў Караткевіча ў іпастасі добраахвотнага гіда па выстаўцы, а потым ён самастойна пажадаў прайсціся па экспазіцыі. Не любіў, калі яму заміналі… І — нечакана надоўга затрымаўся менавіта ля твора Сітніцы, прысвечанага Багдановічу. Назву аркуша я потым успомніў: "Чым болей сходзіць дзён…" Тады я здалёк убачыў, як яны, два Сямёнавічы, Рыгор і Уладзімір, зацікаўлена размаўляюць каля работы. Але пра тую сустрэчу і пра тое, аб чым яны там размаўлялі, лепш мог бы распавесці сам Сітніца…

На кватэры ў Караткевіча я быў толькі аднойчы. Дакладна не памятаю, калі. Здаецца, у 1980 годзе. Мяне зацягнуў туды Пётра Драчоў. Пяты праверх дома № 36 па вуліцы Карла Маркса... Калі мы зайшлі, адразу заўважылі, што Караткевіч выглядаў неважнецкі, мусіць, з учарашняга банкета. Ён вельмі ўзрадаваўся няпрошаным гасцям, тым больш мы прынеслі з сабой пляшку таннага каньяку. З пісьменнікам я ўжо быў павярхоўна знаёмы, а Пётра наогул лічыўся ягоным сябрам, таму гутарка за "круглым сталом" на кухні пад чарку і салату са свежай капусты ішла жвава, цікава і займальна. Хвілін праз сорак Караткевіч паглядзеў на гадзіннік, падхапіўся: неўзабаве павінна з'явіцца Валянціна Браніславаўна, ягоная жонка, якая, мякка кажучы, не вельмі любіла ўсялякія мужавы "слабасці". Пра што мы тады гутарылі, ужо нават і не памятаю. Але пра сваю другую "палавінку" ён паспеў расказаць.

Ажаніўся Валодзя позна, у сорак. Да таго доўга сустракаўся з будучай жонкай, з якой пазнаёміўся ў Брэсце, дзе яна працавала ў краязнаўчым музеі і чытала лекцыі па гісторыі КПСС у педінстытуце. Неяк Караткевіч запрасіў яе ў Ракаў на вяселле Вячаслава Рагойшы. Яна не размаўляла па-беларуску, не ўжывала спіртное, і тады "памяркоўныя" мужыкі сталі казаць Валодзю, што Валянціна яму не пара. Жанчына расплакалася, у стрэсе выпіла паўшклянкі самагонкі, паспрабавала пайсці з вяселля, але зламала абцас. І Караткевіч павёз яе ў Мінск. У каханні яны пражылі 12 гадоў. А беларускай мовай Валянціна авалодала дасканала.

Пра талент і зігзагі жыцця Караткевіча я ўжо штосьці ведаў са слоў некаторых яго дружбакоў, у тым ліку ад Валянціна Тараса, Рыгора Барадуліна, Пётры Драчова, а таксама ад Вячаслава Адамчыка, з якім мы, суседзі па лецішчах на Лысай гары, час ад часу гутарылі за ўнікальным дубовым сталом. Калісьці ён, гэты славуты стол, належыў Караткевічу, а пасля яго смерці перайшоў у "спадчыну" да Вячаслава Уладзіміравіча, сябра і суседа па кватэры. Дарэчы, Адамчык вельмі ганарыўся гэтым сталом як сімвалам памяці пра сяброўства з няўрымслівым і неспакойным Валодзем Караткевічам.

Пра апошняе лета 1984-га Уладзіміра Сямёнавіча праз дзесяць гадоў мне распавёў аўтар вельмі ўдалага мастацкага афармлення рамана "Чорны замак Альшанскі" Пеця Драчоў, які разам з Караткевічам і фатографам Валянцінам Ждановічам здзейснілі на плытах шматкіламетровую вандроўку па Прыпяці, пра што я ў свой час падрабязна пісаў у газеце "Культура" і ў "Беларускім гістарычным часопісе". Жыць геніяльнаму творцу зямлі беларускай пасля таго падарожжа заставалася ўсяго некалькі дзён…

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі адкрылася выстаўка **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя".**

Выстаўкі:

■ Выстаўка **"Ад рэалізму да імпрэсіянізму"** (жывапіс XIX — XX стст. са збору Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі) — да 11 студзеня.
■ Выстаўка **"Залатое стагоддзе ткацтва. Кунтушавыя паясы і партрэты шляхты"** са збору літоўскага Нацыянальнага мастацкага музея М.К. Чурлёніса (Каўнас) — да 4 снежня.
■ Выстаўка з музеяў Сеула, арганізаваная сумесна з Музеем універсітэта Дангук і карэйскім фондам пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Карэя ў Беларусі, — **"Жыццё Карэі"** — да 6 снежня.
■ Выстаўка жывапісу і графікі Уладзіміра Правідохіна **"MODUS VIVENDI"** — да 21 снежня.
■ Выстаўка твораў Мікалая Залознага **"Колер жыцця"** да 90-годдзя з дня нараджэння мастака — да 11 студзеня 2016 года.
■ Выстаўка твораў Васіля Зянько **"Архіварыус"** — да 11 студзеня 2016 года.

Імпрэза:

■ Канцэрт з серыі **"Палітра любімай класікі"** — 30 снежня а 19-й.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстаўка:

■ **"Прарок свайго часу. Адам Міцкевіч. Ілюстрацыі і медалі"** — да 25 снежня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Івянецкая школа керамікі: традыцыі і сучаснасць"** — да 9 студзеня 2016 года.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя "Старажытная Беларусь".
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выстаўкі:

■ Выставачны праект **"Вялікая прэзентацыя музейных рэліквій: 79 прыступак углыб гісторыі"** — да 31 снежня.
■ Выстаўка **"Сярэбранае стагоддзе"** са збораў мінскіх калекцыянераў А.Сяргеева, І.Сурмачэўскага і іншых — да 13 снежня.
■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня 2016 года.
■ Выстаўка твораў Артура Фанвізіна і Дзмітрыя Сурыновіча **"Дзівосны свет акварэлі"** — да 6 снежня.
■ **"Музей ёлачных цацак"** — да 17 студзеня 2016 года.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".

Выстаўкі:

■ Выстаўка твораў омскага майстра мікрамініяцюры Анатоля Каненкі **"Цуд пад мікраскопам"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстаўка:

■ **"Джунглі за шклом"** — да 6 сакавіка 2016 года.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.

■ Выстаўка **"Мумії свету"** — да 17 студзеня 2016 года.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстаўка:

■ Выстаўка сцэнічнага касцюма **"Карагод народных строяў"**.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14.
Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстаўка:

■ **"Славакія. З любоўю"** — да 13 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстаўка:

■ Выстаўка работ студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **"Alma mater & Cinema 2015"**, прысвечаная XXII Мінскаму МКФ "Лістапад-2015" — да 13 снежня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
ср. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка-праект **"Паспець паказаць..." Класіка ваеннай фатаграфіі. 1941 — 1945"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель X — XVII стст."** — да 13 снежня.
■ Выстаўка **"Вялікі баль у палацы Радзівілаў"** — да 31 студзеня 2016 года.

Выставачная зала сектара экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Выстаўка **"Фарбы пленэра"**.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** — да 31 снежня.
■ Выстаўка **"Чорна-белыя вандроўкі Барыса Бокшы"** — да 15 студзеня 2016 года.
■ Выстаўка **"Свет Праваслаўя"** — да 15 студзеня 2016 года.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўка:

■ Выстаўка графікі Рыгора Сітніцы **"Я палітру расквечу каханнем"**.
■ Выстаўка **"Беларускі Арфей"**, да 90-годдзя паэмы "Сымон-музыка".

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:

■ Выстаўка жывапісу і габеленаў Аляксандра і Тамары Сцяцэнкаў **"Украіна, цвеце любы, сонцам гадаваны..."**, зладжаная пры падтрымцы Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, — да 2 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

Выстаўка:

■ Гістарычная выстаўка **"Як Фенікс з попелу. Разбурэнне і аднаўленне Варшавы 1939 — 1955"** — да 12 снежня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:

■ Фотавыстаўка Рудольфа Клайна **"Сінагогі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы 1782 — 1944 гг."** — да 29 лістапада.
■ Выстаўка **"Машыны, якія гавораць / Talking machine"**, пры ўдзеле творчай групы "Рамзэс Экспа" — да 27 сакавіка 2016 года.
■ Выстаўка **"Час і асоба"** заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі кіраўніка студыі ваенных мастакоў Мікалая Апіёка — да 6 снежня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:

■ Выстаўка **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Куфэрак: шаноўная пані"** (рэканструкцыя гістарычных строяў пач. XIX — пач. XX стст.) — да 1 снежня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

ВЫСТАВАЧНЫЯ ЗАЛЫ МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, ул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Юбілейная рэтраспектыўная фотавыстаўка Уладзіміра Суцягіна **"Сустракаючы святло"** — да 6 снежня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"** (міні-выстаўка **"Эпоха гігантаў: знаходкі мегалацэроса ў Гомелі"** — да 31 снежня).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выстаўкі "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выстаўкі:

■ **"Крохкія захавальнікі Слова"** (рэдкія рукапісныя і старадрукаваныя кнігі з фондаў музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля) — да 6 снежня.
■ Выстаўка традыцыйных нацыянальных кітайскіх строяў, жывапісу, рэчаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці — **"Зямля Паднябёсная"** — да 13 снежня.
■ Юбілейная выстаўка мастака і заслужанага выкладчыка краіны Валянціна Пакаташкіна **"75. Дзеці, творчасць, любоў..."** — з 20 снежня.
■ Інтэрактыўны выставачны праект **"У гасцях у казкі..."** — да 14 лютага 2016 года.
■ **"Жывапіс Генадзя Жарына"** — да 20 снежня.
■ **"Новае ў археалогіі Гомельшчыны"** (новыя знаходкі з Мохаўскай і Гомельскай археалагічных экспедыцый пад кіраўніцтвам А.А. Макушнікава) — да 1 лютага 2016 года.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:

■ **"Кнігі ў белых халатах"** (медыцынскія выданні XIX — XX стст. з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 13 снежня.
■ Мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў **"Край родны, назаўжды любімы"** з фондаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля — да 31 снежня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўка:

■ Выстаўка **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Белая гасцёўня

■ **"Бетховен і яго наступнікі"** (канцэртная праграма ў рамках І Форуму класічнай музыкі ў Гомелі) — 15 снежня а 19-й.
■ **"Калядныя імправізацыі"** (джазавы канцэрт у выкананні "Vasabi Jazz Band") — 18 снежня а 19-й.
■ **"Серпанцін рэтра-мелодый"** (канцэрт у выкананні біт-гурта "YATATA") — 19 снежня а 17-й.
■ **"З любоўю да класікі"** (канцэртная праграма пры ўдзеле лаўрэата міжнароднага конкурсу Канстанціна Гарошкі і Віталя Фаміна) — 9 студзеня 2016 года а 17-й.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстаўка **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай Арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстаўка з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстаўка **"Тры плюс ART"**.
■ Выстаўка **"Ад пяра гусінага да камп'ютара сучаснага"**.
■ Выстаўка **"Чароўны куфар"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстаўка твораў маладых беларускіх і кітайскіх мастакоў у рамках Беларуска-кітайскага маладзёжнага інавацыйнага форуму "Новыя гарызонты-2015" **"Праз культуру да супрацоўніцтва"**.
■ Мастацкая выстаўка па выніках Рэспубліканскага фестывалю мастацтваў замежных студэнтаў **"F-ART.by"** — да 12 снежня.
■ Першая персанальная выстаўка Іны Салдатавай **"Арт-хворь"** — да 14 снежня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Рэспубліканская маладзёжная выстаўка **"Сэлфі"** (жывапіс, графіка, скульптура, арт-аб'екты).
■ Выстаўка секцыі **"Пагоня"** Беларускага саюза мастакоў.
■ Персанальная выстаўка **Алеся Марачкіна**.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **29 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **1 снежня — "Сівая легенда"** (опера ў 2-х дзеях) Д.Смольскага.
■ **2 — "Рамэа і Джульета"** (балет у 3-х дзеях) С.Пракоф'ева.
■ **3 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзях) В.-А. Моцарта.
■ **4 — "Дон Кіхот"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса.
■ **4 — Вечар раманса** — Музычныя вечары ў Вялікім (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **5 —Шэдэўры харавой опернай класікі.**

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **28 — "Гісторыя двух сабак"** Я.Конева. Пачатак а 12-й.
■ **28 — "Містар Розыгрыш"** С.Кандрашова.
■ **29 лістапада — "Воўк-мараплавец"** С.Казлова. Пачатак а 12-й.
■ **1 снежня — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
■ **2 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
■ **3 — "Фінт-Круазэ"** Д.Багаслаўскага, В.Красоўскага.
■ **4 — "Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
■ **5 — "Дзённік паэта"** С.Кавалёва.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **29 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** Г.Гладкова. Пачатак у 11.30.
■ **29 — "Тайны шлюб" ("Граф Люксембург")** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара.
■ **30 лістапада — "Дуброўскі"** К.Брэйтбурга.
■ **1 снежня — "Лятучая мыш"** І.Штрауса.

Гастролі Рускага драматычнага тэатра Літвы:

■ **28 лістапада — "Кароль Лір"** У.Шэкспіра.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **28— "Воўк і раз, два, тры..."** Н. Мацяш. Пачатак аб 11-й.
■ **29 — "Асцярожна, Соня!"** А.Усачова. Пачатак аб 11-й.